Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
“Полацкі дзяржаўны універсітэт”

**І. А. БОРТНІК**

# ФІЛАСОФСКАЯ І ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ДУМКА БЕЛАРУСІ

Вучэбна-метадычны дапаможнік

Наваполацк
ПДУ
2010

УДК 1(091)(476)(075.8)
ББК 87.3(4Беи)я73

Рэкамендаваны да выдання вучэбна-метадычнай камісіяй спартыўна-педагагічнага факультэта ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка (пратакол № 6 ад 20.01.2010)

Кафедра сацыяльна-гуманітарных дысцыплін

РЭЦЭНЗЕНТЫ:

канд. гіст. навук, дац. каф. сацыяльна-гуманітарных дысцыплін УА “ПДУ” С. У. АНДРЫЕЎСКАЯ;

канд. філасоф. навук, дац. каф. сацыяльна-гуманітарных дысцыплін УА “ПДУ” Л. В. ЯНКОЎСКАЯ

© Бортнік І. А., 2010
© УА «Полацкі дзяржаўны універсітэт», 2010

# УВОДЗІНЫ

Вучэбна-метадычны дапаможнік “Філасофская і грамадска-палітычная думка Беларусі” прызначаны для студэнтаў дзённага аддзялення ўсіх спецыяльнасцяў УА “Полацкі дзяржаўны універсітэт”, якія вывучаюць дысцыпліну “Філасофія” на другім курсе. Змест дапаможніка дапасаваны да тэмы “Філасофія і нацыянальная самасвядомасць. Філасофская думка Беларусі”, якая з’яўляецца часткай курса “Філасофія”, згодна з вучэбнай праграмай, зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь па дадзеным курсе для студэнтаў вышэйшых навучальных установ РБ (Мінск, 2008). Мэта метадычнага дапаможніка – дапамагчы студэнтам у засваенні матэрыялу па акрэсленай тэме для падрыхтоўкі да экзамена, а таксама пазнаёміць з асноўнымі ідэямі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі студэнтаў, якія імкнуцца вывучыць дадзены прадмет на больш глыбокім узроўні.

Дадзеная метадычная распрацоўка змяшчае аналіз філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі на працягу асноўных этапаў яе гістарычнага развіцця. Яна ўключае ў сябе 7 тэм: “Сярэднявечны перыяд (XI – XV стст.)”, “Перыяд Адраджэння і Рэфармацыі (XVI ст.)”, “Перыяд Контррэфармацыі (XVII – першая палова XVIII стст.)”, “Перыяд Асветніцтва (другая палова XVIII – 20-я гг. XIX стст.)”, “Перыяд рамантызму (1820 – 1850-я гг.)”, “Перыяд фарміравання нацыянальна арыентаванай беларускай філасофіі (другая палова XIX – пачатак XX стст.)”, “Перыяд панавання марксісцка-ленінскай філасофіі (1920-я – 1980-я гг.)”. Кожная з гэтых тэм утрымлівае ў схематычным выглядзе асноўную інфармацыю, якая дазваляе даць характарыстыку асноўным перыядам у развіцці філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Метадычны дапаможнік скіраваны на тое, каб студэнты засвоілі перыядызацыю гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі, ведалі асноўныя спецыфічныя рысы філасофскага спосабу мыслення і найбольш значных прадстаўнікоў кожнага з разглядаемых этапаў. Акрамя таго, метадычны дапаможнік змяшчае інфармацыю пра галоўныя ідэі, якія рэпрэзентаваліся ў межах розных накірункаў філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі ў асобныя перыяды. У дапаможніку прадстаўлены галоўныя вектары развіцця анталагічнай, гнасеалагічнай, этыка-антрапалагічнай і сацыяльна-палітычнай думкі Беларусі ў розныя гістарычныя эпохі. Дадзеная метадычная распрацоўка дапаможа студэнтам вызначыць шэраг тэарэтычных пытанняў, гістарычных фактаў, на якіх варта будзе зрабіць акцэнт і якія дазволяць пашырыць і паглыбіць веды па дысцыпліне.

З мэтай больш якаснага засваення матэрыялу ў канцы кожнай тэмы прыводзяцца кантрольныя пытанні для самаправеркі. Для таго, каб палегчыць студэнту працу з дапаможнікам, напрыканцы распрацоўкі дадзены слоўнік асноўных філасофскіх і гістарычных тэрмінаў, якія ўжываюцца ў тэксце. Таксама метадычны дапаможнік змяшчае пералік асноўнай літаратуры, рэкамендаванай па дысцыпліне “Філасофія” для засваення тэмы “Філасофія і нацыянальная самасвядомасць. Філасофская думка Беларусі”.

# ФІЛАСОФСКАЯ І ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ДУМКА БЕЛАРУСІ, АСНОЎНЫЯ ПАНЯЦЦІ, ПЕРЫЯДЫЗАЦЫЯ

Філасофская і грамадска-палітычная думка Беларусі з’яўляецца часткай агульнаеўрапейскай філасофскай культуры. Разам з тым яна мае сваю спецыфіку, звязаную з асаблівасцямі гістарычнага развіцця Беларусі.

Пры вызначэнні межаў філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі ўзнікае шэраг праблем.

1) Праблема вызначэння этнанацыянальных межаў: філасофская думка Беларусі не ідэнтычна беларускай нацыянальнай філасофіі, яна ўключае ўсе традыцыі філасофскага мыслення, якія склаліся на культурнай прасторы Беларусі ў розныя гістарычныя перыяды на розных мовах.

2) Праблема вызначэння тэрытарыяльных межаў: філасофская думка Беларусі ахоплівае не толькі феномены філасофскай культуры, якія паўсталі на тэрыторыі сучаснай Рэспублікі Беларусь, але і тыя, што сфарміраваліся ў межах тых гістарычна абумоўленых геакультурных прастораў, часткай якіх з’яўляліся землі сучаснай Беларусі (тэрыторыі старажытных усходнеславянскіх княстваў у XI – XIII стст., тэрыторыя Вялікага княства Літоўскага ў XIII – XVIII стст., у пэўнай ступені тэрыторыя Рэчы Паспалітай у другой палове XVI – XVIII стст., тэрыторыя Віленшчыны ў XIX – першай палове XX стст.), а таксама тыя, якія былі створаны па-за межамі Беларусі і яе геакультурнай прасторы асобамі, цесна звязанымі ў сваім жыцці і дзейнасці з землямі Беларусі.

3) Праблема вызначэння часавых межаў: прафесійнай філасофія, прадстаўленая ў інстытуцыяналізаваным выглядзе, з’яўляецца на землях Беларусі з канца XVI ст. Аднак пачаткам філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі можна лічыць XI ст. – час з’яўлення на яе геакультурнай прасторы першых твораў, у якіх прысутнічаюць элементы рацыянальна-лагічнага асэнсавання рэчаіснасці.

*Перыядызацыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі*:

1) XI – XV стст. – сярэднявечны перыяд.

2) XVI ст. – перыяд Адраджэння і Рэфармацыі.

3) XVII – першая палова XVIII стст. – перыяд Контррэфармацыі.

4) Другая палова XVIII – 20-я гг. XIX стст. – перыяд Асветніцтва.

5) 20-я – 50-я гг. XIX ст. – перыяд Рамантызму.

6) Другая палова XIX – пачатак XX стст. – перыяд фарміравання нацыянальна арыентаванай беларускай філасофіі.

7) 1920-я – 1980-я гг. – перыяд панавання марксісцка-ленінскай філасофіі.

8) З 1990-х гг. – сучасны перыяд.

# ТЭМА 1. СЯРЭДНЯВЕЧНЫ ПЕРЫЯД (XI – XV стст.)

## Гістарычныя ўмовы фарміравання філасофскай і грамадска-палітычнай думкі на землях Беларусі ў XI – XV стст.

Сацыяльна-эканамічнае жыццё ў гэты перыяд характарызуецца станаўленнем феадальнага ўкладу, частковым аддзяленнем рамяства і гандлю ад сельскай гаспадаркі, узнікненнем гарадоў, развіццём рэгіянальных і міжнародных эканамічных сувязяў. Дадзеныя з'явы спрыялі паскарэнню назапашвання пазітыўных ведаў аб свеце ў розных сферах жыцця, пашырэнню светапогляду і стымулявалі выпрацоўку рацыянальна-лагічных форм асэнсавання чалавекам свайго існавання і існавання навакольнага асяроддзя ў дадатак да рэлігійна-міфалагічных.

У сацыяльна-палітычным жыцці адбываецца працэс станаўлення дзяржаўнасці спачатку ў форме раннефеадальных княстваў (Полацкае, Тураўскае, Смаленскае, якія ў сваю чаргу падзяляюцца на ўдзелы), а з сярэдзіны XIII ст. – у форме цэнтралізаванай дзяржавы, Вялікага княства Літоўскага, асноўную частку якога складаюць землі сучаснай Беларусі. Раннефеадальныя княствы, а потым ВКЛ уключаюцца ў сістэму міжнародных палітычных адносін у Еўропе. Ускладненне палітычнай арганізацыі патрабавала ад суб'ектаў палітычнай дзейнасці ўмення выпрацоўваць і абгрунтоўваць пэўную пазіцыю з дапамогай рацыянальна-лагічных сродкаў.

У духоўным жыцці важнейшай падзеяй дадзенага перыяду становіцца афіцыйнае прынятце хрысціянства раннефеадальнымі ўсходнеславянскімі княствамі ў канцы X ст. Хрысціянізацыя адбывалася пад патранатам візантыйскай царквы, якая пасля расколу ў хрысціянстве 1054 г. стала цэнтрам праваслаўнай царквы. Пасля прыняцця хрысціянства ў Кіеўскім княстве каля 988 г. усе ўсходнеславянскія землі былі абвешчаны часткай Кіеўскай мітраполіі, якая падпарадкоўвалася Канстанцінопальскаму патрыярхату. На тэрыторыі Беларусі ўтварылася некалькі епархій, падпарадкаваных кіеўскаму мітрапаліту: Полацкая (992 г.), Тураўская (1005 г.), Смаленская (1136 г.). З канца XIV ст. пасля Крэўскай уніі 1385 г. афіцыйнай канфесіяй у ВКЛ становіцца каталіцызм, аднак у духоўна-рэлігійным жыцці на землях Беларусі працягвала панаваць праваслаўе.

Хрысціянізацыя ва ўсходнеславянскіх землях, у тым ліку і на землях Беларусі, мела сваю спецыфіку:

1) Працэс хрысціянізацыі адбываўся амаль выключна "зверху", у выніку рэалізацыі волі суб'ектаў дзяржаўнай улады. Гэта прывяло да захавання на працяглы час у грамадскай свядомасці значных элементаў традыцыйнага міфалагічнага светапогляду.

2) У якасці царкоўнай была замацавана стараславянская мова, літаратурныя нормы якой былі распрацаваны балгарскімі хрысціянскімі місіянерамі Кірылам і Мяфодзіем у IX ст. на аснове старабалгарскіх моўных дыялектаў. Паступова гэтая мова становіцца мовай інтэлектуальнай эліты грамадства, на якую перакладаюцца і на якой ствараюцца тэалагічныя і філасофскія творы. Царкоўнаславянская мова паслужыла асновай для фарміравання старабеларускай мовы, якая стала афіцыйнай мовай ВКЛ.

Хрысціянства ў многім абумовіла інтэлектуалізацыю духоўнага жыцця на тэрыторыі Беларусі ў дадзены перыяд. Яна паўплывала на фарміраванне пісьменства, станаўленне царкоўнай адукацыі, развіццё розных форм духоўнай культуры. Узнікае спецыфічная "кніжная" культура: пры манастырах перапісваюць кнігі і робяць пераклады з грэчаскай мовы на стараславянскую, з'яўляецца арыгінальная літаратура. Пры дапамозе хрысціянства стала магчымай трансляцыя на тэрыторыю сучаснай Беларусі еўрапейскай культурнай спадчыны: у першую чаргу засваенне візантыйскай філасофскай традыцыі, а праз яе і знаёмства з антычнай філасофіяй.

## Крыніцы сярэднявечнай філасофскай думкі Беларусі

Філасофская думка Беларусі, як і іншых усходнеславянскіх зямель, у Сярэднявеччы фарміруецца ў форме засваення ўзораў візантыйскай філасофіі. У цэлым для сярэднявечнай філасофіі галоўнай асаблівасцю з'яўляецца аналіз філасофскіх пытанняў у кантэксце рэлігійнай праблематыкі, падпарадкаванне філасофіі тэалогіі. Пры гэтым галоўнай крыніцай філасофскай думкі становяцца сакральныя рэлігійныя тэксты – найперш Біблія, затым творы "айцоў царквы" і іх каментатараў. Дапаможнай крыніцай выступае спадчына антычнай філасофіі, якая выкарыстоўвалася для падмацавання рэлігійнай дагматыкі рацыянальна-лагічнымі аргументамі. Такім чынам, сярэднявечная філасофская думка Беларусі развівалася пад уплывам хрысціянскай рэлігіі і антычнай філасофіі, але амаль выключна праз пасрэдніцтва візантыйскай рэлігійна-філасофскай традыцыі.

Першым творам, які змяшчае філасофскія ідэі, што з'яўляецца на старажытнаўсходнеславянскай геакультурнай прасторы, стаў трактат, прысвечаны тлумачэнню некаторых фрагментаў з прац Арыстоцеля, змешчаны ў рукапісным зборніку тэалагічнай перакладной літаратуры "Ізборнік" 1073 года.

На працягу Сярэднявечча на стараславянскую мову былі перакладзены творы асноўных прадстаўнікоў візантыйскай рэлігійна-філасофскай думкі. Дадзеныя творы перапісваліся ў перакладах як асобнымі спісамі, так і ў складзе разнастайных рукапісных зборнікаў – "пчолаў", "златаструяў",

"зерцалаў" і г. д. Найбольшую папулярнасць і аўтарытэт мелі працы візантыйскага тэолага VIII ст. Іаана Дамаскіна, асабліва яго твор "Крыніца ведаў". Іаан Дамаскін выканаў у візантыйскай культуры тую ж ролю, якую ў заходнееўрапейскай культуры выканаў Фама Аквінскі – адаптаваў арыстацелізм да хрысціянскай тэалогіі.

Пад уплывам візантыйскай філасофскай культуры паўстаюць арыгінальныя літаратурныя творы, якія змяшчаюць ідэі філасофскага характару.

**Асноўныя рысы філасофскай думкі Беларусі XI – XV стст.**

1) Сутнасцю філасофскай думкі выступае ідэя "мудрасці" як гарманічнага адзінства ведаў, набытых у розных сферах рэчаіснасці, якія дапамагаюць выпрацоўцы чалавекам уласнай жыццёвай арыентацыі. Гэта абумовіла адсутнасць сістэмнасці філасофскіх ведаў, нізкі ўзровень рацыянальна-тэарэтычнага аналізу, набліжэнне філасофіі да абагульнення жыццёва-практычнага вопыту.

2) Па форме філасофская думка выступае як культура цытат, як пераймание візантыйскай культуры праз пасрэдніцтва старабалгарскай.

3) Галоўная праблема філасофскай думкі – праблема чалавека і яго ўзаемаадносін з Богам. Таму на першым плане знаходзяцца пытанні этычнага і часткова сацыяльна-палітычнага характару; яны атрымліваюць прыярытэт перад анталагічнымі і гнасеалагічнымі праблемамі.

**Станаўленне традыцыі тэалагічна-філасофскага рацыяналізму**

На тэрыторыі сучаснай Беларусі ў XI – XV стст. узнікае шэраг літаратурных твораў, дзе знаходзяць адлюстраванне традыцыйныя філасофскія праблемы, разглядаемыя ў рэчышчы пануючага ў дадзены перыяд у візантыйскай філасофскай культуры *тэалагічна-філасофскага рацыяналізму*. Сутнасць апошняга заключаецца ў спалучэнні хрысціянскага рэлігійнага светапогляду з рацыянальным спасціжэннем рэчаіснасці; вера і розум выступаюць як два ўзаемазвязаныя сродкі пазнання чалавекам Бога і створанага ім свету пры прыярытэце веры. У сувязі з гэтым некаторыя ідэі антычнай рацыяналістычнай філасофіі разглядаюцца як важны фактар умацавання тэалагічных пастулатаў. Найбольш выразна традыцыя тэалагічна-філасофскага рацыяналізму ў візантыйскай культуры праяўляецца ў творах Іаана Дамаскіна.

У межах сярэднявечнай філасофскай думкі Беларусі галоўнымі прадстаўнікамі тэалагічна-філасофскага рацыяналізму выступаюць Клімент Смаляціч і Кірыла Тураўскі.

***Клімент Смаляціч*** (? – пасля 1161 г.) – царкоўны дзеяч сярэдзіны XII ст., у 1147 – 1155 гг. з'яўляўся кіеўскім мітрапалітам. Вядомы адзіны

твор Клімента Смаляціча "Пасланне смаленскаму прэсвітэру Фаме". Гэта, па сутнасці, палемічны твор, у якім Клімент спрабуе абвергнуць абвінавачванні ў празмерным захапленні антычнай культурай, выстаўленыя супраць яго ва ўмовах барацьбы за пасаду мітрапаліта. У дадзенай працы сцвярджаецца неабходнасць шырокага звароту да антычнай філасофскай спадчыны, а таксама дапаўнення літаральнага тлумачэння Бібліі алегарычным з мэтай больш глыбокага разумення Святога Пісання.

***Кірыла Тураўскі*** (каля 1113 – пасля 1190 гг.) – царкоўны дзеяч, каля 1143 – 1148 гг. іераманах, потым ігумен Нікольскага манастыра, каля 1159 – 1184 гг. тураўскі епіскап. Літаратурная спадчына Кірылы Тураўскага налічвае каля 70 твораў розных жанраў: малітвы, павучанні, пропаведзі, прытчы, каноны. У творах Кірылы Тураўскага дэкларуецца адданасць праваслаўю; крыніцай усіх ведаў абвяшчаецца Святое Пісанне. Разам з тым, розум разглядаецца як найвышэйшая каштоўнасць чалавечага жыцця. Сцвярджаецца думка, што асвета і кніжнасць вядуць чалавека да душэўнай раўнавагі і шчасця. У "Прытчы аб чалавечай душы і целе" абгрунтоўваецца думка аб узаемасувязі душы і цела, пры гэтым сцвярджаецца, што як душа пастаянна мае патрэбу ў дапамозе цела, так і цела, у сваю чаргу, мае патрэбу ў падтрымцы душы.

Свой працяг традыцыя тэалагічна-філасофскага рацыяналізму знаходзіць у межах г. зв. "*кіеўскага рэнесансу*", пад якім разумеецца дзейнасць інтэлектуальнага кола дзеячаў, якія займаліся перакладам і падрыхтоўкай рукапісных зборнікаў, пры двары кіеўскіх удзельных князёў Алелькавічаў у сярэдзіне XV ст. Важным вынікам іх дзейнасці стаў пераклад са старажытнаяўрэйскай мовы на старабеларускую трох твораў блізкаўсходняга паходжання: "Логіка Авісафа", "Прамова Майсея Егіпцяніна" і "Арыстоцелева брама". "*Логіка Авісафа*" – фрагмент лагічнай часткі філасофскага трактату арабскага філосафа Аль-Газалі. "*Прамова Майсея Егіпцяніна*" складаецца з фрагментаў твораў Аль-Газалі і яўрэйскага філосафа XII ст. Маісея Майманіда. "*Арыстоцелева брама*" ўяўляе сабой энцыклапедычны збор звестак з розных галін ведаў, якія нібыта былі падрыхтаваны Арыстоцелем для Аляксандра Македонскага. У асобных творах, цытатах, фрагментах зборніка ўзнаўляюцца ідэі розных сярэднявечных арабскіх і яўрэйскіх філосафаў. Сярэднявечныя энцыклапедычныя тэксты такога тыпу звычайна маюць ананімны і адкрыты характар, гэта значыць, перапісчык альбо перакладчык мог дадаваць іншыя звесткі альбо "абнаўляць" тэкст, і менавіта гэтым тлумачацца істотныя разначытанні паміж арыгіналам і перакладам. Усе перакладзеныя творы маюць рацыяналістычную скіраванасць, у аснове якой знаходзіцца сярэднявечны арыстацелізм.

## Этычная думка

Пытанні этычнага характару мелі пераважнае значэнне ў сістэме філасофскай думкі на ўсходнеславянскай геакультурнай прасторы XI – XV стст. Этычная праблематыка знаходзіцца ў цэнтры ўвагі такіх твораў, як "*Слова аб законе і благадаці*" мітрапаліта Іларыёна (XI ст.), "*Ізборнік*" *1073 г.* Святаслава, "*Вопрошанія*" Кірыка (XII ст.), "*Моленія*" Данііла Заточніка (XII – XIII стст.), а таксама арыгінальнай і перакладной агіяграфічнай літаратуры.

У аснове этычнай думкі знаходзяцца рэлігійныя ідэі. Галоўнай мэтай чалавечага жыцця абвяшчаецца дасягненне вечнага выратавання. Таму скіраванасць на атрыманне боскай ласкі і выкананне боскіх запаветаў становяцца сэнсам жыцця чалавека. Праблемы, якія ўзнікаюць у чалавека ў штодзённым зямным жыцці, адсоўваюцца ў сувязі з гэтым на другі план.

Найбольш выразна этычны ідэал чалавека распрацоўваўся ў агіяграфічнай літаратуры ("*Жыціе Еўфрасінні Полацкай*", "*Жыціе Аўрамія Смаленскага*", "*Жыціе Кірылы Тураўскага*", "*Жыціе Феадосія, ігумена Пячэрскага*" і г. д.). У яе творах праслаўляліся рэлігійнае падзвіжніцтва і рэлігійны аскетызм як выяўленне найвышэйшых хрысціянскіх духоўных каштоўнасцяў. Разам з тым, у разнастайнай паводле жанраў літаратуры сцвярджаюцца такія маральныя каштоўнасці, як розум, чалавекалюбства, мудрасць. Як правіла, у творах разглядаемага перыяду абавязкова ўтрымліваецца пахвала асвеце. Адукаванасць па сутнасці атаясамліваецца з маральнасцю.

Ролю своеасаблівых вучэбных дапаможнікаў, якія знаёмілі чытачоў з антычнай і візантыйскай этыкай, выконвалі *фларылегіі* – зборнікі выказванняў і афарызмаў, галоўным чынам, перакладнога характару ("*Паралелі Іаана Дамаскіна*", "*Менадр*", "*Пчала*" і г. д.). Па сваёй структуры і зместу афарызмы фларылегій падобны да народных прыказак і прымавак. Імкнучыся да энцыклапедычнасці, укладальнікі фларылегій падбіралі цытаты і афарызмы па пытаннях, якія датычыліся амаль усіх бакоў чалавечага жыцця (ісціны і фальшы, дабра і зла, праўды, дружбы, любові, чалавечых жаданняў і афектаў і г. д.). У змесце фларылегій эклектычна спалучаюцца хрысціянскія, антычныя і традыцыйныя народныя этычныя ўяўленні. Робіцца акцэнт на сцвярджэнні простых агульначалавечых норм маралі, якія адпавядалі хрысціянскаму вучэнню, услаўляюцца духоўныя каштоўнасці ў процівагу да матэрыяльных.

## Сацыяльна-палітычная думка

Сацыяльна-палітычная думка на землях сучаснай Беларусі, як і ў цэлым Усходняй Еўропы, пачынае фарміравацца ў дадзены перыяд пад уплывам палітычнай ідэалогіі Візантыі, накіраванай на абгрунтаванне

моцнай манархічнай улады. Гэтая ідэалогія, канчатковай мэтай якой было забеспячэнне адзінства і магутнасці велізарнай дзяржавы, атрымала назву **цэзарапапізму**. Сутнасць яе заключаецца ў тым, што галава свецкай улады (цэзар) з'яўляецца адначасова кіраўніком царкоўнай улады.

Галоўнай ідэяй цэзарапапізму з'яўляецца *ідэя боскага паходжання манархічнай улады*. Манарх разглядаецца як стаўленік Бога, яго намеснік на зямлі. Як Бог на небе, так і манарх на зямлі выступае адзінаўладным правіцелем, якому належыць уся паўната заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады, а таксама ўлады ў царкве. Манарх нясе адказнасць за свае ўчынкі толькі перад Богам. Ідэя боскага паходжання манархічнай улады пазіцыяніравала, з аднаго боку, прынцып павагі да ўлады, з другога – погляд на добрага манарха як боскую ўзнагароду за людскую дабрачыннасць, а на дрэннага – як на пакаранне за грахі людзей.

Гэтыя ідэі з візантыйскай і часткова балгарскай культуры трансляваліся на ўсходнеславянскія землі. Яны знаходзяць сваё адлюстраванне ў першых усходнеславянскіх летапісах, творы "Слова аб законе і благадаці" мітрапаліта Іларыёна (XI ст.) і г. д. Паколькі сацыяльна-палітычная літаратура стваралася ў царкоўным асяроддзі, то абгрунтаванне ідэалогіі цэзарапапізму ўключалася ў кантэкст цеснага саюзу княскай улады і праваслаўнай царквы (царква была зацікаўлена ў далейшай хрысціянізацыі і павышэнні ўласнага аўтарытэту, што магло быць магчыма толькі пры падтрымцы моцнай княскай улады; княская ўлада мела патрэбу ва ўласнай легітымізацыі пры дапамозе рэлігійнага аўтарытэту).

У актуальных палітычных умовах сярэднявечных усходнеславянскіх княстваў сацыяльна-палітычная думка выпрацавала дзве спецыфічныя ідэі:

1) ідэя адзінства ўсходнеславянскіх зямель ("Рускай зямлі"), пад якім разумелася адзінства княскай эліты, заснаванае на яе агульным паходжанні. У сувязі з гэтым у маралізатарскай форме асуджаюцца міжусобіцы, злоўжыванні палітычнай уладай асобных князёў;

2) ідэя палітычнай і рэлігійнай незалежнасці Русі ад Візантыі ("Слова аб законе і благадаці"). Дадзеная ідэя яскрава прасочваецца і ў "Аповесці мінулых гадоў", дзе сцвярджаецца нарманская канцэпцыя ўтварэння ўсходнеславянскай дзяржаўнасці як своеасаблівы адказ на візантыйскую канцэпцыю, згодна з якой дзяржаўнасць і права ва ўсходніх славян з'явіліся ў выніку іх хрышчэння Візантыяй.

*Такім чынам, у сярэднявечны перыяд (XI – XV стст.) адбываецца станаўленне філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Яна фарміруецца і развіваецца ў кантэксце філасофскай думкі старажытнаўсходнеславянскай геакультурнай прасторы і пры вызначальным уздзеянні*

*візантыйскай філасофскай культуры. Галоўнымі яе рысамі з’яўляюцца акцэнтавана рэлігійны характар, падпарадкаванне філасофскіх праблем тэалагічным, неаддзеленасць філасофіі ад жыццёва-практычнай мудрасці, перавага этычнай і сацыяльна-палітычнай праблематыкі.*

## Кантрольныя пытанні да тэмы 1

1. Якія фактары абумовілі фарміраванне філасофскай і грамадска-палітычнай думкі на тэрыторыі Беларусі ў сярэднявечны перыяд?

2. У чым выяўлялася спецыфіка працэсу хрысціянізацыі на ўсходнеславянскіх землях?

3. Вызначце ролю хрысціянства ў фарміраванні філасофскай думкі Беларусі.

4. Ахарактарызуйце асноўныя крыніцы сярэднявечнай філасофскай думкі Беларусі.

5. Якімі спецыфічнымі рысамі вызначалася філасофская думка Беларусі XI – XV стст.?

6. Растлумачце сутнасць паняцця тэалагічна-філасофскага рацыяналізму, назавіце яго асноўных прадстаўнікоў на землях сучаснай Беларусі.

7. Якія асноўныя філасофскія ідэі раскрываюцца ў творчасці Кірылы Тураўскага?

8. Як выяўляецца роля “кіеўскага рэнесансу” ў развіцці традыцыі тэалагічна-філасофскага рацыяналізму?

9. Назавіце асноўныя творы сярэднявечнай філасофскай думкі Беларусі, у якіх адлюстраваны этычныя ідэі.

10. Вызначце месца рэлігійнага светапогляду ў фарміраванні этычных і сацыяльна-палітычных ідэй сярэднявечча.

11. Параўнайце змест этычных ідэй, выказаных у агіяграфічнай літаратуры і ў фларылегіях.

12. Вызначце ролю візантыйскай сацыяльна-палітычнай ідэалогіі ў фарміраванні грамадска-палітычнай думкі Беларусі.

13. Растлумачце сутнасць ідэі цэзарапапізму.

14. У чым праявілася спецыфіка сацыяльна-палітычнай думкі на ўсходнеславянскай прасторы ў Сярэднявеччы?

# ТЭМА 2. ПЕРЫЯД АДРАДЖЭННЯ І РЭФАРМАЦЫІ (XVI ст.)

## Гістарычныя ўмовы развіцця філасофскай і грамадска-палітычнай думкі

У сацыяльна-эканамічным жыцці адбываецца станаўленне буйных, арыентаваных на рынак гаспадарак у аграрным сектары, развіццё таварна-грашовых адносін, рамяства і гандлю, хуткі рост гарадоў і мястэчак, замацаванне за асноўнымі гарадамі права на самакіраванне (магдэбургскае права), актывізацыя знешнеэканамічных сувязяў. Дадзеныя фактары спрыяюць назапашванню вялікай колькасці ведаў, а таксама выклікаюць патрэбу ў з’яўленні і выкарыстанні новых ведаў – гэта прыводзіць да павышэння ролі адукацыі і інтэлектуальнай дзейнасці.

У сацыяльна-палітычным жыцці адбываюцца працэсы дзяржаўнай цэнтралізацыі Вялікага княства Літоўскага, што знаходзіць адлюстраванне ў фарміраванні агульнадзяржаўнага заканадаўства (Статуты ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг.), уніфікацыі адміністрацыйнай і судовай сістэмы на тэрыторыі ВКЛ, дакладным вызначэнні кампетэнцыі цэнтральных органаў дзяржаўнай улады. Адначасова з дадзенымі працэсамі адбываецца фарміраванне спецыфічных форм дзяржаўнага (элекцыйная манархія, заснаваная на выбарнасці манарха) і грамадска-палітычнага ладу (шляхецкая дэмакратыя). Шляхецкая дэмакратыя вызначала пануючае саслоўе – шляхту – як “палітычны народ”, які валодае ўсёй паўнатой грамадзянскіх і палітычных правоў і ажыццяўляе ўладу праз сваіх прадстаўнікоў у выбарных дзяржаўных інстытутах. Ускладненне грамадска-палітычнай сістэмы ў ВКЛ патрабавала ад суб’ектаў палітыкі значнага адукацыйнага ўзроўню і ўмення выкарыстоўваць сродкі рацыянальна-тэарэтычнага мыслення. У 1569 г. у выніку заключэння уніі ВКЛ з Польскім каралеўствам была ўтворана федэратыўная дзяржава – Рэч Паспалітая. Дадзены факт садзейнічаў замацаванню ў ВКЛ прынцыпаў шляхецкай дэмакратыі, а таксама інтэграцыі ў заходнееўрапейскую сістэму міжнародных адносін.

У духоўным жыцці ўзмацняліся кантакты з заходнееўрапейскай культурай. У гэтым кантэксце адбываліся важныя працэсы ў рэлігійным і культурным жыцці ВКЛ:

1. Распаўсюджанне з сярэдзіны XVI ст. рэфармацыйнага руху, які ахапіў пераважна эліту грамадства. У выніку побач з праваслаўем і каталіцызмам на землях Беларусі з’явіліся пострэфармацыйныя канфесіі: кальвінізм, лютэранства, антытрынітарызм. Узаемаадносіны паміж рознымі рэлігійнымі канфесіямі мелі пераважна мірны характар; Віленскі прывілей 1563 г.

і акт Варшаўскай канфедэрацыі 1573 г. (датычыў усёй Рэчы Паспалітай) замацавалі палітыка-прававую роўнасць шляхты ўсіх хрысціянскіх веравызнанняў.

2. Узнікненне кнігадрукавання. У 1517 г. Францыск Скарына надрукаваў у Празе некалькі кніг Бібліі на царкоўнаславянскай мове з элементамі старабеларускай. На працягу XVI ст. друкарні ўзнікаюць у Вільні, Брэсце, Нясвіжы, Лоску, Любчы. Значна ўзрастае аб'ём і асартымент кніжнай прадукцыі.

3. Развіццё адукацыі – распаўсюджанне практыкі выезду прадстаўнікоў вышэйшых колаў грамадства на вучобу ў заходнееўрапейскія універсітэты; узнікненне новых канфесійных навучальных устаноў, асабліва пратэстанцкіх, у якіх разам з тэалогіяй значная ўвага надавалася свецкім ведам.

4. Стварэнне інтэлектуальных гурткоў вакол двароў асобных магнатаў і рэлігійных устаноў, якія ўключалі ў сябе друкарні, школы, бібліятэкі, дзейнасць літаратараў, перакладчыкаў, мастакоў і г. д.

5. Замацаванне шматмоўнасці ў духоўнай культуры Беларусі: у гэты час выкарыстоўваюцца старабеларуская, царкоўнаславянская, польская і лацінская мовы.

## Адраджэнне і Рэфармацыя як фактары развіцця філасофскай і грамадска-палітычнай думкі XVI ст.

У XVI ст. адбываецца пераарыентацыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі на пераважнае засваенне ўзораў заходнееўрапейскай філасофіі. Гэтаму садзейнічалі актыўнае развіццё культурных кантактаў з Заходняй Еўропай, а таксама аслабленне адпаведных кантактаў з Грэцыяй пасля заваявання Візантыі Асманскай імперыяй (1453 г.). Разам з тым візантыйская тэалагічна-філасофская спадчына захавалася ў межах праваслаўнай культуры. У ВКЛ атрымалі распаўсюджанне лацінамоўныя творы антычных аўтараў, а таксама заходнееўрапейскіх дзеячаў гуманізма і Рэфармацыі. З апошнімі некаторыя культурныя дзеячы ВКЛ падтрымлівалі непасрэдныя сувязі. Узмацняецца ўзаемадзеянне філасофскай думкі ВКЛ з польскай думкай; на тэрыторыі Рэчы Паспалітай фарміруецца адзіная геакультурная прастора.

Найбольшы ўплыў на развіццё філасофскай і грамадска-палітычнай думкі ВКЛ у XVI ст. аказалі ідэі Адраджэння і Рэфармацыі.

| | |
|---|---|
| ***Адраджэнне*** – агульнаеўрапейскі рух XIV – XVI стст., накіраваны фармальна на ўзнаўленне антычнай культурнай спадчыны. | ***Рэфармацыя*** – агульнаеўрапейскі рэлігійны рух XVI ст., накіраваны на радыкальную трансфармацыю традыцыйнай (перадусім каталіцкай) царквы і яе вучэння згодна з прынцыпамі аўтэнтычнага хрысціянства. |

| | |
|---|---|
| *Антрапацэнтрызм* – прызнанне чалавека вышэйшай праявай боскага тварэння, цэнтральным элементам прыроды, носьбітам свабоднай волі, стваральнікам культурнага свету. | *Несувымяральнасць боскага і чалавечага* – акцэнтаванне татальнай розніцы паміж усемагутным Богам, які знаходзіцца над светам (трансцэндэнцыя), і бяссільным і залежным чалавекам. |
| *Гуманізм* – прызнанне за чалавекам права і абавязку актыўна ўздзейнічаць на прыродную і сацыяльную рэчаіснасць з мэтай яе ўдасканалення ў адпаведнасці з патрэбамі, інтарэсамі і мэтамі чалавека. | *Рэлігійны персаналізм* – сцвярджэнне асабістай веры як адзінага сродка выратавання і набліжэння чалавечай асобы да боскай асобы. |
| *Культурны сінкрэтызм* – сцвярджэнне сінтэзу дасягненняў хрысціянскай і антычнай культур. | *Рэлігійны рыгарызм* – акцэнтаванне "чысціні" хрысціянскай рэлігіі, што прадугледжвала яе ачышчэнне ад нехрыціянскіх культурных уплываў (адмоўнае стаўленне да антычнай культуры). |

Сярод рэнесансных ідэй найбольшай папулярнасцю ў ВКЛ карысталіся ідэі Паўночнага Адраджэння, увасобленыя ў канцэпцыі "хрысціянскага гуманізму" Эразма Ратэрдамскага.

### *Асноўныя прадстаўнікі філасофіі Адраджэння ў ВКЛ*

***Францыск Скарына*** (каля 1486 / 1490 – каля 1551 гг.) – беларускі першадрукар, грамадскі і культурны дзеяч; доктар медыцыны (1512 г.). Надрукаваў на царкоўнаславянскай мове з элементамі старабеларускай 22 кнігі Старога Запавету Бібліі ў друкарні ў Празе (1517 – 1519 гг.), а потым у друкарні ў Вільні "Малую падарожную кніжыцу" (1522 г.) і "Апостал" (1525 г.). У яго прадмовах і пасляслоўях да кніг Бібліі можна прасачыць некаторыя філасофскія і сацыяльна-палітычныя ідэі.

***Міхалон Літвін*** (псеўданім, сапраўднае аўтарства дакладна не ўстаноўлена) – аўтар трактата "Пра норавы татараў, літвінаў і маскавітаў" (каля 1550 г.).

***Станіслаў Кашуцкі*** (? – 1559 г.) – паэт, перакладчык, бібліятэкар. Атрымаў дасканалую гуманістычную адукацыю. Знаходзіўся на службе ў магнатаў Радзівілаў, а таксама пры вялікакняскім двары. Аўтар перакладу на лацінскую мову трактата Цыцэрона "Пра абавязкі людзей усіх станаў" (першае выданне 1575 г.) з уласнай прадмовай.

***Беняш Будны*** – пісьменнік, перакладчык і каментатар твораў антычных аўтараў; працаваў пры дварах розных магнатаў ВКЛ у канцы XVI –

пачатку XVII стст. Аўтар працы “Апафегматы” (1599 г.), якая змяшчае філасофска-этычныя сентэнцыі аб вучэнні або жыцці антычных філосафаў і палітыкаў з твораў розных антычных аўтараў. Аўтар перакладу на польскую мову трактатаў Цыцэрона “Пра старасць” з уласнай прадмовай (1595 г.) і “Пра дружбу” (1603 г.).

Аўтар ананімнага твора “*Размова Паляка з Літвінам*” (каля 1565 г.) (мяркуецца, што аўтарам твора з’яўляецца ***Аўгусцін Ратундус***, віленскі войт у 1552 – 1582 гг.).

З пэўнай ступенню ўмоўнасці да прадстаўнікоў рэнесанснай думкі ВКЛ можа быць аднесены ***Леў Сапега*** (1557 – 1633 гг.) – падканцлер ВКЛ у 1585 – 1589 гг., канцлер у 1589 – 1623 гг., віленскі ваявода ў 1623 – 1633 гг. і гетман вялікі ВКЛ у 1625 – 1627 гг. Прымаў актыўны ўдзел у складанні Статута ВКЛ 1588 г. Адзін з арганізатараў Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г. Да яго творчай спадчыны належаць “Прысвячэнне” выдання Статута 1588 г. Жыгімонту Вазу, “Зварот” да ўсіх грамадзян ВКЛ пры выданні Статута, эпісталярныя творы.

Пад уплывам філасофскіх ідэй Адраджэння адбывалася станаўленне новалацінскай літаратуры ў ВКЛ (Мікалай Гусоўскі, Ян Вісліцкі, Францішак Градоўскі, Ян Радван і г. д.).

Ідэі Рэфармацыі аказалі значны ўплыў на фарміраванне ідэалогіі пострэфармацыйных канфесій у ВКЛ. Але разам з тым яны часткова паўплывалі і на інтэлектуальныя здабыткі каталіцкіх і праваслаўных дзеячаў.

## Асноўныя прадстаўнікі рэфармацыйнай філасофскай думкі ў ВКЛ

Вылучаюцца ***пратэстанцкая плынь***, прадстаўленая кальвіністамі і лютэранамі, і ***радыкальна-рэфармацыйная плынь***, прадстаўленая антытрынітарыямі.

### *Прадстаўнікі пратэстанцкай плыні*

***Андрэй Волан*** (каля 1530 – 1610 гг.) – ідэолаг кальвінізму ў ВКЛ, грамадска-палітычны і дзяржаўны дзеяч. Працаваў каралеўскім сакратаром, неаднаразова выбіраўся на Соймы Рэчы Паспалітай. Аўтар шматлікіх тэалагічных, філасофскіх і грамадска-палітычных твораў. Асноўныя працы: “Пра палітычную або грамадзянскую свабоду” (1572 г.), “Прамовы да Сената” (1572 г.), “Роздум над пасланнем боскага апостала Паўла да эфесцаў” (1592 г.), “Пра шчаслівае жыццё, або Найвышэйшае чалавечае дабро” (1596 г.), “Пра дзяржаўнага мужа і яго асабістыя дабрачыннасці” (1608 г.). У ранніх творах рэфармацыйныя ідэі цесна пераплятаюцца з гуманістычнымі.

***Эразм Глічнер*** (1535 – 1603 гг.) – адзін з лідэраў лютэранскай царквы ў Польшчы і ВКЛ. У 1550 – 1554 і 1558 – 1559 гг. працаваў пры двары

князёў Слуцкіх у ВКЛ. У далейшым лютэранскі святар у розных польскіх гарадах і суперінтэндэнт лютэранскай царквы ў Вялікапольшчы (1566 – 1603 гг.). Аўтар шматлікіх тэалагічных, гістарычных і педагагічных твораў. Асноўная сацыяльна-палітычная праца – "Апеляцыя" (1598 г.).

***Бальтазар Красневіч*** (? – 1624 г.) – актыўны дзеяч кальвініцкай царквы ў ВКЛ. Аўтар твора "Тэзісы па логіцы" (1602 г.) і каментараў да "Палітыкі" Арыстоцеля (1603 г.).

***Прадстаўнікі радыкальна-рэфармацыйнай плыні***

***Сымон Будны*** (каля 1530 – 1593 гг.) – адзін з лідэраў антытрынітарнага руху ў ВКЛ. Аўтар перакладу на польскую мову Бібліі (1572 г.) і асобна Новага Запавету разам з уласнай прадмовай і каментарыямі (1574 – 1575 гг.), а таксама перавыдання з уласнай прадмовай працы буйнейшага прадстаўніка польскай рэнесансна-гуманістычнай сацыяльна-палітычнай думкі Анджэя Фрыча Маджэўскага "Аб выпраўленні Рэчы Паспалітай" (1577 г.). Асноўныя рэлігійна-філасофскія творы: "Катэхізіс" (1562 г.), "Пра галоўныя палажэнні хрысціянскай веры" (1576 г.), "Пра свецкую ўладу" (1583 г.).

***Марцін Чаховіц*** (1532 – 1613 гг.) – адзін з лідэраў антытрынітарнай царквы ў Польшчы і ВКЛ. У 1558 – 1565 гг. працаваў настаўнікам і прапаведнікам пры Віленскім евангелісцка-рэфармацкім зборы. Пазней узначальваў антытрынітарыяў у Польшчы. Аўтар перакладу на польскую мову Новага Запавету (1577 г.), а таксама шматлікіх тэалагічных прац. Галоўны тэалагічна-філасофскі твор – "Хрысціянскія размовы" (1575 г.).

***Ян Ліцыній Намыслоўскі*** (пач. 1560-х – каля 1633 / 1636 гг.) – актыўны дзеяч антытрынітарнай царквы ў ВКЛ. Працаваў рэктарам антытрынітарнай школы ў Іўі, быў прапаведнікам у Навагародку. Аўтар падручніка па філасофіі "Зброя вучэння Арыстоцеля" (1586 г.). Асноўныя рэлігійна-філасофскія працы: "Сентэнцыі, неабходныя ў грамадскім жыцці" (1589 г.), "Каталісіс" (1598 г.).

Элементы рэфармацыйнай філасофскай думкі прасочваюцца і ў чыста тэалагічных творах прадстаўнікоў розных плыняў рэфармацыйнага руху (Вавжынец з Прасныша, Павел Гілёўскі, Анджэй Хжанстоўскі і інш.).

## Спецыфічныя рысы філасофскай думкі ВКЛ эпохі Адраджэння і Рэфармацыі

Нягледзячы на істотныя адрозненні, як ідэі Адраджэння, так і ідэі Рэфармацыі былі скіраваны супраць сярэднявечнага светапогляду, рабілі акцэнт на праблеме чалавека, сцвярджэнні індывідуальнага пачатку ў чалавеку. Для філасофскай і сацыяльна-палітычнай думкі ВКЛ у значнай ступені характэрны феномен сінтэзу рэнесансных і рэфармацыйных ідэй.

Сярод агульных рыс гэтых перыядаў можна вылучыць наступныя:

1) сітуацыя незавершанасці фарміравання філасофіі як феномена культуры (філасофская думка не была аддзелена ад іншых відаў інтэлектуальнай культуры);

2) поліканфесійны і полілінгвістычны характар;

3) цесная сувязь рэнесансных і рэфармацыйных ідэй;

4) скіраванасць філасофскай культуры пераважна на этычныя і сацыяльна-палітычныя праблемы;

5) сцвярджэнне ідэй рэлігійнай цярпімасці.

## Анталагічныя і гнасеалагічныя ідэі

Праблемы анталогіі і гнасеалогіі знаходзіліся ў філасофскай думцы ВКЛ перыяду Адраджэння і Рэфармацыі на другім плане (пераважала этычная і сацыяльна-палітычная праблематыка). Характэрнай рысай анталагічнай і гнасеалагічнай думкі дадзенага часу з'яўляецца яе рэлігійна-тэалагічная форма, уключанасць у кантэкст тэалагічных праблем. У тэалагічных творах разглядаемага перыяду выкарыстоўваюцца асобныя анталагічныя і гнасеалагічныя ідэі для падмацавання веравучэння пэўнай канфесіі.

***Анталагічныя погляды*** мысліцеляў эпохі Адраджэння і Рэфармацыі фарміраваліся пад уплывам сярэднявечнай рэлігійна-філасофскай думкі. У іх аснове знаходзіліся прынцыпы *тэацэнтрызму*, *крэацыянізму*, *правідэнцыялізму*.

Галоўная анталагічная праблема дадзенага перыяду – *праблема сутнасці Бога і суадносін Бога і свету*. Яна атрымала разгляд у сувязі з дыскусіяй пра Тройцу, паднятай антытрынітарыямі. Згодна з традыцыйным хрысціянскім вучэннем, Бог разглядаецца як абсалютнае быццё, падкрэсліваецца адзінства Бога, і ў той жа час вылучаюцца тры раўнапраўныя і неаддзельныя адна ад адной асобы Бога: Айцец, Сын і Святы Дух. У тэалогіі антытрынітарызму (С. Будны, М. Чаховіц) дадзены пастулат падвяргаецца крытыцы з рацыянальна-лагічных пазіцый. У процівагу яму сцвярджаецца канцэпцыя, згодна з якой адзіным Богам з'яўляецца толькі Бог-Айцец у трынітарным тлумачэнні. Святы дух выступае як творчая стваральная сіла Бога. Ісус Хрыстос разглядаецца не як Бог, а як чалавек, абраны Богам.

У творах С. Буднага змяшчаецца рацыяналістычная карціна суадносін Бога і свету: Бог кіруе светам пры дапамозе натуральных прычын (законаў прыроды). Біблейскія цуды інтэрпрэтуюцца як прыродна абумоўленыя падзеі. Адмаўляюццца бессмяротнасць душы, рэальнае існаванне замагільнага свету, які разглядаецца як алегорыя.

***Гнасеалагічныя праблемы*** разглядаліся ў філасофскай думцы ВКЛ эпохі Адраджэння і Рэфармацыі найперш у кантэксце пытання аб тлумачэнні Святога Пісання. Да асноўных з іх належаць *праблема суадносін веры і розуму* і *праблема ісціны*, з якімі звязвалася *пытанне інтэрпрэтацыі свяшчэнных тэкстаў*.

Для абсалютнай большасці прадстаўнікоў інтэлектуальнай думкі разглядаемага перыяду былі характэрны *фідэізм* (прынцып, які сцвярджае прыярытэт веры перад розумам) і *рэвеляцыянізм* (прынцып, згодна з якім крыніцай абсалютнай ісціны выступаюць свяшчэнныя тэксты, у якіх змешчана боскае адкрыццё).

У рэнесанснай філасофскай думцы *праблема суадносін веры і розуму* знайшла найбольш глыбокае адлюстраванне ў творчасці Ф. Скарыны. У сваіх прадмовах да Бібліі Скарына абвяшчае яе крыніцай ісціны і мудрасці і ў той жа час сцвярджае, што біблейская мудрасць праяўляецца ў дваякай форме:

– эзатэрычная (тэксты, у якіх разглядаюцца важнейшыя светапоглядныя ісціны) – выступае прадметам веры і таму даступная толькі для выбраных, спецыяльна падрыхтаваных людзей;

– экзатэрычная (тэксты, у якіх змяшчаюцца даступныя кожнаму чалавеку маральна-філасофскія ісціны і элементы свецкіх ведаў) – выступае прадметам розуму і таму даступная для ўсіх людзей.

Ф. Скарына абгрунтоўвае прыярытэт веры перад розумам, але прызнае значную ролю розуму ў тлумачэнні натуральных з’яў рэчаіснасці.

У рэлігійна-філасофскай літаратуры існавалі розныя падыходы да тлумачэння выказванняў, змешчаных у Бібліі, г. зн. да інтэрпрэтацыі Святога Пісання і тым самым – да вызначэння зместу хрысціянскай веры, што было звязана з разыходжаннямі канфесійных веравучэнняў:

| ***аўтарытарны падыход*** (прадстаўлены ў каталіцкай і праваслаўнай цэрквах) | ***персаналісцкі падыход*** (прадстаўлены ў дыскурсе рэфармацыйнага руху) |
|---|---|
| Ісцінны сэнс тэкстам Святога Пісання надае аўтарытэт царкоўнай традыцыі, якая захоўвае пераемнасць з апостальскіх часоў (творы “айцоў царквы”, пастановы царкоўных сабораў, рашэнні вышэйшых царкоўных іерархаў); інтэрпрэтацыя па-за межамі царкоўнай традыцыі абапіраецца толькі на слабы чалавечы розум, а таму не можа быць ісціннай. | Святое Пісанне з’яўляецца адзіным аўтарытэтам у справах веры само па сабе і не мае патрэбы ў яго тлумачэнні царкоўнай традыцыяй; кожны вернік пры падтрымцы Святога духа можа асабіста вызначаць сэнс біблейскіх тэкстаў. |

Фактычна персаналісцкі падыход адкрываў шлях для магчымасці ўзнікнення мноства самых розных інтэрпрэтацый Святога Пісання і тым самым – розных веравучэнняў. У сувязі з гэтым у пратэстанцкай думцы ён быў хутка абмежаваны. Узнікае сцвярджэнне пра тое, што тэксты Бібліі маюць адзіны дакладна вызначаны сэнс, які ўстанаўліваецца дзякуючы прынцыпу відавочнасці: простыя тэксты, сэнс якіх зразумелы з відавочнасцю, разглядаюцца як аксіёмы, а больш складаныя тлумачацца на аснове больш простых. Узорам такой інтэрпрэтацыі Святога Пісання абвяшчаюцца творы ідэолагаў Рэфармацыі (М. Лютэра, Ф. Меланхтона, Г. Булінгера, Ж. Кальвіна і інш.). Альтэрнатыўныя ім тлумачэнні біблейскіх тэкстаў разглядаюцца як вынік няправільнага карыстання розумам.

Супрацьстаянне традыцыйнага і персаналісцкага падыходаў адбывалася на аснове прызнання абодвума бакамі прынцыпа фідэізму і абвінавачванняў апанентаў у рацыяналізме. Каталікі і праваслаўныя абвінавачвалі пратэстантаў у тым, што яны ствараюць веравучэнне на аснове ўласнага розуму, а не на аснове веры, крыніцай якой з'яўляецца царква праз містычную апостальскую пераемнасць; пратэстанты крытыкавалі католікаў і праваслаўных за падмену Бібліі як сапраўднай крыніцы веры вынаходніцтвамі розумаў царкоўных іерархаў і тэолагаў.

У межах антытрынітарнага вучэння, дзе найбольш паслядоўна праявіўся персаналісцкі падыход, знайшлі адлюстраванне *ідэі рэлігійнага рацыяналізму*. У рэлігійна-філасофскай думцы гэтай канфесіі вызначыліся два падыходы да праблемы веры і розуму і інтэрпрэтацыі Святога Пісання:

1) *містычны* (М. Чаховіц і яго польскія аднадумцы Г. Павел, Я. Немаеўскі); яго характэрныя рысы: радыкальны фідэізм, літаралізм у тлумачэнні біблейскіх тэкстаў, вучэнне аб ілюмінацыі Святога духа (рэлігійная ісціна адкрываецца ў выніку містычнага адкрыцця Святога духа абранаму Богам верніку), непрыняцце спадчыны рацыяналістычнай антычнай філасофіі;

2) *рацыяналістычны* (С. Будны, Я. Л. Намыслоўскі); яго характэрныя рысы: прыярэтэт розуму ў вызначэнні зместу веры, лагічны, гістарычны і філалагічны аналіз біблейскіх тэкстаў, сінтэз хрысціянскай веры з антычнай і рэнесанснай рацыяналістычнай гнасеалогіяй.

У канцы XVI – першай палове XVII стст. ідэі рацыяналістычнага накірунку антытрынітарнай думкі ў ВКЛ знайшлі развіццё ў вучэнні польскага сацыніянства (Ф. Соцын, Я. Крэль, С. Пшыпкоўскі, А. Вішаваты), дзе адбываецца рацыяналізацыя рэлігійнай веры, увасобленая ў прынцыпе “рэлігія не можа супярэчыць розуму”. Дадзены прынцып прадугледжваў рацыянальна-лагічны аналіз рэлігійных дагматаў і адмаўленне ад фідэізму.

## Этычная думка

Этыка дадзенага перыяду захоўвае ў асноўным рэлігійны характар. Аднак, у адрозненне ад папярэдняга перыяду, разам з арыентацыяй на дасягненне вечнага выратавання сцвярджаецца таксама каштоўнасць зямнога жыцця чалавека. На этычную думку Беларусі XVI ст. аказалі значнае ўздзеянне рэнесансныя і рэфармацыйныя ідэі, якія рэвізуюць традыцыйную сярэднявечную мараль. Рэнесансная этыка сцвярджае свабоду волі, здольнасць да самаўдасканалення чалавечай асобы ў адпаведнасці з прынцыпамі антрапацэнтрызму і гуманізму. Рэфармацыйная этыка сцвярджае залежнасць чалавека, яго маральнага ўдасканалення ад боскай волі; пры гэтым высокамаральны лад разглядаецца як знешняя праява боскай абранасці.

Нягледзячы на значныя адрозненні, этычныя ідэі рэнесанснай і рэфармацыйнай думкі садзейнічалі пераадоленню сярэднявечных этычных уяўленняў, заснаваных на аўтарытэце царквы. У абмежаванай ступені ў іх сцвярджалася *ідэя духоўна-маральнай аўтаноміі чалавечай асобы*. У той жа час назіраецца цеснае перапляценне элементаў розных ідэйных традыцый (сярэднявечнай, рэнесанснай, рэфармацыйнай), якія суіснуюць нават у светапоглядзе асобных мысліцеляў.

У этычнай думцы XVI ст. найбольшую актуальнасць маюць праблемы *свабоды волі чалавека, пераемнасці маральных каштоўнасцяў, шчасця* і *суадносін агульнага і індывідуальнага дабра*.

*Пытанне аб свабодзе волі чалавека* вырашалася ў шэрагу іншых тэалагічных праблем. Паводле яго фарміруюцца дзве асноўныя пазіцыі:

| | |
|---|---|
| Чалавек мае свабоду выбару і выкарыстоўвае яе ў накірунку або маральнага самаўдасканалення, або маральнай дэградацыі; дабро ці зло не закладзены ў людзях ад прыроды. У той жа час чалавек здольны адрозніваць дабро і зло дзякуючы натуральнаму закону, які змяшчаецца ў яго душы, што робіць магчымым маральныя ўчынкі (прыхільнікі: Ф. Скарына, С. Будны, Я. Л. Намыслоўскі). | Чалавек у выніку сваёй прыроджанай грахоўнасці не здольны да самаўдасканалення; маральныя паводзіны з'яўляюцца адзнакай абраных Богам для выратавання людзей і ажыццяўляюцца дзякуючы дзеянню боскай ласкі праз гэтых людзей (прадстаўнікі: П. Гілёўскі, М. Чаховіц, А. Волан у позні перыяд творчасці). |

*Праблема пераемнасці духоўна-маральных каштоўнасцяў* паўстае пад уплывам павышанай цікавасці да антычнай культуры ў філасофіі Адраджэння. У еўрапейскай рэнесансна-гуманістычнай думцы (М. Фічына, Піко дэла Мірандола, Эразм Ратэрдамскі) узнікае ідэя сінтэзу хрысціянскай і антычнай этыкі на аснове падабенства іх зыходных прынцыпаў. У ВКЛ

упершыню ідэя падобнага сінтэзу ўзнікае ў творчасці Ф. Скарыны, С. Кашуцкага, Б. Буднага.

Ідэя сінтэзу абапіраецца на канцэпцыю *адзінства боскага і натуральнага закону*. Натуральны закон апрыёрна змяшчаецца ў душы ўсіх людзей, ён дазваляе адрозніваць дабро і зло, вызначаць маральныя паняцці, якія знаходзяцца ў аснове дабрадзейнага жыцця. Боскі закон змяшчаецца ў Святым Пісанні і вызначае этычныя імператывы, неабходныя для дасягнення выратавання. І натуральны, і боскі закон створаны Богам, а таму яны не могуць супярэчыць адно аднаму. Таму кожны чалавек, нават калі ён нічога не ведае пра хрысціянскую рэлігію, можа вызначыць агульначалавечыя маральныя дабрадзейнасці і жыць у адпаведнасці з імі на аснове натуральнага розуму. Адпаведным чынам, антычная этыка, заснаваная на святле натуральнага розуму, і хрысціянская мараль, заснаваная на богаадкрыцці, фактычна сцвярджаюць адны і тыя ж прынцыпы і ўзаемна дапаўняюць адно аднаго, ідучы рознымі шляхамі.

Важнае месца ў сістэме этычнай думкі XVI ст. мела *праблема суадносін індывідуальнага і агульнага дабра*. У рэнесанснай этыцы сцвярджаецца ідэал актыўнай творчай асобы, які з’яўляецца ўмовай індывідуальнага і агульнага дабра. Абодва дадзеныя феномены разглядаюцца ў іх узаемасувязі, аднак пры гэтым сцвярджаецца *прыярытэт агульнага дабра* (Ф. Скарына, Міхалон Літвін, С. Кашуцкі, А. Волан).

Найбольш грунтоўна названая праблема асветлена ў працы А. Волана “Пра палітычную або грамадзянскую свабоду”. А. Волан сцвярджае, што прызначэнне зямнога чалавечага жыцця заключаецца ў *шчасці*. Шчаслівае жыццё чалавека залежыць ад шэрагу ўмоў і перш за ўсё – ад правільнага разумення сутнасці вышэйшага дабра. А. Волан падзяляе чалавечыя даброты на духоўныя (якія маюць значэнне для выратавання чалавека ў вечнасці) і матэрыяльныя (звязаныя з зямным жыццём). Вышэйшымі абвяшчаюцца даброты духоўныя; у той жа час падкрэсліваецца значэнне матэрыяльных даброт, якія выступаюць неабходнымі передумовамі шчаслівага жыцця. Аднак разумнае карыстанне дабротамі магчыма толькі ва ўмовах грамадскага жыцця, у якім рэалізаваны прынцып *свабоды*, пад чым разумеюцца ўсеагульная згода і мір у грамадстве, недатыкальнасць асобы і маёмасці. Сродкам, які забяспечвае грамадскае адзінства, свабоду і ў канечным выніку шчасце, з’яўляюцца агульнадзяржаўныя законы, заснаваныя на разумных і справядлівых пачатках. Фарміраванне і рэалізацыя дадзеных законаў залежаць ад спецыфікі дзяржаўнай улады (тут этычная праблематыка пераходзіць у сацыяльна-палітычную). Такім чынам, агульнае грамадскае дабро (грамадская свабода) выступае ўмовай індывідуальнага дабра і шчасця чалавека.

Пэўную спецыфіку ў межах этычнай думкі Беларусі XVI ст. мела *рэлігійна-этычнае вучэнне радыкальнай часткі антытрынітарнага руху* (М. Чаховіц, Г. Павел, Я. Немаеўскі). Яго асновай выступае сцвярджэнне абсалютнага характару хрысціянскіх маральных норм, змешчаных у Новым Запавеце. Для радыкальных антытрынітарыяў характэрны дуалістычны падзел грамадства на "*свет сапраўдных хрысціян*" і "*знешні свет*". "Свет сапраўдных хрысціян" уяўляе сабой духоўную супольнасць абраных Богам праведнікаў, для якіх евангельскія нормы маралі выступаюць адзіным рэгулятарам жыццядзейнасці. "Знешні свет" – гэта сукупнасць індывідаў, што кіруюцца ў сваім жыцці эгаістычнымі інтарэсамі і дзейнічаюць насуперак хрысціянскай маралі (уключае ў сябе ўсе афіцыйныя грамадскія структуры, у першую чаргу дзяржаву). На думку радыкальных антытрынітарыяў, "знешні свет" заўсёды будзе колькасна пераважаць над "светам сапраўдных хрысціян" да сканчэння веку. У межах дадзенага вучэння паслядоўна сцвярджаюцца наступныя прынцыпы:

– *духоўны арыстакратызм*, які ўвасабляецца ў акцэнтаванні богаабранасці "сапраўдных хрысціян", павышаных маральна-этычных патрабаваннях у дачыненні да іх, арыентацыі на мінімізацыю кантактаў "сапраўдных хрысціян" са "знешнім светам" (забарона звароту ў дзяржаўныя ўстановы, суды, валодання маёнткамі і г. д.);

– *рэлігійна-этычны рыгарызм*, асновай якога выступае *ідэя "нясення крыжа праз усё жыццё"*, пад чым разумеецца цярплівае перанясенне пакут, праследаванняў і пагроз жыццю, здароўю і маёмасці, якія выступаюць непазбежнай рысай жыцця "сапраўднага хрысціяніна" і адзнакай яго богаабранасці;

– *ненасілле* – адмаўленне ад выкарыстання любых гвалтоўных дзеянняў у жыцці "сапраўднага хрысціяніна", нават у якасці самаабароны, што прадугледжвае забарону на ўдзел у войнах, здзяйсненне смяротнай кары і займанне дзяржаўных пасад, непазбежна звязаных з выкарыстаннем насілля. Насіллю супрацьпастаўляецца *ідэя "хрысціянскай вайны"*, пад чым разумеецца маральная барацьба супраць зла, зброяй якой з'яўляюцца вера і этычныя дабрадзейнасці.

## Сацыяльна-палітычная і прававая думка

У XVI ст. адбываюцца якасныя зрухі ў развіцці сацыяльна-палітычнай думкі ў ВКЛ. На гэта паўплывалі, з аднаго боку, фарміраванне адметнай формы дзяржаўна-палітычнага ладу (элекцыйная манархія і шляхецкая дэмакратыя), з другога – ідэі заходнееўрапейскай сацыяльна-палітычнай думкі.

Галоўнымі праблемамі сацыяльна-палітычнай думкі ВКЛ у XVI ст. становяцца *праблемы дзяржаўна-палітычнага ўладкавання, палітычнай і грамадзянскай свабоды, талеранцыі.*

*Праблема дзяржаўна-палітычнага ўладкавання* ўключала ў сябе два ўзаемазвязаныя аспекты: фарміраванне канцэпцый "найлепшай" дзяржавы і практычныя рэкамендацыі ў кантэксце грамадска-палітычных рэформ.

Тэорыя дзяржавы грунтавалася на ідэях арыстацелізму. У творах Ф. Скарыны, А. Волана, С. Буднага, Л. Сапегі, Б. Красневіча, а таксама ананімнага аўтара "Размовы Паляка з Літвінам" пад дзяржавай разумеецца аб'яднанне асобных паселішчаў і абшчын пад адзінымі ўладай і правам з мэтай дасягнення агульнага дабра. Падкрэсліваецца некалькі аспектаў у разуменні сутнасці дзяржавы:

| ***тэалагічны*** | ***натуралістычны*** | ***тэлеалагічны*** | ***арганіцысцкі*** |
|---|---|---|---|
| Падкрэсліваецца боскае паходжанне дзяржаўнай улады; неабходнасць падпарадкавання ёй з боку падданых разглядаецца як своеасаблівы рэлігійны абавязак. | Сцвярджаецца, што фарміраванне дзяржавы з'яўляецца вынікам натуральнага працэсу росту асобных паселішчаў і абшчын (пры гэтым дзяржаўная ўлада разглядаецца як сутнасна ідэнтычная патрыярхальнай родава-сямейнай уладзе). | Функцыянаванне дзяржавы мае дакладна вызначаную мэту – дасягненне агульнага дабра (забеспячэнне грамадскай стабільнасці і парадку). | Дзяржава разглядаецца па аналогіі з арганізмам: асобныя саслоўі, надзеленыя рознымі правамі, павінны выконваць спецыфічныя функцыі для дасягнення сацыяльнай гармоніі як часткі адзінага арганізма. |

На аналіз *праблемы "найлепшай" дзяржавы* вялікі ўплыў мела сацыяльна-палітычная канцэпцыя Эразма Ратэрдамскага, выкладзеная ў працы "Выхаванне хрысціянскага правіцеля", паводле якой дзяржаўна-палітычная дзейнасць павінна адпавядаць нормам хрысціянскай маралі. Палітычным ідэалам у творах Ф. Скарыны, Міхалона Літвіна, С. Буднага, ананімнага аўтара "Размовы Паляка з Літвінам" выступае асветная манархія. На іх думку, манарх павінен быць пабожным, мудрым, адукаваным, справядлівым да сваіх падданых. На прынцыпах справядлівасці, карыснасці для народа павінна грунтавацца заканадаўства дзяржавы.

Аднак з улікам спецыфікі грамадскага ладу ВКЛ і Рэчы Паспалітай галоўнае месца пры аналізе праблемы дзяржаўна-палітычнага ўладкавання адводзілася не асобе манарха, а феномену *права*. Ф. Скарына ў прадмове да кнігі "Другі закон Маісееў" падзяляе права на натуральнае і пісанае. Натуральнае права закладзена ў самой істоце чалавека. Яно аднолькавае для

ўсіх людзей, уласцівае кожнаму чалавеку і не залежыць ад месца і часу. Пісанае права Ф. Скарына падзяляе на боскае (змешчанае ў біблейскіх кнігах), царкоўнае (змешчанае ў царкоўных пастанаўленнях) і земскае. Вялікую ўвагу надае Ф. Скарына земскаму праву. У земскім праве ў залежнасці ад грамадскіх адносін, што рэгуляваліся пэўнымі нормамі, вылучаюцца паспалітае права (грамадзянскае і сямейнае), міжнароднае, дзяржаўнае, крымінальнае, ваеннае, гарадское, марское, гандлёвае.

А. Волан пастуліруе права як галоўны фактар стабільнага функцыянавання дзяржавы і недапушчэння тыраніі. Ён распрацоўвае ідэі *выбарнай манархіі* і *шляхецкай дэмакратыі*. Згодна з імі, вяршэнства ўлады ў дзяржаве павінна належаць усяму “палітычнаму народу” – шляхце. Шляхта праз сваіх прадстаўнікоў устанаўлівае законы, выкананне якіх абавязковае для ўсіх, у т. л. для манарха. Права павінна адпавядаць тром прынцыпам: быць справядлівым, выступаць гарантам свабоды і роўнасці (у межах шляхецкага стану), быць разумным.

Элементы ідэі прававой дзяржавы прасочваюцца ў творчасці Л. Сапегі. На яго думку, мэтай права з’яўляецца не дапусціць выкарыстання дзяржаўнай улады ў карыслівых мэтах правіцеля, прадухіліць выраджэнне манархіі ў тыранію і такім чынам абараніць падданых ад злоўжыванняў вярхоўнай улады.

У межах рэнесанснай сацыяльна-палітычнай думкі арыгінальны характар мае ананімны трактат “Размова Паляка з Літвінам”. Узнікненне твора было выклікана дыскусіяй, якая праходзіла ў вялікакняскім і польскім грамадстве напярэдадні Люблінскай уніі. Аўтар трактата палемізуе з ідэолагам польскай шляхты Станіславам Ажахоўскім, які тэарэтычна супрацьпастаўляў каралеўства і княства як увасабленне адпаведна свабоды і няволі. Такім чынам, далучэнне ВКЛ да Польшчы азначала б пераход літвінскай шляхты ад няволі да свабоды. Адмаўляючы аргументы С. Ажахоўскага, аўтар “Размовы Паляка з Літвінам” даводзіць, што княства і каралеўства – проста розныя варыянты адной формы праўлення – манархіі. Паводле яго, няма ніякай сувязі паміж існаваннем палітычнай свабоды ў дзяржаве і тым, з’яўляецца яна княствам або каралеўствам. У якасці найлепшага тыпу дзяржавы пастуліруецца *манархія, абмежаваная духоўнай і свецкай арыстакратыяй,* засяроджанай у спецыяльным органе дзяржаўнага кіравання – Радзе. Падобная мадэль дзяржаўнага ўладкавання разглядаецца як найбольш эфектыўная. У якасці пагроз для яе разглядаюцца тыранія і шляхецкая дэмакратыя.

*Практычная роля ідэй дзяржаўна-палітычнага ўладкавання* значна ўзрастае ва ўмовах палітычнага ажыўлення шляхты, пачынаючы з сярэ-

дзіны XVI ст., якое яскрава выявілася спачатку ў Польшчы, а потым і ў ВКЛ. Час праўлення Жыгімонта II Аўгуста (1548 – 1572 гг.) адзначаны з'яўленнем вялікай колькасці праектаў рэфармавання грамадска-палітычнага ладу. У значнай ступені яны былі рэалізаваны ў выніку выдання Статутаў ВКЛ 1566 і 1588 гг., парламенцкай, судовай і адміністрацыйнай рэформаў 1564 – 1566 гг.

У польскай сацыяльна-палітычнай думцы сярэдзіны XVI ст. найбольшае значэнне мелі рэфарматарскія ідэі *А. Ф. Маджэўскага*, выкладзеныя ў працы "*Аб направе Рэчы Паспалітай*". Галоўныя ідэі А.Ф. Маджэўскага заключаліся ў наступным:

– узвышэнне палітычнай ролі шляхты ў дзяржаве;

– уніфікацыя дзяржаўнага заканадаўства і абмежаванне самавольства магнатэрыі;

– роўнасць усіх грамадзян перад законам.

Праца А. Ф. Маджэўскага аказала вялікі ўплыў на грамадска-палітычную думку ВКЛ. Намаганнямі С. Буднага адбылося яе перавыданне ў Лоску ў 1572 г. Ідэя "*направы" дзяржавы* ўзнаўлялася ў шматлікіх творах. Найбольш акцэнтавана яна праявілася ў працах А. Волана і С. Буднага.

Спецыфічны фармат мае праца Міхалона Літвіна "Аб норавах татар, літоўцаў і масквіцян" (1550 г.), прысвечаная Жыгімонту II Аўгусту, дзе ідэя "направы" актуалізуецца шляхам супрацьпастаўлення грамадскага жыцця ў ВКЛ ідэалізаваным парадкам у Крымскім ханстве і Маскоўскім княстве. Выкарыстоўваючы распаўсюджаны ў эпоху Адраджэння літаратурны прыём – апавяданне аб іншых невядомых або малавядомых народах і краінах, – Міхалон Літвін імкнецца паказаць неабходнасць рэфармавання існуючай грамадска-палітычнай сістэмы. Ён крытыкуе прывілеяванае становішча магнатэрыі, марнатраўны і амаральны лад жыцця шляхты і вышэйшага духавенства, хабарніцтва, жорсткае абыходжанне з падданымі. На гэтай аснове Міхалон Літвін прапануе канкрэтныя грамадска-палітычныя пераўтварэнні: рэфармаванне адміністрацыйнай сістэмы, рэарганізацыя вялікакняскай адміністрацыі, судаводства, павышэнне абароназдольнасці краіны.

Важнымі помнікамі палітыка-прававой думкі ВКЛ XVI ст. з'яўляюцца таксама *Статуты ВКЛ 1529, 1566* і *1588 гг.* У іх знайшлі замацаванне наступныя палітычныя прынцыпы:

– адзінства права для ўсіх грамадзян (хаця на практыцы яно не было для ўсіх роўным);

– дзяржаўны суверэнітэт;

– падзел улады на заканадаўчую (сойм, соймікі), выканаўчую (вялікі князь, адміністрацыйны апарат) і судовую (Трыбунал ВКЛ, выбарныя і незалежныя ад адміністрацыі суды);

– вызначэнне правоў і свабод асобных сацыяльных груп і замацаванне прыярытэту шляхты ў грамадска-палітычным жыцці;

– прыярытэт пісанага права перад звычаёвым.

Важнае месца ў сістэме сацыяльна-палітычнай думкі ВКЛ займае *праблема грамадзянскай і палітычнай свабоды*. Найбольш грунтоўна дадзеная праблема была распрацавана А. Воланам у працы “Пра грамадзянскую, або палітычную свабоду”. У яе аснове знаходзіцца этычная катэгорыя свабоды. Галоўным зместам *грамадзянскай свабоды*, паводле А. Волана, з’яўляюцца:

– гарантаваная законам абарона чалавека ад замахаў на яго жыццё і здароўе;

– абарона асабістых і маёмасных правоў чалавека;

– усеагульная роўнасць перад законам;

– падпарадкаванне ўсіх дзяржаўных служачых, у тым ліку і караля, дзяржаўным законам;

– вырашэнне канфліктных сітуацый паміж грамадзянамі толькі ў судовым парадку;

– наяўнасць справядлівых і незалежных судоў.

Грамадства, у якім выконваюцца дадзеныя ўмовы, з’яўляецца свабодным.

А. Волан падзяляў грамадства на тры саслоўі: шляхту, мяшчан і сялян. Прадстаўнікі ўсіх саслоўяў павінны мець роўныя грамадзянскія правы і цалкам карыстацца грамадзянскай свабодай. Аднак розныя саслоўі павінны выконваць розныя сацыяльныя функцыі ў дзяржаве і мець розныя палітычныя правы. *Палітычная свабода*, якая ўключае права на выбар манарха, удзел у прыняцці ўсіх грамадска-палітычных рашэнняў, належыць толькі шляхецкаму саслоўю.

Блізкія да гэтых ідэі змяшчаюцца ў творах С. Буднага і Л. Сапегі.

Шырокую актуальнасць у рэнесанснай і рэфармацыйнай думцы ВКЛ набыла *праблема талеранцыі*. У XVI ст. яна разумелася амаль выключна ў кантэксце рэлігійнай цярпімасці. На пастаноўку і аналіз дадзенай праблемы аказалі ўплыў традыцыі мірнага суіснавання розных канфесій у ВКЛ. Распаўсюджанне рэфармацыйнага руху прывяло да палітыка-прававога ўраўнавання шляхты ўсіх хрысціянскіх веравызнанняў паводле Віленскага прывілею 1563 г. і акта Варшаўскай канфедэрацыі 1573 г.

На працягу дадзенага перыяду праблема талеранцыі абмяркоўвалася пераважна ў рэлігійнай палеміцы.

У *рэфармацыйнай думцы* на працягу разглядаемага перыяду можна назіраць эвалюцыю падыходу да дадзенай праблемы. У рэфармацыйных творах 1550-х – пачатку 1570-х гг. (да заключэння акта Варшаўскай канфедэрацыі 1573 г.) панаваў інструментальны падыход да талеранцыі: з аднаго боку, абвяшчаюцца "свабода веры", "свабода пропаведзі Слова Божага", асуджаюцца акты рэлігійнай нецярпімасці з боку прадстаўнікоў каталіцкай царквы; з другога боку, пастулірюецца права дзяржаўнай улады на ўстанаўленне афіцыйнай канфесіі і абавязак выкарыстоўваць механізмы прымусу для падаўлення іншаверства (Мікалай Радзівіл "Чорны", В. Дзіскордзіа, А. Волан), што было звязана са спадзяваннямі на перамогу Рэфармацыі ў агульнадзяржаўным маштабе ва ўмовах яе першапачатковых хуткіх поспехаў.

Найбольш яскрава дадзены падыход праявіўся ў тэксце "Сандамірскай канфесіі", выдадзеным польскімі кальвіністамі і прынятым кальвіністамі ВКЛ напярэдадні агульнапратэстанцкага сіноду Польшчы і ВКЛ, які адбыўся ў Сандаміры 9 – 15 красавіка 1570 г., дзе прапаноўваўся ў якасці рэпрэзентацыі афіцыйнай тэалагічнай дактрыны аб'яднанай пратэстанцкай канфесіі ў Рэчы Паспалітай. У гэтым творы выказаны наступныя ідэі:

– права дзяржаўнай улады на ўстанаўленне афіцыйнай канфесіі шляхам правядзення "нацыянальнага сабору" – з'езду прадстаўнікоў шляхты і духавенства для абмеркавання рэлігійных пытанняў;

– абгрунтаванне абавязку дзяржаўнай улады выкарыстоўваць механізмы прымусу для ліквідацыі вучэнняў і культаў, што супярэчаць евангелісцкаму веравызнанню, якое прызнаецца адлюстраваннем абсалютнай ісціны;

– падзел відаў дзяржаўнай улады на "пабожныя" і "непабожныя" ў залежнасці ад выканання абавязкаў у рэлігійнай сферы.

У апошняй чвэрці XVI ст. сітуацыя змяняецца. З аднаго боку, пачынаецца развіццё контррэфармацыйнага руху і адпаведнае аслабленне пазіцый пратэстантызму ў грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай; з другога боку, правы пратэстанцкай шляхты атрымліваюць юрыдычную абарону паводле акта Варшаўскай канфедэрацыі 1573 г. У выніку ў рэфармацыйнай літаратуры адбываецца ўзрастанне акцэнтуацыі значэння рэлігійнай талеранцыі, што было адлюстраваннем барацьбы пратэстанцкай шляхты за прынццe юрыдычных гарантый Варшаўскай канфедэрацыі (Э. Глічнер, П. Гілёўскі, шэраг ананімных твораў). Агульнымі рысамі рэфармацыйнай думкі апошняй чвэрці XVI ст. з'яўляюцца асуджэнне каталіцкай нецярпімасці, барацьба за забеспячэнне гарантый функцыянавання рэлігійнай свабоды ў Рэчы Паспалітай, у першую чаргу акта Варшаўскай канфедэрацыі. Асаблівы націск рабіўся на палітыка-прагматычныя аргументы на карысць талеранцыі:

– рэлігійная нецярпімасць абвяшчаецца крыніцай сацыяльных канфліктаў, у тым ліку грамадзянскіх войнаў, таму талеранцыя выступае як неабходнасць ва ўмовах поліканфесійнага грамадства;

– талеранцыя разглядаецца як спецыфічны шляхецкі прывілей, які з'яўляецца адным з галоўных паказчыкаў асаблівага статусу пануючага саслоўя ў Рэчы Паспалітай; крытыка Варшаўскай канфедэрацыі ацэньвалася як замах на асновы шляхецкай дэмакратыі, пагроза ўстанаўлення абсалютызму.

У каталіцкай літаратуры ў гэты час адбываецца фарміраванне *контррэфармацыйнага падыходу да праблемы талеранцыі* (ананімны аўтар "Размовы Паляка з Літвінам", П. Скарга, С. Градзіцкі). Для яго характэрны крытыка юрыдычнага санкцыянавання рэлігійнай цярпімасці і ідэя арганічнага адзінства свецкай і духоўнай улады пры прыярытэце апошняй. Асноўнай функцыяй дзяржаўнай улады абвяшчаецца захаванне грамадскага спакою; улада павінна абараняць "ісцінную ўсеагульную царкву" і не мае права прымаць самастойныя рашэнні па рэлігійных пытаннях. Абавязак духоўнай улады заключаецца ў пошуку, выяўленні і асуджэнні ерэтычных вучэнняў, а абавязкам свецкай улады з'яўляецца выкарыстанне карных сродкаў супраць іх прадстаўнікоў. У выпадку, калі свецкая ўлада не выконвае сваіх абавязкаў у сферы абароны пануючай рэлігіі, духоўны кіраўнік мае права санкцыянаваць непадпарадкаванне падданых манарху, нават дэтранізаваць апошняга і выконваць пры пэўных умовах функцыі свецкай улады. У той жа час дадзены падыход пастуліраваў згоду на неафіцыйнае прызнанне адноснай рэлігійнай цярпімасці як часовай дадзенасці. Контррэфармацыйны падыход адлюстроўвае межы тэарэтычнага адмаўлення талеранцыі ва ўмовах яе фактычнага, хаця і абмежаванага функцыянавання.

*Такім чынам, філасофская і грамадска-палітычная думка Беларусі XVI ст. развіваецца ва ўмовах новай геакультурнай прасторы, межы якой вызначаюцца ў асноўным дзяржаўнымі межамі Вялікага княства Літоўскага, а потым і Рэчы Паспалітай у выніку Люблінскай уніі 1569 г. Вызначальны ўплыў на яе развіццё аказалі ідэі Рэнесанса і Рэфармацыі. Галоўнымі яе рысамі з'яўляюцца пераважна рэлігійны характар пры разглядзе анталагічных і гнасеалагічных праблем, перавага этычнай і сацыяльна-палітычнай праблематыкі, у межах якой найбольш акцэнтавана адбывалася рэфлексія ідэй асабістай, грамадзянскай і палітычнай свабоды чалавека, пераемнасці маральных каштоўнасцяў, шчасця і суадносін агульнага і індывідуальнага дабра, дзяржаўна-палітычнага ўладкавання, талеранцыі.*

## Кантрольныя пытанні да тэмы 2

1. Назавіце асаблівасці гістарычнага развіцця тэрыторыі сучаснай Беларусі ў XVI ст.

2. Пералічыце факты, якія адлюстроўваюць інтэграцыю духоўнай культуры Вялікага княства Літоўскага ў сістэму заходнееўрапейскай культуры.

3. Дайце параўнальную характарыстыку ідэй Адраджэння і Рэфармацыі.

4. Назавіце асноўных прадстаўнікоў рэнесанснай і рэфармацыйнай філасофскай і грамадска-палітычнай думкі ВКЛ.

5. Назавіце спецыфічныя рысы філасофскай і грамадска-палітычнай думкі ВКЛ XVI ст.

6. Якая асноўная анталагічная праблема разглядалася ў філасофскай думцы ВКЛ XVI ст. і якія прапанаваліся шляхі яе вырашэння?

7. Растлумачце сутнасць паняццяў фідэізму і рэвеляцыянізму.

8. Ахарактарызуйце асноўныя падыходы да вырашэння праблемы суадносін веры і розуму ў філасофскай думцы ВКЛ XVI ст.

9. Дайце агульную характарыстыку ідэі рэлігійнага рацыяналізму на прыкладзе гнасеалагічнага вучэння С. Буднага.

10. Зрабіце параўнальны аналіз рэнесансна-гуманістычнай і рэфармацыйнай этыкі.

11. Якія асноўныя праблемы асвятляліся ў этычнай думцы ВКЛ XVI ст.?

12. Вызначце стаўленне рэнесансна-гуманістычнай думкі ВКЛ да антычнай этыкі.

13. Дайце агульную характарыстыку этычнага вучэння А. Волана.

14. У чым выяўляецца спецыфіка рэлігійна-этычнага вучэння радыкальнай часткі антытрынітарыяў?

15. Які ўплыў сацыякультурная сітуацыя ў ВКЛ XVI ст. мела на развіццё грамадска-палітычнай і прававой думкі?

16. Якія канцэпцыі “найлепшай дзяржавы” вядомы ў грамадска-палітычнай думцы ВКЛ?

17. Дайце агульную характарыстыку тэорыі дзяржаўнага ўладкавання, выкладзенай у “Размове Паляка з Літвінам”.

18. Вызначце асноўныя рысы праекта “направы” дзяржавы ў творчасці Міхалона Літвіна.

19. Якія палітычныя прынцыпы знайшлі адлюстраванне ў Статутах ВКЛ?

20. У чым заключаецца сутнасць канцэпцыі грамадзянскай і палітычнай свабоды А. Волана?

21. Якія асноўныя падыходы да праблемы таleranцыі склаліся ў грамадска-палітычнай думцы ВКЛ XVI ст.?

22. Чым можна растлумачыць актуальнасць праблемы талеранцыі ў сацыяльна-палітычнай думцы ВКЛ XVI ст.?

23. Пакажыце эвалюцыю рэфармацыйнай думкі ВКЛ у адносінах да праблемы талеранцыі на працягу другой паловы XVI ст.

## ТЭМА 3. ПЕРЫЯД КОНТРРЭФАРМАЦЫІ (XVII – ПЕРШАЯ ПАЛОВА XVIII стст.)

### Гістарычныя ўмовы развіцця філасофскай і грамадска-палітычнай думкі

У сферы сацыяльна-эканамічных адносін адбываецца канчатковае афармленне саслоўнай структуры грамадства (замацаванне юрыдычнай адасобленасці асобных станаў); усталяванне фальварачна-паншчыннага тыпу сельскай гаспадаркі; агульнагаспадарчы заняпад у выніку войнаў другой паловы XVII – пачатку XVIII стст., які прывёў да кансервацыі старых форм сацыяльна-эканамічнага ўкладу.

У сферы сацыяльна-палітычных адносін адбываецца замацаванне прынцыпаў шляхецкай дэмакратыі, аслабленне ролі цэнтральнай улады, умацаванне рэгіянальных палітычных цэнтраў (магнацкая алігархія), узмацненне палітычнай барацьбы паміж рознымі магнацкімі групоўкамі. Шляхта як саслоўе канчаткова кансалідуецца, набыўшы значныя грамадзянскія і палітычныя прывілеі, і, дзякуючы ім, адасабляецца ад астатняга грамадства, утвараючы асобную супольнасць “палітычнага народу шляхецкага”, якая аб’яднала шляхту як ВКЛ, так і Польскага каралеўства.

У духоўным жыцці адбываюцца наступныя працэсы:

1) Узмацненне ролі каталіцкай царквы, што адлюстроўваецца ў контррэфармацыйным руху, які знаходзіць шырокую падтрымку з боку дзяржавы. Адбываецца пераход пераважнай часткі шляхты ў каталіцызм. Адпаведна змяншаецца ўплыў пратэстанцкіх канфесій. У 1617 г. спыняецца дзейнасць антытрынітарыяў у ВКЛ (з 1662 г. іх дзейнасць афіцыйна забаронена ў Рэчы Паспалітай). У цеснай сувязі з развіццём контррэфармацыйнага руху адбываецца заключэнне Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г., якая прывяла да расколу праваслаўнай царквы і фактычнага з’яўлення новай уніяцкай канфесіі.

2) Нарастанне нецярпімасці і канфліктнасці ў міжканфесійных адносінах у ВКЛ; частай з’явай становяцца гвалтоўныя дзеянні і пагромы ва ўзаемаадносінах паміж прадстаўнікамі розных канфесій. Падтрымка

контррэфармацыйнага руху з боку дзяржаўнай улады прывяла да абмежавання рэлігійнай талеранцыі ў Рэчы Паспалітай: дэпартацыя антытрынітарыяў за межы Рэчы Паспалітай паводле рашэнняў Сойма 1658 г.; забарона для рыма-католікаў і уніятаў пераходу ў іншыя веравызнанні паводле рашэнняў Сойма 1668 г.; пазбаўленне некаталіцкай шляхты права займаць дзяржаўныя пасады, быць выбранымі ў парламенцкія і судовыя органы ўлады паводле рашэнняў соймаў 1717 і 1733 гг. Аднак захоўвалася юрыдычная правамоцнасць акту Варшаўскай канфедэрацыі 1573 г., якім гарантаваліся грамадзянскія правы некаталіцкай шляхты.

3) Развіццё адукацыі. Узнікае вялікая сетка канфесійных, у першую чаргу каталіцкіх, навучальных устаноў заходнееўрапейскага тыпу; на прафесійным узроўні пачынаецца выкладанне філасофіі.

4) Клерыкалізацыя розных форм духоўнай культуры; аслабленне значэння свецкіх элементаў.

5) У розных формах духоўнай культуры пануючым стылем становіцца *барока*, для якога характэрна імкненне да пышнасці, пампезнасці.

6) Паланізацыя і лацінізацыя духоўнай культуры; паступовае аслабленне ролі старабеларускай мовы.

## Спецыфічныя рысы філасофскай і грамадска-палітычнай думкі XVII – першай паловы XVIII стст.

У XVII – першай палове XVIII стст. захоўваецца арыентацыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі на засваенне ўзораў заходнееўрапейскай філасофіі ў межах геакультурнай прасторы, якая склалася на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Шырокую вядомасць атрымліваюць творы заходнееўрапейскіх філосафаў, найперш каталіцкіх. У межах праваслаўнай і часткова уніяцкай культуры захоўваюцца элементы візантыйскай тэалагічна-філасофскай спадчыны, якая сінтэзуецца з заходнееўрапейскімі ўплывамі. У дадзены перыяд вызначальны ўплыў на развіццё філасофскіх ідэй мае контррэфармацыйны рух, пад уздзеяннем якога на тэрыторыі Беларусі ўпершыню фарміруецца прафесійная філасофія. Акрамя таго, істотнымі ідэйнымі фактарамі развіцця філасофскай і грамадска-палітычнай думкі становяцца рэлігійныя палемікі і фарміраванне ідэалогіі сарматызму.

*Контррэфармацыя* – агульнаеўрапейскі рух другой паловы XVI – першай паловы XVIII стст., накіраваны на аднаўленне пазіцый каталіцкай царквы ў рэлігійным і грамадскім жыцці ў выніку Рэфармацыі. Галоўнай мэтай дадзенага руху з’яўлялася барацьба з пратэстантызмам і іншымі ідэямі, якія супярэчылі артадаксальнаму каталіцкаму вучэнню. Дадзены

рух меў шырокі характар, ён ахапіў ідэалогію, палітыку, розныя галіны духоўнай культуры грамадства. Паступова ў яго межах узмацняецца арыентацыя на місіянерскую дзейнасць сярод некаталіцкіх народаў. Дактрыну і палітыку каталіцкай царквы эпохі Контррэфармацыі вызначыў *Трыдэнцкі сабор* (1545 – 1563 гг.), які пацвердзіў безумоўны аўтарытэт Папы ў справах веры, замацаваў набажэнства выключна на лацінскай мове, устанавіў жорсткую царкоўную цэнзуру. Адхіленне ад рашэнняў сабора разглядалася як ерась і падлягала рэпрэсіям. Для рэалізацыі сваіх мэт папства перыяду Контррэфармацыі актыўна выкарыстоўвала царкоўныя суды, манаскія ордэны, вярхоўную ўладу і пэўныя палітычныя групоўкі ў розных краінах. Вызначальную ролю ў развіцці контррэфармацыйнага руху адыграў *ордэн езуітаў*, створаны ў 1534 – 1540 гг.

Контррэфармацыя з'яўляецца вядучым рэлігійным і грамадска-культурным рухам на тэрыторыі ВКЛ і Рэчы Паспалітай у цэлым з канца XVI да сярэдзіны XVIII стст. Фармальным пачаткам Контррэфармацыі ў ВКЛ лічыцца 1569 г., калі ў Вільні з'явілася першая езуіцкая місія ў складзе 13 чалавек па запрашэнні віленскага біскупа Валяр'яна Пратасевіча для барацьбы з Рэфармацыяй і заснавання калегіума ў Вільні. У канцы XVI – першай палове XVII стст. на тэрыторыі ВКЛ з'явіліся місіі і рэзідэнцыі езуітаў амаль ва ўсіх значных гарадах. Акрамя езуітаў, актывізуецца дзейнасць на тэрыторыі ВКЛ іншых каталіцкіх манаскіх ордэнаў: францысканцаў, дамініканцаў, кармелітаў, бенедыктынцаў, бернардзінаў, піяраў і інш. Распаўсюджанне дзейнасці езуітаў і іншых манаскіх ордэнаў знаходзіла актыўную эканамічную і палітычную падтрымку з боку дзяржаўнай улады.

Адным з галоўных накірункаў дзейнасці езуітаў стала фарміраванне сеткі адукацыйных устаноў. Пры рэзідэнцыях езуітаў ствараліся сярэднія навучальныя ўстановы – *калегіумы*. Да сярэдзіны XVII ст. большая частка навучальных устаноў у ВКЛ належала езуітам. У сувязі з іх дзейнасцю ў 1579 г. у ВКЛ была адчынена першая вышэйшая навучальная установа – *Віленская езуіцкая акадэмія*, якая стала культурным цэнтрам контррэфармацыйнага руху ў краіне. У склад акадэміі першапачаткова ўваходзілі два факультэты: філасофскі і тэалагічны. На першым выкладаліся ўсе гуманітарныя і прыродазнаўчыя навукі таго часу: фізіка, метафізіка, матэматыка, логіка, рыторыка, паэтыка, геаграфія, старажытныя і сучасныя еўрапейскія мовы; на другім – тэалогія, кананічнае права, казуістыка. У 1644 г. пачаў дзейнічаць юрыдычны факультэт.

У езуіцкіх і іншых каталіцкіх навучальных установах адбывалася сістэматычнае выкладанне філасофіі, ствараліся асобныя філасофскія школы. У гэты перыяд тут замацаваўся спецыфічны тып філасофствавання – *неа-*

*схаластыка*, які потым пранікае таксама ва уніяцкія і праваслаўныя навучальныя ўстановы.

Развіццё контррэфармацыйнага руху адбывалася ва ўмовах жорсткага супрацьстаяння з іншымі рэлігійнымі плынямі. У культурным жыцці гэтая з'ява знайшла ўвасабленне ў шырокім распаўсюджанні *рэлігійнай палемічнай літаратуры*, якая ўключала ў сябе творы рознага жанру: трактаты, развагі, памфлеты, апалогіі, адозвы, абароны і інш. Палемічны характар маюць практычна ўсе творы рэлігійнага зместу разглядаемага перыяду. У дадзеных творах знаходзілі сцвярджэнне некаторыя філасофскія і грамадска-палітычныя ідэі. Яшчэ ў другой палове XVI ст. распаўсюдзілася палеміка паміж пратэстантамі і каталікамі, якая ўключала ў сябе як разгляд пытанняў тэалагічнага характару, так і палітычныя праблемы: пытанне правадзейнасці прынцыпаў Варшаўскай канфедэрацыі. Рэзкая актывізацыя рэлігійнай палемікі адбываецца пасля заключэння Берасцейскай уніі 1596 г., у якой галоўнымі апанентамі выступалі, з аднаго боку, рыма-католікі і уніяты, з другога – праваслаўныя.

Ва ўсіх палемічных творах ставіліся па сутнасці адны і тыя ж задачы: абарона ўласнай канфесіі, доказы ісціннасці свайго веравызнання, абгрунтаванне правільнасці дзеянняў сваіх прыхільнікаў, абвяржэнне довадаў праціўнікаў і абгрунтаванне ілжывасці іх поглядаў, дыскрэдытацыя дзеянняў праціўнікаў. Усе бакі ў рэлігійнай палеміцы былі ў большай або меншай ступені тэндэнцыйнымі. Характэрнымі рысамі палемічных твораў з'яўляюцца рэлігійная нецярпімасць, інвектыўнасць, выкарыстанне недобрасумленных сродкаў аргументацыі (апавяданні пра несапраўдныя гісторыі, цуды, спасылкі на сфабрыкаваныя дакументы і адмаўленне ісціннасці сапраўдных і г. д.).

Феноменам духоўнай культуры Рэчы Паспалітай XVII – першай паловы XVIII стст., які адыграў істотную ролю ў развіцці філасофскай і грамадска-палітычнай думкі, з'яўляецца сарматызм. Пад паняццем "*сарматызм*" разумеецца палітычная і сацыяльна-культурная ідэалогія, якая пастуліруе асаблівы статус шляхты як пануючага саслоўя ў грамадскай сістэме краіны, а таксама вызначае спецыфічныя светапогляд і лад жыцця шляхты. У падмурку ідэалогіі сарматызму знаходзіўся сармацкі міф – ідэя пра паходжанне шляхты Рэчы Паспалітай ад старажытных сарматаў – плямёнаў, якія жылі ў I – IV стст. на тэрыторыі сучаснай Украіны. Фарміраванне міфа адбывалася на працягу XV – XVI стст., што адлюстравана ў шматлікіх хроніках (Я. Длугаш, М. Бельскі, М. Кромер, А. Гваньіні, М. Стрыйкоўскі). Дадзены міф падкрэсліваў, з аднаго боку, адасобленасць шляхты ад іншага насельніцтва, з другога – роўнасць і аднароднасць

шляхецкага стану Рэчы Паспалітай. У межах сарматызму сцвярджаліся наступныя прынцыпы:

– адданасць каталіцызму (падкрэсліваліся заслугі шляхты Рэчы Паспалітай у барацьбе з “нявернымі” (туркамі, татарамі), “схізматыкамі” (маскавітамі), “ератыкамі” (шведамі), што нібыта працягвала традыцыю сармацкіх перамог);

– кансерватызм у эканамічных і грамадска-палітычных адносінах; сцвярджэнне нязменнасці дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай і непарушнасці “шляхецкіх вольнасцяў”;

– патрыярхальнасць (сцвярджэнне ідэалу патрыярхальных адносін паміж шляхтай і сялянамі, а таксама ў шляхецкай сям’і).

Ідэалогія сарматызму рэалізавалася ў мастацкай літаратуры ВКЛ (В. Кахоўскі, Я. Морштын, П. Каханоўскі і інш.), дзе праводзілася думка пра ідэальны лад Рэчы Паспалітай і ўзорнае палітычнае жыццё краіны. Дадзеная ідэалогія актуалізуе ідэю месіянізму, згодна з якой Рэч Паспалітая разглядалася як падмурак хрысціянства, апора каталіцызму ва Усходняй Еўропе. Сарматызм меў значны ўплыў на спецыфіку грамадска-палітычнай думкі ВКЛ XVII – першай паловы XVIII стст.

*Такім чынам, можна вылучыць асноўныя спецыфічныя рысы філасофскай думкі ВКЛ эпохі Контррэфармацыі:*

1) фарміраванне прафесійнай філасофіі, галоўным накірункам якой становіцца неасхаластыка;

2) цесная сувязь з канфесійнай (найперш каталіцкай) ідэалогіяй, рэлігійна-палемічная скіраванасць;

3) скіраванасць філасофскай культуры, з аднаго боку, на праблемы логікі і гнасеалогіі, з другога – на маральна-этычныя праблемы;

4) істотны ўплыў на грамадска-палітычную думку ідэй сарматызму.

### ***Найбольш значныя прадстаўнікі палемічнай думкі***

***Рыма-каталіцкі і уніяцкі бок*:**

***Пётр Скарга*** (1536 – 1612 гг.) – актыўны езуіцкі дзеяч Польшчы і ВКЛ. Заснавальнік і першы рэктар Віленскай езуіцкай акадэміі (1579 – 1584 гг.), заснавальнік езуіцкіх калегіумаў у Полацку, Рызе і Дэрпце. Прапаведнік пры двары караля Жыгімонта III Вазы (1588 – 1612 гг.). Аўтар палемічных твораў “Пра адзінства Касцёла Божага пад адзіным пастырам” (1577 г.), “Берасцейскі сабор і абарона яго” (1596 г.), “На трэны і лямант Тэафіла Арталога (…) перасцярога” (1610 г.) і інш.

***Іпацій Пацей*** (1541 – 1613 гг.) – праваслаўны, а з 1596 г. уніяцкі епіскап уладзімірска-берасцейскі (1588 – 1599 гг.), уніяцкі мітрапаліт кіеўскі (1599 – 1613 гг.). Адзін з арганізатараў Брэсцкай царкоўнай уніі і яе

актыўны дзеяч. Аўтар палемічных твораў “Унія” (1595 г.), “Справядлівае апісанне ўчынку і справы сінодавай” (1597 г.), “Антырызіс” (1600 г.) і інш.

***Леў Крэўза*** (? – 1639 г.) – архімандрыт уніяцкага Віленскага манастыра св. Тройцы (з 1617 г.), протаархімандрыт уніяцкага ордэна базыльян (з 1621 г.), архіепіскап смаленскі і чарнігаўскі (з 1623 г.). Аўтар палемічных твораў “Абарона царкоўнага адзінства” (1617 г.), “Абарона манастыра св. Тройцы” (апубл. 1702 г.).

***Язэп Руцкі*** (1573 / 1574 – 1637 гг.) – дзеяч уніяцкай царквы. Архімандрыт (з 1609 г.), епіскап галіцкі (з 1612 г.), мітрапаліт кіеўскі (1613 – 1637 гг.), арганізатар ордэна базыльян. Аўтар палемічных твораў “Двайная віна” (1621 г.), “Экзамен абароны” (1622 г.).

***Іван Дубовіч*** (? – 1646 г.) – дзеяч уніяцкай царквы. Архімандрыт Пінскага Лешчанскага манастыра (з 1634 г.), пазней Дзерманскага манастыра. Аўтар палемічных твораў “Іерархія, або Аб уладзе ў царкве Божай” (1644 г.), “Каляндар сапраўдны царквы Хрыстовай” (1644 г.) і інш.

***Антоній Сялява*** (каля 1583 – 1655 гг.) – дзеяч уніяцкай царквы. Архімандрыт Віленскага Троіцкага манастыра, манастыроў у Наваградку, Жыдзічыне (з 1622 г.), архіепіскап полацкі (з 1624 г.), мітрапаліт кіеўскі і галіцкі (1641 – 1655 гг.), адначасова протаархімандрыт ордэна базыльян (з 1652 г.). Аўтар палемічнага твора “Антыэленхус” (1622 г.).

Шырокую вядомасць мелі таксама палемічныя творы С.Градзіцкага, А. Шчаснага-Жаброўскага, М. Лашча, М. Бембуса, І. Марахоўскага, М. Сматрыцкага (пасля пераходу ва уніяцтва пасля 1628 г.), К. Саковіча, Я. Кулешы, Я. Сушы, Ц. Жахоўскага, П. Боймы, Т. Руткі і інш.

***Праваслаўны бок*:**

***Стэфан Зізаній*** (? – 1600 г.) – выкладчык царкоўнаславянскай і грэчаскай моў у Львоўскай (1586 – 1593 гг., з 1592 г. рэктар) і Віленскай (1593 – 1599 гг.) праваслаўных брацкіх школах, царкоўны прапаведнік. Вёў актыўную барацьбу супраць прыняцця царкоўнай уніі. Аўтар палемічных твораў “Ліст Іераміі, патрыярха канстанцінопальскага” (1596 г.), “Казанне св. Кірылы Іерусалімскага пра Антыхрыста” (1596 г.).

***Мялецій Сматрыцкі*** (1577 – 1633 гг.) – дзеяч праваслаўнай (да 1627 г.), а потым уніяцкай царквы. Актыўны ўдзельнік Віленскага праваслаўнага брацтва, рэктар Кіеўскай брацкай школы (1618 – 1620 гг.), архіепіскап полацкі (з 1620 г.). Аўтар палемічных твораў “Антыграфі” (1608 г.), “Трэнас” (1610 г.), “Апраўданне невінаватасці”(1621 г.), “Эленхус” (1622 г.) і інш. Пасля пераходу ва уніяцтва аўтар палемічных твораў, накіраваных супраць праваслаўнай царквы, – “Апалогія” (1628 г.), “Парэнезіс” (1629 г.), “Экзатэзіс” (1629 г.) і інш.

***Андрэй Мужылоўскі*** (1580-я – 1640-я гг.) – праваслаўны святар, з канца 1620-х гг. слуцкі пратапоп. Іераманах Кіева-Пячэрскай Лаўры (з 1631 г.). Аўтар палемічных твораў "Адказ на ліст віленскіх уніятаў" (1616 г.), "Антыдотум" (1629 г.).

***Пётр Магіла*** (1597 – 1647 гг.) – архімандрыт Кіева-Пячэрскай Лаўры (1627 – 1632 гг.), мітрапаліт кіеўскі і галіцкі (1632 – 1647 гг.). Заснавальнік Кіева-Магілянскай акадэміі (1633 г.). Аўтар палемічных твораў "Літас" (1644 г.), "Крыж Хрыста Збавіцеля" (1638 г.).

***Афанасій Філіповіч*** (каля 1595 – 1648 гг.) – праваслаўны царкоўны дзеяч, манах, ігумен Сімяонаўскага манастыра ў Берасці (1640 – 1641 гг.). Аўтар палемічнага твора "Дыярыюш" (1646 г.).

***Лазар Барановіч*** (каля 1620 – 1693 гг.) – праваслаўны царкоўны дзеяч, выкладчык Кіева-Магілянскай акадэміі (у 1640-я – пачатку 1650-х гг.). Ігумен Кіеўскага брацкага, Кірылава, Купяціцкага, Дзяцелавіцкага манастыроў (1650 – 1657 гг.), епіскап чарнігаўскі і ноўгарад-северскі (1657 – 1693 гг., з 1666 г. архіепіскап), месцаахоўнік кафедры мітрапаліта кіеўскага (1659 – 1661 гг.). Аўтар палемічных твораў "Меч духоўны" (1666 г.), "Новая мера старой веры" (1676 г.) і інш.

Шырокую вядомасць мелі таксама палемічныя творы Г. Сматрыцкага, В. Суражскага, Клірыка Астрожскага, Х. Філалета, Ю. Рагатынца, Л. Карповіча, З. Капысценскага, С. Косава, І. Капінскага, Л. Барановіча, І. Гізеля, І. Галятоўскага і інш.

## Асаблівасці неасхаластычнай філасофіі ў ВКЛ

У выніку развіцця сеткі адукацыйных устаноў у ВКЛ філасофія становіцца сістэмна вывучаемым прадметам. У дадзеным кантэксце асаблівую ролю мела Віленская езуіцкая акадэмія, у межах якой быў створаны спецыяльны філасофскі факультэт. Прафесійная філасофія была рэалізавана ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай у цэлым у форме неасхаластыкі.

*Неасхаластыка* (другая схаластыка) – філасофская сістэма, якая фарміруецца ў еўрапейскай духоўнай культуры другой паловы XVI – першай паловы XVIII стст. на аснове пераасэнсавання сярэднявечнай схаластыкі ў якасці інтэлектуальнай рэакцыі на выклікі Рэнесансу і Рэфармацыі. Галоўнай крыніцай станаўлення неасхаластыкі становіцца схаластычны арыстацелізм, які дасягнуў росквіту ў заходнееўрапейскай філасофіі ў XII – XIV стст., аднак знаходзіўся ў крызісе ў XV – першай палове XVI стст. у выніку крытыкі з боку гуманістычнага і рэфармацыйнага дыскурсаў. "Адраджэнне" схаластыкі адбываецца па ініцыятыве папства (рымскі папа Пій V зацвярджае схаластычны арыстацелізм як "аснову" хрысціянскай філасофіі). Галоўнымі цэн-

трамі фарміравання і развіцця неасхаластыкі становяцца Іспанія, Партугалія і Рэч Паспалітая. Важную ролю ў станаўленні неасхаластычнай філасофіі адыграла выданне твора іспанскага філосафа-езуіта Францыска Суарэса "Метафізічныя развагі" (1597 г.), які меў сінтэтычную функцыю. Нягледзячы на тое, што неасхаластыка абапіралася на традыцыі класічнай схаластыкі, яна мела ўласную спецыфіку, якая заключалася ў наступным:

– у адрозненне ад класічнай схаластыкі, якая ў свой час з'яўлялася адзіным тыпам філасофскай культуры, неасхаластыка выступала як рэакцыя на ідэі гуманізму і Рэфармацыі, а таму вымушана была пэўным чынам з імі суадносіцца: з аднаго боку, гэта абумовіла яе палемічны характар, з другога – прадвызначыла ўключэнне некаторых рэнесансна-гуманістычных ідэй у сваю сістэму;

– галоўнай формай філасофскага твору становіцца сістэматычны філасофскі трактат, які адначасова выступае як падручнік і дапаможнік для студэнтаў і выкладчыкаў (у класічнай схаластыцы пераважаюць творы каментатарскага характару, арганізаваныя ў форме пытанняў і адказаў).

Неасхаластычная філасофія рэалізуецца ў трох асноўных варыянтах:

– *дамініканскі* (сцвярджаецца схаластычны арыстацелізм выключна на аснове вучэння Фамы Аквінскага);

– *францысканскі* (сцвярджаецца схаластычны арыстацелізм на аснове вучэння Дунса Скота);

– *езуіцкі* (сцвярджаецца схаластычны арыстацелізм пераважна на аснове вучэння Фамы Аквінскага, але пры гэтым шырока выкарыстоўваюцца і іншыя элементы схаластычнай традыцыі).

Панаванне езуітаў у адукацыйнай сістэме ВКЛ абумовіла перавагу езуіцкага варыянта неасхаластычнай філасофіі.

Прафесійная філасофія была рэалізавана ў ВКЛ у двух варыянтах:

– выкладанне філасофіі ў сярэдніх навучальных установах – езуіцкіх, дамініканскіх, піярскіх, уніяцкіх базыльянскіх калегіумах, а таксама ў праваслаўнай Кіева-Магілянскай акадэміі (заснавана ў 1633 г.);

– выкладанне філасофіі на спецыяльным факультэце ў Віленскай езуіцкай акадэміі.

Выкладанне ў межах Віленскай акадэміі было арганізавана паводле ўзораў еўрапейскай каталіцкай вышэйшай адукацыі. Першымі выкладчыкамі універсітэта былі пераважна замежныя езуіты, запрошаныя для таго, каб арганізаваць навучанне. Потым, калі былі падрыхтаваны айчынныя кадры, практыкаваліся іх паездкі за мяжу, пераважна ў Рым, для азнаямлення з сучасным станам універсітэцкай філасофіі і для працягу адукацыі. Выкладанне ажыццяўлялася выключна на лацінскай мове. Імкненне да уніфіка-

цыі сістэмы адукацыі ва ўсіх езуіцкіх навучальных установах прывяло да стварэння спецыяльнага зводу прадпісаннняў і рэкамендацый для выкладчыкаў усіх дысцыплін, якія вывучаліся ў курсе сярэдняй і вышэйшай адукацыі – “Ratio studiorum” (1603 г.).

На выкладанне філасофіі адводзілася тры гады. У Віленскай акадэміі, як і ва ўсіх еўрапейскіх каталіцкіх універсітэтах, была прынята сістэматызаваная структура філасофіі. Філасофія падзялялася на тэарэтычную і практычную. *Тэарэтычная філасофія* мела наступную структуру:

| логіка | фізіка (натуральная філасофія) | метафізіка |
|---|---|---|
| прадмет вывучэння – законы і формы чалавечага мыслення | прадмет вывучэння – матэрыяльныя аб’екты | прадмет вывучэння – Бог і духоўныя аб’екты |

*Практычная філасофія* ўключала наступныя дысцыпліны, накіраваныя на вывучэнне розных форм быцця чалавека і грамадства:

| этыка | эканоміка | палітыка |
|---|---|---|
| прадмет вывучэння – мараль і маральныя адносіны паміж людзьмі | прадмет вывучэння – вядзенне гаспадаркі і адносіны паміж людзьмі ў сферы гаспадарчай дзейнасці | прадмет вывучэння – адносіны паміж людзьмі ў грамадстве |

Вывучэнне дадзеных дысцыплін у межах трохгадовага курсу праходзіла наступным чынам: першы год вывучалася логіка, другі год – фізіка, у дадатак да яе выкладаліся матэматыка і астраномія, трэці год – метафізіка і практычная філасофія. Існавалі спецыяльныя прадпісанні адносна выкладання кожнай з дысцыплін. Вывучэнне курсу павінна было быць заснавана на адпаведных працах Арыстоцеля. Аднак на практыцы пераважала вывучэнне твораў не самога Арыстоцеля, а яго схаластычных і неасхаластычных інтэрпрэтатараў. Пры гэтым дапускаўся некаторы тэарэтычны плюралізм у межах розных кірункаў схаластычнага арыстацелізму. У цэлым рэкамендацыі “Ratio studiorum” вызначалі толькі агульную скіраванасць філасофскага курса, а не ўвесь яго змест. Неасхаластычная філасофія дапускала магчымасць акцэнтавання ўвагі філосафа на той дысцыпліне, якая здавалася яму найлепшым увасабленнем сутнасці філасофіі. Таму, нягледзячы на фармальную перавагу ў структуры неасхаластыкі тэарэтычнай філасофіі, з цягам часу пад уплывам ідэй гуманізму ў Віленскай акадэміі ўзрос інтарэс да практычнай філасофіі. Асноўнымі формамі заняткаў па філасофіі з’яўляліся лекцыі і дыспуты.

Філасофская адукацыя ў Віленскай акадэміі мела двухузроўневы характар:

1) бакалаўрэат (дадзеная форма адукацыі існавала таксама ў калегіумах); пасля праходжання трохгадовага курса навучання філасофскім дысцыплінам выпускнікам надавалася ступень бакалаўра філасофіі і вольных мастацтваў па выніках здачы экзаменаў (найбольш здольныя выпускнікі атрымлівалі ступень яшчэ падчас вучобы за напісанне і абарону пісьмовай працы – тэзісаў);

2) магістратура; ступень магістра вольных мастацтваў і філасофіі надавалася пасля адпаведнага экзамена – магістрата, або абароны магістэрскай працы.

У развіцці неасхаластычнай філасофіі ВКЛ умоўна можна выдзеліць *два перыяды*:

| *канец XVI – першая палова XVII стст.* | *другая палова XVII – першая палова XVIII стст.* |
|---|---|
| перыяд засваення неасхаластыкі на землях ВКЛ | перыяд станаўлення сістэмнай віленскай школы неасхаластыкі, якая набывае агульнаеўрапейскае значэнне |

Асобнае месца ў неасхаластычнай філасофіі займае праваслаўная школа, якая склалася ў межах Кіева-Магілянскай акадэміі.

### Неасхаластычная філасофія ў канцы XVI – першай палове XVII стст.

Дадзены перыяд, як ужо адзначалася, характарызуецца засваеннем неасхаластычнага спосабу філасофствавання. У каталіцкіх навучальных установах узнікаюць філасофскія сістэмныя трактаты, якія адначасова выкарыстоўваюцца як падручнікі. Большасць філасофскіх твораў прысвячаецца аналізу асобных праблем. Першая друкаваная прафесійная філасофская праца з’яўляецца ў 1574 г.; яе аўтар – выкладчык Віленскага езуіцкага калегіума Ян Хэй. У неасхаластычнай філасофіі ВКЛ дадзенага перыяду склаліся тры асноўныя накірункі, звязаныя з перавагай у філасофскіх творах праблематыкі розных галін філасофскіх ведаў: логікі, натуральнай філасофіі, практычнай філасофіі.

Характэрна, што метафізічныя праблемы ў неасхаластычнай філасофіі ВКЛ даследаваліся слаба.

*Накірунак, звязаны з даследаваннем праблематыкі ў сферы логікі,* абапіраецца на інтэрпрэтацыю прац па логіцы Арыстоцеля і яго каментатараў. Разам з тым, логіка ў неасхаластычных творах уключае ў сябе эле-

менты тэорыі пазнання, а таксама рыторыкі і нават часткова метафізікі. Асноўны прадстаўнік дадзенага накірунка – Марцін Сміглецкі.

***Марцін Сміглецкі*** (1563 – 1618 гг.) – прафесар філасофіі (1586 – 1590 гг.) і схаластычнай тэалогіі (1590 – 1599 гг.) у Віленскай езуіцкай акадэміі. Доктар тэалогіі (1594 г.). Рэктар езуіцкіх калегіумаў у Польшчы: у Пултуску (1600 – 1602 гг.), Пазнані (1602 – 1607 гг.) і Калішы (1609 – 1611 гг.). На падставе лекцый, прачытаных у Віленскай езуіцкай акадэміі, склаў двухтомны трактат "Логіка" (першае выданне 1618 г.). "Логіка" М. Сміглецкага лічылася лепшым і найбольш папулярным падручнікам у Заходняй Еўропе ў сферы неасхаластыкі.

Важнае месца ў неасхаластычнай філасофіі ў ВКЛ меў *накірунак, звязаны з даследаваннем праблематыкі ў сферы натуральнай філасофіі.* Вывучэнне натуральнай філасофіі ў Віленскай акадэміі абапіралася на адпаведныя працы Арыстоцеля, аднак уключала яшчэ некаторыя дасягненні еўрапейскага прыродазнаўства XVI – XVII стст. Выкарыстоўваліся элементы вопытна-эксперыментальнага вывучэння прыроды. У 1632 г. у Віленскай акадэміі з'явіўся ўласны тэлескоп. Вялікая роля ў арганізацыі астранамічных назіранняў належала прафесару *Освальду Кругеру* (у сваіх лекцыях з 1645 г. ён першым у межах віленскай неасхаластычнай школы сцвярджае геліяцэнтрычную мадэль Сусвету).

Найбольш вядомым прадстаўніком пазначанага накірунку ў неасхаластычнай філасофіі з'яўляецца ***Альберт Каяловіч*** (1609 – 1677 гг.). А. Каяловіч працаваў прафесарам у шматлікіх езуіцкіх навучальных установах Рэчы Паспалітай. Прафесар схаластычнай філасофіі ў Віленскай езуіцкай акадэміі (1645 – 1658 гг., у 1654 – 1655 гг. – яе рэктар). Доктар тэалогіі (1645 г.). Асноўны твор А. Каяловіча, прысвечаны праблематыцы натуральнай філасофіі, – "Погляд, удасканалены розумам…" (1648 г.). Гэтая праца ўзнікла ў адказ на публікацыі італьянскага эмігранта Валерыяна Магні, у якіх на аснове эмпірычнага матэрыялу пастуліравалася ідэя пра наяўнасць пустаты ў прыродзе, што выклікала шырокую навуковую дыскусію. У сваёй працы А. Каяловіч абараняў асновы арыстоцелеўскай фізікі, згодна з якой сцвярджаецца непарыўнае адзінства матэрыі і прасторы і адмаўляецца магчымасць пустаты ў прыродзе.

У той жа час у віленскай неасхаластычнай філасофіі значнае месца займае *накірунак, звязаны з даследаваннем праблематыкі ў сферы практычнай філасофіі.* На фарміраванне дадзенага накірунка істотны ўплыў аказала рэнесансна-гуманістычная традыцыя, з чым звязаны акцэнтаваны інтарэс да гуманітарных дысцыплін: рыторыкі, паэтыкі, этыкі. Галоўнымі

прадстаўнікамі пазначанага накірунку з'яўляюцца Мацей Сарбеўскі, Жыгімонт Лаўксмін, Лука Залускі, Тэадор Білевіч.

***Мацей Казімір Сарбеўскі*** (1595 – 1640 гг.) – выкладчык у Полацкім езуіцкім калегіуме (1618 – 1620, 1626 – 1627 гг.), Віленскай езуіцкай акадэміі (прафесар красамоўства, філалогіі і тэалогіі, 1627 – 1633 гг.). Доктар філасофіі (1632 г.) і тэалогіі (1636 г.). Каралеўскі прыдворны прапаведнік (1635 – 1640 гг.). У Віленскай акадэміі М. К. Сарбеўскі стварае гурток аматараў літаратуры, у які ўваходзілі С. Лаўксмін, Л. Залускі, Н. Кміціц, І. Рывоцкі. Ён з'яўляецца аўтарам зборнікаў лацінамоўных вершаў, а таксама твораў па тэорыі літаратуры "Аб трагедыі і камедыі, або Сенека і Тэрэнцый", "Аб дасканалай паэзіі, або Вергілій і Гамер" і інш. Найбольш вядомы яго твор – "Багі язычнікаў" (каля 1626 – 1627 гг., надрукаваны не быў), у якім М. К. Сарбеўскі сістэматызаваў энцыклапедычныя звесткі ў галіне антычнай культуры, асабліва міфалогіі. Ён выкарыстаў выпрацаваныя ў гуманістычнай традыцыі сімвалічны і гістарычны метады інтэрпрэтацыі міфаў. М. К. Сарбеўскі акцэнтуе ўвагу на пазітыўных элементах антычнай спадчыны і фактычна ўзнаўляе рэнесансную ідэю сінтэзу антычнай і хрысціянскай культуры на аснове падабенства іх зыходных прынцыпаў.

***Жыгімонт Лаўксмін*** (1597 – 1670 гг.) – выкладчык рыторыкі, філасофіі і тэалогіі ў езуіцкіх калегіумах у Полацку, Нясвіжы, Крожах, Браневе і Пінску, Віленскай езуіцкай акадэміі. У 1644 – 1647 і 1650 – 1655 гг. быў рэктарам Полацкага калегіума, у 1655 – 1658 гг. – віцэ-рэктарам Віленскай акадэміі. Ж. Лаўксмін з'яўляецца аўтарам першых арыгінальных курсаў, якія потым выкарыстоўваліся як падручнікі ў галіне рыторыкі, старажытнагрэчаскай мовы і музыкі. Галоўны яго твор "Практычнае красамоўства, або Правілы рытарычнага мастацтва" (1648 г.) прысвечаны аналізу тэарэтычных і практычных праблем рыторыкі і літаратуры. Да названага твора быў далучаны дадатак "Сутнасць дыялектыкі", дзе раскрываецца сувязь паміж логікай і рыторыкай. Рыторыка, на думку Ж. Лаўксміна, выступае свайго роду пасрэднікам паміж ведамі і быццём. Для паспяховай рэалізацыі дадзенай функцыі рыторыка павінна валодаць змястоўнай паўнатой, якую яна набывае ў філасофіі. Філасофія разглядаецца Ж. Лаўксмінам не толькі як сума ведаў, але і як практычная мудрасць. Пры гэтым сцвярджаецца ідэал этычнага рацыяналізму – залежнасць шчасця чалавека ад інтэлектуальных ведаў, у чым яскрава відаць уплыў рэнесансна-гуманістычнай традыцыі.

***Лука Залускі*** (1604 – 1673 гг.) – выкладчык рыторыкі, філасофіі і тэалогіі ў Віленскай езуіцкай акадэміі (1636 – 1640, 1651 – 1654 гг.), а таксама ў шматлікіх езуіцкіх калегіумах Польшчы і ВКЛ. Доктар тэалогіі (1651 г.). Аўтар энцыклапедычнай працы "Агульная філасофія..." (Вільня,

1640 г.), які складаецца з дзвюх частак: “Практычная філасофія” і “Тэарэтычная філасофія”. Асаблівасцю працы Л. Залускага з’яўляецца тое, што ён змясціў “практычную філасофію” на першае месца ў сістэме філасофскіх ведаў, спрабуючы абгрунтаваць гэта тым, што “старажытныя філосафы, калі заглыбіліся ў адно толькі даследаванне і пазнанне рэчаў прыроды, далі нам толькі абалонку праўдзівай філасофіі, а не яе сутнасць”. Л. Залускі сцвярджае гуманістычны ідэал філасофіі як практычнай мудрасці, “настаўніцы ў норавах”. Галоўнай мэтай філасофіі абвяшчаецца ўдасканаленне маральных адносін у грамадстве і навучанне дабрадзейнасцям.

***Тэадор Білевіч*** (? – пасля 1697 г.) – дзяржаўны дзеяч ВКЛ (стольнік, потым суддзя земскі жамойцкі), выпускнік Віленскай езуіцкай акадэміі. Падчас завяршэння вучобы ў акадэміі выдаў магістэрскую працу “Трайная філасофія, рацыянальная, натуральная і маральная” (1675 г.). Увага ў ёй акцэнтуецца на этычным аспекце філасофіі ў кантэксце яе карысці для ўладкавання грамадскага жыцця і маральнага ўдасканалення чалавека. Такое разуменне сутнасці філасофіі абумовіла і структуру працы Т. Білевіча, дзе перавага аддавалася практычнай філасофіі.

## Неасхаластычная філасофія ў другой палове XVII – першай палове XVIII стст.

У дадзены перыяд канчаткова фарміруецца віленская школа неасхаластыкі, якая набывае агульнаеўрапейскае значэнне.

Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці неасхаластычнай філасофіі гэтага перыяду:

– сістэматычнасць, якая праяўлялася ў стварэнні вялікай колькасці абагульняючых прац энцыклапедычнага характару;

– папулярызацыя філасофскіх ведаў, іх адаптацыя да спецыфікі шляхецкай культуры.

Першая тэндэнцыя найбольш яскрава праявілася ў творчасці наступных дзеячаў.

***Томаш Младзяноўскі*** (1622 – 1686 гг.) – прафесар філасофіі Віленскай акадэміі (1662 – 1665 гг.), а таксама іншых езуіцкіх навучальных устаноў Рэчы Паспалітай. Аўтар пяцітомнай сінтэтычнай працы “Аб’яднаны курс тэалогіі і філасофіі” (1681 г.).

***Адам Краснадэмбскі*** (1645 – 1702 гг.) – прафесар філасофіі ў шматлікіх езуіцкіх навучальных установах Рэчы Паспалітай. Аўтар трактата “Тлумачэнне філасофіі Арыстоцеля” (1678 г.).

***Сымон Станіслаў Макоўскі*** (1610 / 1613 – 1683 гг.) – прафесар філасофіі ў шматлікіх езуіцкіх навучальных установах Рэчы Паспалітай. Аўтар працы “Курс філасофіі паводле дактрыны Арыстоцеля” (1679 – 1681 гг.).

***Фердынанд Янушоўскі*** (1639 – 1712 гг.) – аўтар працы “Сума філасофіі” (1692 г.).

Спецыфікай творчасці названых філосафаў з’яўляецца сістэматычны выклад філасофскай праблематыкі ў рэчышчы неасхаластычнай філасофіі, апалагетыка схаластыкі і палеміка з г. зв. “новымі” філосафамі.

Другая тэндэнцыя знайшла найбольш поўнае ўвасабленне ў творчасці Войцэха Тылкоўскага і Яна Пашакоўскага.

***Войцэх Тылкоўскі*** (1624 – 1695 гг.) – выкладчык філасофіі, маральнай тэалогіі і матэматыкі ў шматлікіх езуіцкіх калегіумах Польшчы. Прафесар філасофіі Віленскай акадэміі (1677 – 1681 гг.). Асноўныя творы: “Займальная філасофія” ў 9 тамах (1669 – 1690 гг.), “Займальная практычная геаметрыя” (1692 г.), “Займальная арыфметыка” (1692 г.), “Займальная фізіка” (1680 г.), “Вучоныя размовы, у якіх змяшчаецца амаль уся філасофія” (1692 г.), “Стол дабрачыннай і палітычнай мудрасці, якая дапамагае пры застольных размовах” (1727 г.). Працы В. Тылкоўскага носяць у значнай ступені папулярны характар; яны адрасаваны не столькі прафесійнай супольнасці, колькі шырокаму колу шляхецкай аудыторыі. Іх мэтай з’яўлялася адаптацыя філасофскай і тэалагічнай праблематыкі да сармацкай шляхецкай культуры.

***Ян Пашакоўскі*** (1684 – 1757 гг.) – выкладчык філасофіі, паэтыкі і рыторыкі ў езуіцкіх калегіумах у Коўне, Крожах, Нясвіжы, Віленскай акадэміі (1718 – 1721 гг.); рэктар Слуцкага (1735 – 1739 гг.) і Нясвіжскага (1739 – 1742 гг.) езуіцкіх калегіумаў. Аўтар шматлікіх палемічных, тэалагічных і гістарычных прац. Асаблівую папулярнасць мелі яго календары (за 1737 – 1749 гг. ён выдаў у Вільні 20 календароў, якія паклалі пачатак віленскаму перыядычнаму друку). У іх змяшчаліся філасофскія, навуковыя, геаграфічныя, гісторыка-храналагічныя матэрыялы, разлічаныя на шырокае кола чытачоў з ліку шляхты.

У другой палове XVII – першай палове XVIII стст. у кантэксце неасхаластычнай філасофіі працягваліся тэматычныя даследаванні асобных філасофскіх праблем. У межах тэарэтычнай філасофіі найбольшую ролю мелі даследаванні па логіцы (*Адам Кміціц*, *Мацей Карскі*, *Казімір Вежбіцкі*). У сферы практычнай філасофіі найбольшую значнасць мелі працы *Яна Дрэўса*.

## Праваслаўная неасхаластыка

Асаблівасцю неасхаластычнай філасофіі ў ВКЛ, а таксама ва Украіне з’яўляецца тое, што яна развівалася не толькі ў каталіцкіх, але таксама і ў праваслаўных інтэлектуальных цэнтрах. Першыя элементы засваення неасхаластычнага спосабу філасофствавання можна знайсці ў выкладчыцкай

дзейнасці ў праваслаўных *брацкіх школах*. Першая брацкая школа ўзнікае ў ВКЛ у Вільні (каля 1584 г.), потым яны з'яўляюцца ў Магілёве (1590 г.), Берасці (1591 г.), і іншых гарадах. Кожная брацкая школа мела свой статут, які вызначаў змест і арганізацыю навучання. Элементы філасофскіх ведаў выкладаліся ў брацкіх школах у ліку "сямі вольных мастацтваў".

Ідэйнай асновай навучальнага працэсу ў брацкіх школах з'яўлялася праваслаўнае веравучэнне. Адначасова ў інтэлектуальных асяродках вакол брацкіх школ адбываецца працэс актыўнага засваення антычнай спадчыны. Разам з тым, як і ў каталіцкай неасхаластыцы, пераважала не непасрэднае засваенне твораў Арыстоцеля і іншых антычных філосафаў, а апасродкаванае праз прызму каментатарскай літаратуры, пераважна візантыйскай. Галоўным аўтарытэтам у сферы філасофіі лічыўся Іаан Дамаскін; яго праца "Крыніца ведаў" выкарыстоўвалася як падручнік. Пры вывучэнні "вольных мастацтваў" часткова выкарыстоўваліся падручнікі, выдадзеныя ў Заходняй Еўропе.

У праваслаўным інтэлектуальным асяроддзі Рэчы Паспалітай у канцы XVI – пачатку XVII стст. выкрышталізаваліся *дзве плыні паводле адносін да антычнай культурнай спадчыны*.

Прадстаўнікі адной з гэтых плыняў (*Лаўрэнцій Зізаній, Захарыя Капысценскі, Мялецій Сматрыцкі, Касіян Саковіч*) выступалі за актыўнае засваенне антычных філасофскіх ідэй. У межах дадзенай плыні з'яўляецца ідэя духоўнай пераемнасці паміж Старажытнай Грэцыяй праз пасрэдніцтва Візантыі і праваслаўнай "Руссю". У палеміцы з католікамі абгрунтоўваецца ідэя паходжання ўсёй філасофскай мудрасці з Грэцыі, а лацінская мудрасць разглядаецца пры гэтым толькі як засваенне і перайманне грэчаскай. Пры гэтым сцвярджалася неабходнасць больш глыбокага засваення антычнай спадчыны як інтэлектуальнай зброі ва ўмовах супрацьстаяння контррэфармацыйнаму руху.

Прадстаўнікі другой плыні адмаўлялі неабходнасць засваення як антычнай, так і заходнееўрапейскай культуры, якія, на іх думку, супярэчылі праваслаўнай царкоўнай традыцыі (*Іван Вішэнскі, Іов Княгініцкі, Ісайя Капінскі, Афанасій Філіповіч*).

Канчатковае фарміраванне неасхаластычнай філасофіі ў Рэчы Паспалітай звязана са стварэннем Кіева-Магілянскай акадэміі. Яна была заснавана ў 1633 г. па ініцыятыве праваслаўнага мітрапаліта кіеўскага Пятра Магілы ў выніку аб'яднання школы Кіеўскага брацтва і школы Кіева-Пячэрскай Лаўры. Спачатку арганізацыя адукацыі ў навучальнай установе была пабудавана на ўзор каталіцкіх калегіумаў, што ўключала і прафесійнае выкладанне філасофіі. У 1689 г. з адкрыццём класа тэалогіі ўстанова набыла статус

акадэміі. Кіева-Магілянская акадэмія аказала значны ўплыў на станаўленне і развіццё праваслаўнай неасхаластыкі не толькі ва Украіне, але і ў ВКЛ, паколькі там праваслаўных навучальных устаноў такога тыпу не было. Многія выкладчыкі і выпускнікі Кіева-Магілянскай акадэміі паходзілі з ВКЛ.

### *Асноўныя прадстаўнікі праваслаўнай неасхаластыкі ў межах філасофскай думкі Беларусі*

***Сільвестр Косаў*** (? – 1657 г.) – дзеяч праваслаўнай царквы. Выкладаў рыторыку ў брацкіх школах у Вільні і Львове, філасофію ў школе Кіева-Пячэрскай Лаўры. Адзін з галоўных ініцыятараў стварэння Кіева-Магілянскай акадэміі. Архімандрыт Кіева-Пячэрскай Лаўры (з 1633 г.), епіскап магілёўскі, аршанскі і мсціслаўскі (1634 – 1647 гг.), мітрапаліт кіеўскі (1647 – 1657 гг.). Аўтар твораў "Экзэгесіс" (1635 г.), "Патэрыкон, або зборнік жыццяў святых пячэрскіх айцоў" (1635 г.), "Дыдаскалія, або Навука для святароў" (1637 г.) і інш. У сваіх працах С. Косаў адстойваў неабходнасць засваення элементаў заходнееўрапейскага неасхаластычнага спосабу філасофствавання.

***Сімяон Полацкі*** (1629 – 1656 гг.) – выпускнік Кіева-Магілянскай акадэміі (1650 г.). На пачатку 1550-х гг. належаў да уніяцтва (манах ордэна базыльян). Настаўнік брацкай школы Полацкага Богаяўленскага манастыра (з сярэдзіны 1550-х гг. да 1564 г.). У 1664 г. падчас вайны Рэчы Паспалітай з Расіяй 1654 – 1667 гг. эміграваў у Маскву. Аўтар шматлікіх тэалагічных і палітычных твораў. Філасофскія ідэі змешчаны пераважна ў зборніках пропаведзяў "Абед душэўны" (1675 г., выд. 1681 г.), "Вячэра душэўная" (1676 г., выд. 1683 г.). Сімяон Полацкі падзяляе філасофію на "разуміцельную" (логіка), "натуральную" (фізіка) і "маральную" (этыка). Падкрэсліваецца найперш практычны бок філасофіі: яе задача ў тым, каб асэнсаваць мінулае, вызначыць і вырашыць, як уладкаваць сучасны стан і будучыню.

***Георгій Каніскі*** (1717 – 1795 гг.) – выпускнік Кіева-Магілянскай акадэміі (1743 г.). Выкладчык, прафесар, рэктар Кіева-Магілянскай акадэміі (1745 – 1755 гг.), епіскап магілёўскі (з 1755 г.). Асноўнай філасофскай працай Г. Каніскага з'яўляецца твор "Агульная філасофія, якая падзяляецца на чатыры раздзелы і ўключае логіку, фізіку, літаратуру і этыку", створаны на аснове курса лекцый, распрацаванага падчас выкладання ў Кіева-Магілянскай акадэміі. Праца мае сістэматычны характар, пабудавана на аснове схаластычнага арыстацелізму. Разам з тым у ёй прадстаўлены багаты гісторыка-філасофскі матэрыял, які ўключае ідэі "новай філасофіі" (вучэнні Дэкарта, Спінозы і інш.). Супраць апошніх праводзіцца палеміка з пазіцый схаластычнага арыстацелізму.

## Грамадска-палітычная думка

Сацыяльна-палітычныя працэсы, якія адбываліся ў ВКЛ у XVII – першай палове XVIII стст., аказалі істотны ўплыў на асаблівасці развіцця грамадска-палітычнай думкі. Вялікае значэнне ў дадзенай сувязі мелі ўсталяванне шляхецкай дэмакратыі як формы грамадска-палітычнага ладу і ўзмацненне рэлігійна-палітычнай барацьбы пад уплывам контррэфармацыйнага руху і заключэння царкоўнай уніі.

У грамадскай думцы XVII – першай паловы XVIII стст. дзяржаўна-палітычны лад Рэчы Паспалітай характарызаваўся як *змешаная манархія* (monarchia mixta). Дадзенае паняцце грунтавалася на выкарыстанні палітычнай тэорыі Арыстоцеля, згодна з якой вылучаліся тры правільныя формы дзяржавы: манархія, арыстакратыя і палітыя. Сцвярджалася, што ў Рэчы Паспалітай гарманічна суіснуюць элементы ўсіх трох названых форм, што адлюстроўваецца ў сумесным кіраванні дзяржавай караля (манархічны элемент), сената (арыстакратычны элемент), шляхты (дэмакратычны элемент). У польскай грамадска-палітычнай думцы спецыфіка дзяржаўна-палітычнага ладу Рэчы Паспалітай як змешанай манархіі ўпершыню была вызначана ў працах Станіслава Ажахоўскага (сярэдзіна XVI ст.). У XVII – першай палове XVIII стст. яна становіцца прадметам тэарэтычнай рэфлексіі ў творах Шымана Старавольскага, Себасцьяна Петрыцыя, Лукаша Апалінськага, Анджэя Максіміліяна Фрэдра, Станіслава Гераклія Любамірскага і інш.

На пачатку XVII ст. ва ўмовах грамадска-палітычнай барацьбы таго часу ў інтэлектуальным дыскурсе ВКЛ, як і ў цэлым Рэчы Паспалітай, вызначыліся два асноўныя накірункі паводле *праблемы дзяржаўна-палітычнага ўладкавання*: тэакратычны і шляхецка-рэспубліканскі.

Прадстаўнікі *тэакратычнага накірунку* (*Пётр Скарга*, *Мацей Бембус*) абапіраліся на палітычныя тэорыі, выпрацаваныя ў межах заходнееўрапейскага контррэфармацыйнага руху (Роберт Белармін, Юстус Ліпсіус). Іх палітычным ідэалам з’яўляецца моцная манархічная ўлада. Аднак пры гэтым дзяржаўная ўлада павінна ўзгадняць свае дзеянні з царквой і кіраваць з яе дапамогай (*тэакратыя*). Каталіцкая царква павінна мець пануючы статус у дзяржаве; прававое санкцыянаванне рэлігійнай талеранцыі выключалася. У выпадку дзеянняў дзяржаўнай улады, накіраваных супраць каталіцкай царквы, кіраўніцтва апошняй мае права змяніць дадзеную ўладу.

Пётр Скарга ў сваёй працы “Соймавыя казанні” (1600 г.), разглядаючы пытанне грамадска-палітычнага ўладкавання, сцвярджае ідэю згоды. Адпаведна з ёй, грамадства і дзяржава разглядаюцца як жывы арганізм, што складаецца са спецыфічных і ўзаемазвязаных частак, якія выконваюць адмет-

ныя функцыі. Асновы згоды ў грамадстве П. Скарга бачыць у гарманічным узаемадзеянні структурных элементаў, сацыяльнай няроўнасці, дакладным размежаванні функцый паміж часткамі грамадства, наяўнасці калектыўных грамадзянскіх пачуццяў, моцнай манархічнай уладзе, а галоўнае – у панаванні адзінай рэлігіі, якой павінен быць каталіцызм. Асноўнымі пагрозамі грамадска-палітычнай стабільнасці, на яго думку, з'яўляюцца рэлігійная талеранцыя і шляхецкая анархія. У той жа час П. Скарга сцвярджаў неабходнасць абмежавання манархічнай улады з боку права і рады (Сената), выступаў з крытыкай тыраніі.

Прадстаўнікі *шляхецка-рэспубліканскага накірунку* (ананімная літаратура ўдзельнікаў Сандамірскага рокашу 1606 – 1609 гг., шматлікія соймавыя праекты XVII ст. і г. д.) сцвярджалі ідэал *шляхецкай дэмакратыі* ("вольнай рэспублікі"). Носьбітам суверэннай улады ў дзяржаве абвяшчаецца палітычны народ – шляхта. Манарх, абраны шляхтай, разглядаецца як яе прадстаўнік, які ажыццяўляе ўладныя паўнамоцтвы на аснове дагавора – пакта канвента. У выпадку парушэння дагавору з боку манарха шляхта мае права на супраціўленне ўладзе і замену манарха.

Паступова на працягу XVII ст. ідэі шляхецкай дэмакратыі глыбока пранікаюць у масавую свядомасць шляхты і становяцца часткай ідэалогіі сарматызму. Характэрна тое, што прадстаўнікі контррэфармацыйнага руху, пачынаючы прыблізна з 1620-х гг., адмаўляюцца ад планаў устанаўлення моцнай манархічнай улады і імкнуцца сінтэзаваць тэакратычныя ідэі з ідэяй шляхецкай дэмакратыі. Адметным становіцца сцвярджэнне унікальнасці грамадска-палітычнага ладу Рэчы Паспалітай, яго рэклама ў якасці ўзору ажыццяўлення палітычнай свабоды.

Канцэпцыі змешанай манархіі і шляхецкай дэмакратыі актыўна выкарыстоўваліся ў рэлігійна-палемічнай літаратуры. У палемічных творах прадстаўнікоў праваслаўнай і пратэстанцкай думкі (*Х. Філалет, М. Сматрыцкі, І. Барэцкі, П. Кахлеўскі* і інш.) яны выступаюць у якасці аргументаў на карысць *рэлігійнай талеранцыі* ў дзяржаве. Аргументацыя пры гэтым мае наступны характар: адной з асноўных грамадзянскіх свабод для шляхты з'яўляецца свабода веравызнання, гарантам чаго выступае акт Варшаўскай канфедэрацыі; падаўленне дадзенай свабоды разглядаецца як спроба рэвізіі існуючага дзяржаўна-палітычнага ладу і ўстанаўлення тыраніі. Талеранцыя ў дадзеным кантэксце вызначаецца як спецыфічны шляхецкі прывілей.

Найбольш грунтоўная распрацоўка праблемы дзяржаўна-палітычнага ўладкавання ў ВКЛ у гэты перыяд належыць Аляксандру Арону Алізароўскаму. У межах праведзенага ім аналізу знаходзіць адлюстраванне сінтэз сацыяльна-палітычных ідэй сярэднявечча і Новага часу.

***Аляксандр Арон Алізароўскі*** (1610 – 1659 гг.) – прафесар царкоўнага і цывільнага права ў Віленскай езуіцкай акадэміі (1644 – 1655 гг.). Доктар абодвух правоў (1644 г.) і медыцыны (1658 г.).

Асноўнай працай А. Алізароўскага з'яўляецца твор "*Аб палітычнай супольнасці людзей*" (1651 г.). Кніга складаецца з трох частак – "Гаспадарка", "Грамадства", "Дзяржава". У першай частцы разглядаюцца сацыяльна-эканамічныя пытанні. У ёй А. Алізароўскі крытыкуе прыгонніцкую сістэму як з'яву, якая разыходзіцца з натуральным правам і прыносіць шкоду грамадству. Ён лічыць дапушчальнай толькі пазямельную, але не асабістую залежнасць сялян ад шляхты. Таксама у гэтай частцы сцвярджаецца важная грамадская карысць рамёстваў.

У другой частцы праводзіцца тэарэтычная рэфлексія грамадскіх адносін. А. Алізароўскі прытрымліваецца арганіцысцкай канцэпцыі, паводле якой грамадства разглядаецца як структурна-функцыянальнае адзінства. Ён сцвярджае ідэю *натуральнага права,* згодна з якім усе індывіды валодаюць неадчужальнымі правамі на жыццё і свабоду. На гэтай аснове, на думку А. Алізароўскага, прадстаўнікі ўсіх саслоўяў павінны валодаць грамадзянскімі правамі, быць роўнымі перад законам і мець права пры пэўных умовах пераходзіць з аднаго саслоўя ў другое. Разам з тым сцвярджаліся неабходнасць саслоўнага падзелу грамадства (што вынікае з неабходнасці выканання розных сацыяльных функцый) і манаполія шляхты на ўдзел у палітычным жыцці дзяржавы.

У трэцяй частцы аналізаваліся паходжанне і сутнасць дзяржавы, формы дзяржаўнага кіравання. Дадзены аналіз грунтаваўся пераважна на рэцэпцыі палітычных ідэй арыстацелізму. Найлепшай формай дзяржаўнага праўлення А. Алізароўскі лічыў спадчынную манархію. Існуючыя грамадска-палітычныя праблемы павінны вырашацца, на яго думку, шляхам маральнага ўдасканалення грамадства на аснове рацыянальнай дзейнасці людзей.

*Такім чынам, філасофская і грамадска-палітычная думка Беларусі XVII – першай паловы XVIII стст. працягвае развівацца ва ўмовах геакультурнай прасторы, межы якой у асноўным супадаюць з дзяржаўнымі межамі Рэчы Паспалітай. Значны ўплыў на яе развіццё аказалі ідэі Контррэфармацыі, а таксама рэлігійныя палемікі і ідэалогія сарматызму. Галоўнай яе адметнасцю становіцца фарміраванне неасхаластычнай філасофіі. У развіцці апошняй назіраецца эвалюцыя ад акцэнтуацыі асобных элементаў акадэмічнага корпуса філасофскіх ведаў да стварэння сінтэтычных філасофскіх сістэм. У грамадска-палітычнай думцы важнейшае значэнне набывае асэнсаванне спецыфікі шляхецкай дэмакратыі як формы дзяржаўна-палітычнага ладу, што склаўся ў Рэчы Паспалітай.*

## Кантрольныя пытанні да тэмы 3

1. Дайце агульную характарыстыку гістарычных умоў развіцця філасофскай і грамадска-палітычнай думкі ВКЛ XVII – першай паловы XVIII стст.

2. Што такое Контррэфармацыя? Вызначце яе ролю ў развіцці філасофскай і грамадска-палітычнай думкі ВКЛ.

3. Якое месца займае рэлігійная палемічная літаратура XVII – першай паловы XVIII стст. у развіцці філасофскіх і сацыяльна-палітычных ідэй?

4. Назавіце асноўных прадстаўнікоў каталіцка-уніяцкай і праваслаўнай палемічнай думкі ВКЛ.

5. Чым абумоўлена шырокае распаўсюджанне рэлігійнай палемічнай літаратуры ў ВКЛ у XVII ст.?

6. Растлумачце сутнасць канцэпцыі сарматызму. Вызначце яе асноўныя прынцыпы.

7. Ахарактарызуйце спецыфічныя рысы філасофскай думкі ВКЛ перыяду Контррэфармацыі.

8. Што такое неасхаластыка? Якое месца яна займае ў адносінах да класічнай схаластыкі?

9. Якое значэнне мела неасхаластыка ў арганізацыі выкладання філасофіі як акадэмічнай дысцыпліны ў адукацыйных установах ВКЛ XVII – першай паловы XVIII стст.?

10. Якую структуру мела філасофія ў неасхаластыцы?

11. Вызначце характар адносін неасхаластычнай філасофіі ВКЛ да схаластычнага арыстацелізму.

12. Якія асноўныя праблемы разглядаліся ў неасхаластычнай філасофіі ВКЛ канца XVI – першай паловы XVII стст.?

13. Назавіце асноўных прадстаўнікоў неасхаластыкі ВКЛ канца XVI – першай паловы XVII стст.

14. У чым заключаецца спецыфіка этычнай думкі ў межах неасхаластычнай філасофіі ВКЛ?

15. Назавіце спецыфічныя рысы неасхаластычнай філасофіі ВКЛ другой паловы XVII – першай паловы XVIII стст.

16. Назавіце асноўных прадстаўнікоў неасхаластычнай філасофіі ВКЛ другой паловы XVII – першай паловы XVIII стст.

17. Назавіце асаблівасці праваслаўнай неасхаластыкі.

18. Якую ролю іграла Кіева-Магілянская акадэмія ў развіцці неасхаластычнай філасофіі ВКЛ?

19. У чым заключаецца сутнасць канцэпцый змешанай манархіі і шляхецкай дэмакратыі?

20. Назавіце накірункі пры вырашэнні праблемы дзяржаўна-палітычнага ўладкавання ў сацыяльна-палітычнай думцы ВКЛ XVII – першай паловы XVIII стст.? Якія асноўныя асаблівасці дадзеных накірункаў?

21. Ахарактарызуйце сувязь паміж ідэямі шляхецкай дэмакратыі і талеранцыі ў грамадска-палітычнай думцы ВКЛ XVII ст.

22. Дайце агульную характарыстыку грамадска-палітычнай тэорыі А. Алізароўскага.

## ТЭМА 4. ПЕРЫЯД АСВЕТНІЦТВА (ДРУГАЯ ПАЛОВА XVIII – 20-я гг. XIX стст.)

### Гістарычныя ўмовы развіцця філасофскай і грамадска-палітычнай думкі

Станаўленне асветніцкай філасофіі на землях Беларусі адбываецца ва ўмовах сістэмнага крызісу грамадства Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст.

У сферы сацыяльна-эканамічных адносін праяўляецца супярэчнасць паміж фальварачна-паншчыннай сістэмай сельскай гаспадаркі, заснаванай на прыгоннай працы, і патрэбнасцямі ў развіцці першасных форм капіталістычнай прамысловасці, якія ўзнікаюць у гэты час. Падчас праўлення апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага (1764 – 1795 гг.) быў праведзены шэраг рэформ, накіраваных на развіццё прамысловасці і гандлю, некаторую мадэрнізацыю грамадскіх адносін у сельскай гаспадарцы. Паражэнне рэфарматараў, падзелы Рэчы Паспалітай і ўключэнне тэрыторыі Беларусі ў склад Расійскай імперыі прывялі да кансервацыі старых форм сацыяльна-эканамічнай сістэмы.

У сферы сацыяльна-палітычных адносін да сярэдзіны XVIII ст. адбываецца паралізацыя дзяржаўна-палітычнай сістэмы ў выніку панавання магнацкай алігархіі, недзеяздольнасці інстытутаў цэнтральнай дзяржаўнай улады, палітычнай барацьбы магнацкіх груповак і актыўнага ўмяшання ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай суседніх дзяржаў. У 1760-я – на пачатку 1790-х гг. ажыццяўляліся некаторыя спробы рэфармавання палітычнай сістэмы, найбольш радыкальнай з якіх была дзейнасць Чатырохгадовага сойма 1788 – 1792 гг. Аднак з прычыны супярэчнасцяў паміж палітычнымі элітамі і ўмяшання замежных дзяржаў рэформы не атрымалі эфекту. У выніку падзелаў 1772, 1793 і 1795 гг. Рэч Паспалітая спыніла сваё існаванне, а тэры-

торыя Беларусі цалкам была інкарпаравана ў склад Расійскай імперыі. Дадзеная інкарпарацыя садзейнічала трансфармацыі грамадска-палітычных адносін у межах цэнтралізаванай абсалютысцкай манархіі, пераходу ад шляхецкай дэмакратыі да дваранска-бюракратычнай іерархічнай сістэмы.

У духоўным жыцці адбываюцца наступныя працэсы:

1) Трансфармацыі ў рэлігійнай сферы: пераўтварэнне ў выніку далучэння тэрыторыі Беларусі да Расійскай імперыі праваслаўя ў пануючую канфесію, а каталіцызму (у т. л. і уніяцтва) – у цярпімую канфесію.

2) Частковае аслабленне рэлігійнага ўплыву на розныя формы духоўнай культуры і ўзрастанне свецкіх элементаў культуры. Важным фактарам гэтага стала скасаванне паводле булы рымскага папы Клімента XIV ордэна езуітаў у 1773 г. (працягваў сваё існаванне на тэрыторыі ўсходняй Беларусі, далучанай да Расійскай імперыі ў 1772 г.).

3) Фарміраванне свецкай сістэмы адукацыі. Галоўным фактарам дадзенага працэсу стала дзейнасць *Адукацыйнай камісіі*, заснаванай у 1773 г., якой перадавалася ўся адукацыйная інфраструктура скасаванага ордэна езуітаў. У ВКЛ была створана спецыяльная навучальная акруга, кіраўніцтва якой ажыццяўляла *Галоўная школа ВКЛ* (былая Віленская езуіцкая акадэмія). У межах акругі намаганнямі Адукацыйнай камісіі на базе былых езуіцкіх калегіумаў былі заснаваны 5 акруговых і 25 падакруговых школ. Створаныя школы знаходзіліся на дзяржаўным утрыманні. Навучальныя праграмы набылі свецкі характар, у іх структуры павялічвалася роля прыродазнаўчых і сацыяльных навук. Свецкі характар набыла сістэма вышэйшай адукацыі; Віленская езуіцкая акадэмія ў 1781 г. была пераўтворана ў Галоўную школу ВКЛ. У 1775 г. створана медыцынская школа ў Гародні (з 1781 г. пераведзена ў Вільню і далучана да Галоўнай школы ВКЛ). Разам са свецкімі адукацыйнымі ўстановамі захаваліся канфесійныя. З іх найбольш вядомымі ў гэты час з'яўляліся піярскія калегіумы, дзе ў выніку праведзенай у 1740-я гг. рэформы была павялічана роля прыродазнаўчых і сацыяльных навук у педагагічным працэсе. Пасля далучэння тэрыторыі Беларусі да Расійскай імперыі была ў асноўным захавана ранейшая сістэма адукацыі. Свецкія навучальныя ўстановы перайшлі ў падпарадкаванне расійскіх дзяржаўных улад у межах створанай у 1803 г. Віленскай навучальнай акругі, цэнтрам якой стаў *Віленскі універсітэт* (з 1803 г. былая Галоўная школа ВКЛ). У 1812 г. на базе Полацкага езуіцкага калегіума створана *Полацкая езуіцкая акадэмія* (1812 – 1820 гг.), якая становіцца другой вышэйшай навучальнай установай на землях былога ВКЛ.

4) Развіццё друку: з'яўленне першых перыядычных выданняў на тэрыторыі Беларусі.

5) У розных формах духоўнай культуры пануючым стылем у гэты час становіцца *класіцызм*.

6) Дэлацінізацыя і паланізацыя духоўнай культуры; пачатак памяркоўнай русіфікацыі духоўнага жыцця пасля падзелаў Рэчы Паспалітай пры захаванні пануючай ролі польскамоўнай культуры.

## Спецыфічныя рысы філасофскай і грамадска-палітычнай думкі другой паловы XVIII – першай чвэрці XIX стст.

У другой палове XVIII – першай чвэрці XIX стст. захоўваецца арыентацыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі на засваенне ўзораў заходнееўрапейскай філасофіі. Інкарпарацыя ў склад Расійскай імперыі гэтаму істотна не перашкодзіла, таму што Расія ў дадзены перыяд таксама знаходзілася ў полі культурнага ўплыву Заходняй Еўропы. Нягледзячы на ліквідацыю Рэчы Паспалітай, у першыя дзесяцігоддзі XIX ст. захавалася сфарміраваная ў яе межах геакультурная прастора. У той жа час узмацніліся культурныя сувязі зямель былога ВКЛ з Расіяй. У дадзены перыяд вызначальны ўплыў на развіццё філасофскай і грамадска-палітычнай думкі мела ідэалогія Асветніцтва. У пачатку XIX ст. у якасці рэакцыі на яе ўзнікаюць ідэі г. зв. Контрасветніцтва, якія атрымліваюць развіццё ў межах канфесійных (пераважна каталіцкіх) адукацыйных цэнтраў.

*Асветніцтва* – агульнаеўрапейскі сацыяльны і культурны рух XVIII ст., накіраваны на перабудову ўсіх сфер грамадскага жыцця на аснове абстрактна сканструяваных прынцыпаў розуму. Фарміраванне і развіццё дадзенага руху ў Еўропе было цесна звязана з развіццём індустрыі і ўстанаўленнем капіталістычных адносін. У той жа час у найбольш эканамічна развітых еўрапейскіх дзяржавах у XVIII ст. яскрава вызначылася супярэчнасць паміж новымі формамі сацыяльных адносін і элементамі старога сярэднявечнага грамадства (феадальныя адносіны ў сельскай гаспадарцы, саслоўны падзел грамадства, высокі статус рэлігійных інстытутаў і г. д.). У ідэалогіі Асветніцтва новыя формы грамадскага жыцця разглядаюцца як увасабленне прынцыпаў абстрактна сканструяванага Розуму, якія павінны развівацца і зацвярджацца, а старыя формы – як перажыткі, забабоны, якія павінны падвяргацца жорсткай крытыцы з пазіцый Розуму і ў выніку гэтага пераадольвацца.

Асветніцкая філасофія грунтавалася на наступных прынцыпах:

– *рацыяналізм* – абвяшчэнне розуму субстанцыянальнай асновай быцця, вырашальным фактарам у працэсе пазнання і пераўтварэння прыроды, чалавека і грамадства;

– *навукацэнтрызм* – абвяшчэнне навуковых ведаў галоўным фактарам увасаблення рацыянальных асноў у чалавечым жыцці, падмуркам рацыянальнага панавання чалавека над светам і ажыццяўлення яго магчымасцяў;

– *антыклерыкалізм* – крытычная ўстаноўка адносна месца рэлігійных інстытутаў у грамадстве і традыцыйнага рэлігійнага светапогляду. Апошняму супрацьпастаўляліся *дэізм* (рацыяналістычны рэлігійна-філасофскі прынцып, згодна з якім Бог разглядаецца як прычына і гарант разумнага прыроднага і маральнага парадку; пры гэтым з рэлігійнай сістэмы выключаюцца ўсе ірацыяналістычныя элементы) і *атэізм* (светапоглядны прынцып, звязаны з поўным адмаўленнем існавання звышнатуральнага пачатку быцця);

– *сацыяльны аптымізм* – вера ў прагрэс навукі і грамадства, у наяўнасць адзіных мэтаў гістарычнага развіцця;

– *наданне вырашальнай ролі адукацыі і выхаванню ў працэсе рацыянальнага пераўтварэння грамадства*.

На землях Беларусі, як і ў цэлым у Рэчы Паспалітай, назіраецца запозненасць працэсу станаўлення і развіцця асветніцкай філасофіі ў параўнанні з іншымі еўрапейскімі краінамі. Гэта тлумачылася адставаннем сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэчы Паспалітай ў еўрапейскім кантэксце. Таму супярэчнасць паміж элементамі новага індустрыяльнага і старога сярэднявечнага грамадства абазначылася тут значна пазней і з’яўлялася менш вострай.

На з’яўленне і распаўсюджанне асветніцкіх ідэй у ВКЛ паўплывалі:

– наяўнасць шырокіх кантактаў з заходнееўрапейскай інтэлектуальнай элітай, распаўсюджанне друкаванай прадукцыі асветніцкага характару з Заходняй Еўропы;

– адукацыйная і культурная палітыка Рэчы Паспалітай падчас праўлення С. А. Панятоўскага (падтрымка Адукацыйнай камісіі, фінансаванне газет, часопісаў, друкаваных твораў асветніцкай накіраванасці);

– грамадска-палітычны ўздым 1760-х – першай паловы 1790-х гг., звязаны са спробамі рэфармавання грамадства напярэдадні і падчас падзелаў Рэчы Паспалітай.

Галоўным цэнтрам распаўсюджання асветніцкай філасофіі становіцца Віленская акадэмія (з 1781 г. – Галоўная школа ВКЛ, з 1796 г. – Галоўная Віленская школа, з 1803 г. – Віленскі універсітэт). У выніку рэформы, праведзенай Адукацыйнай камісіяй, адбылася трансфармацыя структуры дадзенай адукацыйнай установы. У Галоўнай школе ВКЛ былі сфарміраваны тры факультэты: маральны (выкладаліся старажытныя мовы, гісторыя, Святое Пісанне, дагматычная і маральная тэалогія, гісторыя царквы і кананічнае права), фізічны (выкладаліся арыфметыка, геаметрыя, матэматыка,

астраномія, механіка, фізіка, хімія, медыцына), медыцынскі. З 1803 г. пасля пераўтварэння Галоўнай Віленскай школы ў Віленскі універсітэт у ім былі ўтвораны 4 факультэты: фізіка-матэматычны, медыцынскі, маральна-палітычны (выкладалася пераважна тэалогія), літаратурны. З 1803 г. выкладанне філасофіі праводзілася на дзвюх кафедрах: логікі, а таксама метафізікі і маралі (аб'яднаныя ў 1820 г.). Прапаганда асветніцкіх ідэй у Віленскім універсітэце ажыццяўлялася праз часопіс "*Віленскі дзённік*".

Супрацьдзеянне ідэям Асветніцтва ў дадзены перыяд мела месца пераважна ў межах канфесійных навучальных устаноў, галоўным чынам езуіцкіх. У 1812 – 1820 гг. цэнтрам контрасветніцкай філасофіі на тэрыторыі Беларусі становіцца Полацкая езуіцкая акадэмія, якой былі ў гэты перыяд падпарадкаваны ўсе езуіцкія калегіумы на тэрыторыі Расійскай імперыі. У акадэміі дзейнічалі 3 факультэты: моўны, філасофіі і вольных навук, тэалагічны. Выкладанне філасофіі адбывалася на аснове неасхаластыкі (найбольш вядомы прадстаўнік позняй неасхаластыкі – *Вінцэнт Бучынскі* (1789 – 1853 гг.). Палеміка з ідэямі Асветніцтва ў акадэміі адбывалася праз часопіс "*Полацкі штомесячнік*" (1818 – 1820 гг.).

***Перыядызацыя філасофіі Асветніцтва на тэрыторыі Беларусі***

| *Перадасветніцтва* (1750-я – 1760-я гг.) | *класічнае Асветніцтва* (1770-я – 1790-я гг.) | *позняе Асветніцтва* (1800-я – 1820-я гг.) |
|---|---|---|
| фарміруецца эклектычная філасофія, для якой характэрна спалучэнне ідэй неасхаластыкі з ідэямі філасофіі Новага часу і Асветніцтва | фарміруюцца і зацвярджаюцца асноўныя накірункі асветніцкай філасофскай думкі | адбываецца трансфармацыя асветніцкай філасофскай думкі пад уплывам агульнаеўрапейскага крызісу асветніцкай парадыгмы і з'яўлення постасветніцкіх і контрасветніцкіх ідэй |

*Такім чынам, да спецыфічных рыс філасофіі Асветніцтва на тэрыторыі Беларусі адносяцца:*

– рэцэптыўны характар у адносінах да заходнееўрапейскай асветніцкай філасофіі (асветніцкія творы на тэрыторыі Беларусі ў значнай ступені ўяўлялі сабой перайманне заходнееўрапейскіх асветніцкіх ідэй);

– кампраміснасць і памяркоўнасць у крытыцы сацыяльнай рэчаіснасці і традыцыйнага рэлігійнага светапогляду;

– акцэнтуацыя ў сістэме філасофскай культуры праблем логікі і гнасеалогіі, метадалогіі навуковага прыродазнаўства, а таксама сацыяльна-палітычнай праблематыкі.

## Эклектычная філасофія Перадасветніцтва

Эклектычная філасофія ў ВКЛ уяўляе сабой сінтэз філасофскіх ідэй неасхаластыкі з ідэямі філасофіі Новага часу (“новых філосафаў”) XVII – XVIII стст., у якіх адстойваліся прынцыпы рацыяналізму, навукацэнтрызму, неабходнасці вопытна-эксперыментальнага даследавання прыроды.

Ідэі “новых філосафаў” (Ф. Бэкана, Р. Дэкарта, Д. Лока, Б. Спінозы, Г. Лейбніца і інш.) набылі вядомасць у ВКЛ яшчэ ў XVII ст. У другой палове XVII – першай палове XVIII стст. адносіны да іх у неасхаластычнай філасофіі мелі выключна крытычны характар; палеміка супраць “новых філосафаў” стала характэрным аспектам філасофскай традыцыі дадзенага перыяду.

У 1750-я – 1760-я гг. крытыка ідэй “новых філосафаў” у акадэмічнай філасофіі пачынае спалучацца з засваеннем іх асобных элементаў і імкненнем да канвергенцыі дзвюх філасофскіх традыцый. Значны ўплыў на ідэйную трансфармацыю віленскай неасхаластычнай школы мела фарміраванне эклектычнай філасофіі ў Польшчы ў 1740-я – 1750-я гг. (А. Вісьнеўскі, Ю. А. Залускі). Станаўленне перадасветніцкай эклектычнай філасофіі ў ВКЛ выяўлялася ў наступных працэсах:

– сцвярджэнне аўтаноміі філасофскіх ведаў у адносінах да тэалогіі;

– вылучэнне вопытна-эксперыментальнага прыродазнаўства з сістэмы натуральнай філасофіі і пераход ад тэарэтычнага да практычнага даследавання прыроды;

– трансфармацыя логікі, выкліканая яе збліжэннем з гнасеалагічнай праблематыкай.

### *Асноўныя прадстаўнікі эклектычнай філасофіі*

***Антоній Скарульскі*** (1715 – 1777 гг.) – выкладчык філасофіі, гісторыі і геаграфіі ў шэрагу езуіцкіх калегіумаў ВКЛ. Рэктар езуіцкіх калегіумаў у Навагародку (1760 – 1764 гг.), Коўне (1764 – 1766 гг.), Віленскай езуіцкай акадэміі (1772 – 1773 гг.). Кіраўнік Літоўскай правінцыі ордэна езуітаў (1766 – 1772 гг.). Галоўны твор – “Каментарыі па філасофіі ці логіцы, г. зн., па метафізіцы, агульнай і спецыяльнай фізіцы” (1755 г.). У гэтай працы А. Скарульскі дае крытычны аналіз філасофіі Новага часу (вучэнняў Р. Дэкарта, А. Гасэндзі, Д. Лока), а таксама ілюструе навейшыя дасягненні прыродазнаўства. Асноўная скіраванасць філасофіі А. Скарульскага – абарона неасхаластычнага арыстацелізму ў пытаннях логікі, гнасеалогіі і прыродазнаўства і адначасова яго мадэрнізацыя, якая прадугледжвае адаптацыю да неасхаластыкі некаторых ідэй “новых філосафаў”. У кантэксце гэтага праводзіцца неасхаластычная інтэрпрэтацыя дасягненняў

новага прыродазнаўства, асобных элементаў рацыяналізму і сенсуалізму Новага часу. Пры разглядзе праблем логікі А. Скарульскі разам з яе традыцыйнымі праблемамі, характэрнымі для неасхаластыкі, аналізуе характэрную для філасофіі Новага часу праблему метаду як асаблівага спосабу мыслення і развагі.

***Станіслаў Шадурскі*** (1726 – 1789 гг.) – выкладчык філасофіі ў Варшаўскім "Калегіум Нобіліум" (1757 – 1759 гг.), Новагародскім (1759 – 1762 гг.), Гарадзенскім (1768 – 1770 гг.), Бранеўскім (1770 – 1771 гг.) езуіцкіх калегіумах. Асноўныя працы: "Прынцыпы філасофіі мыслення і адчування" (1758 г.), "Зачаткі разважанняў у розных дыялогах, а таксама практыкаванні па логіцы, этыцы і метафізіцы" (1760 г.), "Філасофскія азначэнні агульнай фізікі" (1761 г.), "Фізіка, або Філасофія прыроды" (рукапіс). С. Шадурскі першым сярод філосафаў ВКЛ абвяшчае сябе прадстаўніком філасофскай школы эклектыкаў і абвяшчае непрыняцце традыцыйнага неасхаластычнага арыстацелізму. У той жа час ён крытыкуе розныя філасофскія сістэмы Новага часу. Найбольшы ўплыў на яго філасофію мела вучэнне Р. Дэкарта. Працы С. Шадурскага прысвечаны найперш аналізу праблем логікі, якія цесна спалучаюцца з элементамі гнасеалогіі, метадалогіі навуковага пазнання і псіхалогіі. Сярод гнасеалагічных пытанняў асноўная ўвага нададзена праблеме ісціны. У кантэксце яе аналізу С. Шадурскі імкнецца сінтэзаваць ідэі рацыяналізму і эмпірызму; галоўным крытэрыем ісціны абвяшчаецца відавочнасць, дапаможнымі – гістарычны аўтарытэт, вера і меркаванне.

***Бенедыкт Дабшэвіч*** (1722 – 1799 гг.) – выкладчык філасофіі ў Крожскім і Новагародскім езуіцкіх калегіумах, Віленскай езуіцкай акадэміі (1753 – 1782 гг.), дырэктар Крожскай акруговай школы (1782 – 1792 гг.), рэктар Жамойцкай школьнай акругі (1792 – 1794 гг.). Асноўныя працы: "Погляды новых філосафаў…" (1760 г.), "Лекцыі па логіцы…" (1761 г.), "Тэзісы да універсальнай філасофіі" (1763 г.). Задачай Б. Дабшэвіча з'яўляецца пабудова філасофскай сістэмы на аснове сінтэзу ідэй розных філасофскіх школ. Галоўная ўвага ў яго працах надаецца праблемам логікі, гнасеалогіі і метадалогіі прыродазнаўчых навук. Уплыў рацыяналістычнай філасофіі Новага часу на погляды Б. Дабшэвіча праявіўся ў абвяшчэнні неабходнасці матэматызацыі філасофіі, гнасеалагізацыі логікі.

## Філасофія класічнага і позняга Асветніцтва

У межах філасофскай думкі Беларусі класічнага і позняга Асветніцтва можна вылучыць *тры асноўныя накірункі*:

– накірунак, звязаны з даследаваннем праблем логікі і гнасеалогіі;

– накірунак, звязаны з даследаваннем праблем метадалогіі навуковага прыродазнаўства;

– фізіякратызм.

*Накірунак, звязаны з даследаваннем праблем логікі і гнасеалогіі* фарміруецца ў выніку эвалюцыі эклектычнай філасофіі ў бок канчатковага адмаўлення ад неасхаластычнага арыстацелізму і аналізу логіка-гнасеалагічных пытанняў у духу філасофіі Новага часу і Асветніцтва. Асноўныя прадстаўнікі дадзенага накірунку – Казімір Нарбут (класічнае Асветніцтва), Анёл Доўгірд (позняе Асветніцтва).

***Казімір Нарбут*** (1738 – 1807 гг.) – выкладчык філасофіі, матэматыкі і некаторых іншых дысцыплін у Дубровіцкім піярскім калегіуме, Віленскім піярскім "Калегіум Нобіліум". Быў членам Адукацыйнай Камісіі і Таварыства па складанні элементарных кніг, якое займалася складаннем падручнікаў для дзяржаўных школ у Рэчы Паспалітай. Асноўныя працы: "Логіка, або Навука аб разважанні і меркаванні пра розныя рэчы..." (1769 г.), "Выбраныя меркаванні з філасофіі..., прысвечаныя каралю Станіславу Аўгусту" (1771 г.).

К. Нарбут з'яўляецца першым акадэмічным філосафам у ВКЛ, які паслядоўна адмаўляе неасхаластычны тып філасофствавання. Ён падкрэслівае неабходнасць размежавання філасофіі і тэалогіі. Філасофія пры гэтым разглядаецца як абагульняючая навука аб усіх прадметах і з'явах свету. Яна складаецца з шасці частак: натуральнай тэалогіі (навукі пра Бога), анталогіі (навукі аб уласцівасцях, характэрных для ўсіх прадметаў), псіхалогіі (навукі пра чалавечую душу), логікі (навукі пра дасягненне ісціны), фізікі (навукі пра прыродныя прадметы), маральнай філасофіі (навукі пра дабро і зло).

Пры разглядзе праблем логікі К. Нарбут у большай ступені ў параўнанні з прадстаўнікамі эклектычнай філасофіі звязвае іх з гнасеалогіяй. У структуры логікі вылучаюцца дзве часткі: тэарэтычная і натуральная логіка. Тэарэтычная логіка разглядаецца як рэфлексія над натуральнымі здольнасцямі чалавека да развагі, якія складаюць змест натуральнай логікі. К. Нарбут сцвярджае наяўнасць пэўных законаў пазнавальнай дзейнасці і вылучае чатыры асноўныя крыніцы пазнання:

– унутранае пачуццё (усведамленне) відавочнасці;

– выснова або дэдуктыўны вывад аднаго сцвярджэння з другога;

– эмпірычны вопыт;

– аўтарытэтнае сцвярджэнне або меркаванне.

Найбольшае значэнне К. Нарбут надае ў гнасеалагічным аспекце прынцыпу відавочнасці, у чым выявіўся ўплыў філасофскай канцэпцыі Р. Дэкарта. У той жа час ён падкрэслівае наяўнасць межаў для атрымання ісціннага пазнання:

– абмежаванасць магчымасцяў розуму ў параўнанні з бясконцай шматстайнасцю аб’ектаў пазнання;

– суб’ектыўныя схільнасці, якія штурхаюць розум да памылковых сцвярджэнняў;

– уплыў аўтарытэтаў, грамадскай думкі і г. д.

***Анёл Доўгірд*** (1776 – 1835 гг.) – выкладчык геаграфіі, матэматыкі, фізікі, паэтыкі, рыторыкі і французскай мовы ў піярскіх калегіумах у Лідзе, Любяшове, Шчучыне; прафесар Віленскага універсітэта (1818 – 1832 гг.), дзе выкладаў курсы логікі і псіхалогіі, а потым тэарэтычнай і практычнай філасофіі. Асноўныя працы: “Аб логіцы, метафізіцы і маральнай філасофіі” (1821 г.), “Выклад прыродных правіл мыслення, або Тэарэтычная і практычная логіка” (т. 1. – 1828 г.). У творчасці А. Доўгірда панаваў інтарэс да праблем логікі і гнасеалогіі.

У гнасеалогіі і логіцы А. Доўгірд прытрымліваўся эмпірыка-сенсуалістычнага накірунку. Асновай пазнавальнай, у т. л. навукова-пазнавальнай, дзейнасці абвяшчаецца пачуццёвы вопыт. Указваецца на тое, што вопытна-эксперыментальныя навукі генетычна папярэднічаюць тэарэтычнай логіцы. Узаемаадносіны тэарэтычнай логікі і прыродазнаўства трактуюцца наступным чынам: логіка з’яўляецца метадам пазнання для прыродазнаўчых навук, але ў той жа час яна таксама ўзбагачаецца за кошт дасягненняў прыродазнаўства. Разам з тым пры разглядзе працэсу фарміравання рацыянальнага мыслення А. Доўгірд імкнецца пераадолець крайнасці эмпірызму і робіць пэўныя саступкі рацыяналістычнай традыцыі. Указваючы на пераход ад пачуццёвага ўзроўню пазнання да рацыянальнага, ён пастуліруе існаванне апрыёрных здольнасцяў паняційнага мыслення (хаця наяўнасць прыроджаных ідэй у свядомасці чалавека адмаўляецца). Дадзеныя здольнасці выступаюць гарантам таго, што паняцце адпавядае рэчаіснасці, чалавек можа адрозніць ісціну ад хлусні і даведацца, што існуюць прадметы па-за яго свядомасцю. Апрыёрныя здольнасці мыслення тлумачаць сувязь свядомасці чалавека і знешняга свету. У той жа час А. Доўгірд не лічыць дадзеныя здольнасці статычнымі; яны з’яўляюцца вынікам пастаяннага самаўдасканалення розуму ў сувязі з патрэбамі людзей.

*Накірунак, звязаны з даследаваннем праблем метадалогіі навуковага прыродазнаўства,* фарміруецца пад уздзеяннем навуковай рэвалюцыі XVII – XVIII стст., якая прывяла да станаўлення класічнага прыродазнаўства. Вялікую ролю ў распаўсюджанні ідэй новага прыродазнаўства на землях ВКЛ мелі заходнееўрапейскія навукоўцы, якія пэўны час працавалі ў Галоўнай школе ВКЛ: Георг Форстэр, Жан Жылібер і інш. Філасофія і метадалогія навуковага прыродазнаўства грунтавалася на наступных прынцыпах:

– *прыродазнаўчы матэрыялізм* – прынцып, згодна з якім матэрыяльныя аб’екты прыроды маюць субстанцыянальны характар і генетычна папярэднічаюць ідэальным аб’ектам;

– *дэізм* – прынцып, згодна з якім Бог разглядаецца як прычына і гарант разумнага прыроднага і маральнага парадку;

– *гнасеалагічны аптымізм* – прынцып, які абвяшчае універсальную пазнавальнасць свету;

– *натуралістычны рацыяналізм* – прынцып, згодна з якім у аснове светабудовы знаходзяцца універсальныя разумныя законы прыроды;

– *механіцызм* – прынцып, згодна з якім законы механікі разглядаюцца як універсальныя законы прыроды; увесь свет уяўляецца сукупнасцю непадзельных і нязменных матэрыяльных часціц, якія рухаюцца ў абсалютных прасторы і часе дзякуючы сілам прыцягнення, што вызначаюць жорсткую дэтэрмінаванасць прыродных з’яў і працэсаў. Прадстаўнікі дадзенага накірунку – *Марцін Пачобут, Ян Снядэцкі, Анджэй Снядэцкі, Ануфрый Маркевіч* і інш.

***Марцін Пачобут*** (1728 – 1810 гг.) – выкладчык матэматыкі і кіраўнік астранамічнай абсерваторыі ў Віленскай акадэміі (з 1764 г.); рэктар Віленскай акадэміі (Галоўнай школы ВКЛ, Віленскай галоўнай школы) (1780 – 1799 гг.). Навуковыя інтарэсы М. Пачобута былі сканцэнтраваны пераважна ў сферы астраноміі і матэматыкі. Філасофска-метадалагічныя ідэі выказваліся ім у працах па астраноміі. М. Пачобут абараняў ідэю нічым не абмежаванага даследавання свету. У астранамічных творах ён сцвярджае гіпотэзу аб мностве сусветаў і іх планетарнай будове. Разам з тым, М. Пачобут указваў на тое, што кожная гіпотэза павінна пераўтварацца ў тэорыю шляхам практычнай праверкі. Высока адзначалася ў сувязі з гэтым практычная значнасць навуковага прыродазнаўства.

***Ян Снядэцкі*** (1756 – 1830 гг.) – выкладчык матэматыкі і астраноміі ў Галоўнай школе ў Кракаве (1781 – 1806 гг.), актыўны дзеяч Адукацыйнай камісіі. Дырэктар Кракаўскай (1792 – 1806 гг.) і Віленскай (1806 – 1825 гг.) астранамічных абсерваторый. Рэктар Віленскага універсітэта (1806 – 1815 гг.). Аўтар шматлікіх прыродазнаўчых і філасофскіх прац. Галоўныя філасофскія працы: “Пра метафізіку” (1814 г.), “Пра класічнасць і рамантычнасць” (1819 г.), “Пра філасофію” (1819 г.) з “Дадаткам” (1920 г.), “Філасофія чалавечага розуму” (1821 г.). Пры вызначэнні прадмету філасофіі Я. Снядэцкі сцвярджае, што кожная прыродазнаўчая навука сама адлюстроўвае свае галоўныя прынцыпы і найбольш агульныя высновы. Філасофія, хаця і прызнаецца абстрактнай навукай аб найбольш агульных прынцыпах і законах быцця і мыслення, але пры гэтым павінна абапірацца на прыватныя навукі.

Сузіральная, чыста тэарэтычная філасофія (метафізіка) адмаўляецца. У сувязі з гэтым значнае месца ў сваіх творах Я. Снядэцкі прысвячае крытыцы кантыянства, якое, на яго думку, з'яўляецца адраджэннем старой метафізікі, адыходам ад прынцыпаў асветніцкай рацыянальнасці. Я. Снядэцкі вылучае чатыры асноўныя памылкі, якія, паводле яго меркавання, зрабіў І. Кант:

– адмаўленне магчымасці пазнання з дапамогай органаў пачуццяў;

– адарванасць рацыянальнай ступені пазнання ад пачуццёвай;

– пастуліраванне апрыёрных форм пазнання;

– ускладненне філасофскай тэрміналогіі.

Гнасеалогія і метадалогія навукі Я. Снядэцкага грунтуецца на ідэях паслядоўнага сенсуалізму. Асновай усялякай пазнавальнай дзейнасці, у т. л. навукова-пазнавальнай, выступае пачуццёвы вопыт. Усе тэарэтычныя навуковыя аб'екты, нават матэматычныя, з'яўляюцца абагульненнем практычнага вопыту. Фарміраванне навуковых паняццяў і законаў адбываецца ў выніку цеснага ўзаемадзеяння форм пачуццёвага пазнання і мыслення, інструментам якога выступае мова. Філасофскія і прыродазнаўчыя погляды Я. Снядэцкага атрымалі далейшае развіццё ў творчасці такіх навукоўцаў як *Вінцэнт Карчэўскі, Пётр Славінскі, Мікалай Глушневіч, Юзэф Ходзька.*

***Анджэй Снядэцкі*** (1768 – 1838 гг.) – прафесар хіміі (1797 – 1822 гг.) і медыцыны (1826 – 1832 гг.) у Галоўнай Віленскай школе (Віленскім універсітэце); прафесар Медыка-хірургічнай акадэміі ў Вільні (1832 – 1838 гг.). Асноўная праца – "Тэорыя арганічных істот" (т. 1 – 2, 1804 – 1811 гг.).

***Ануфрый Маркевіч*** – аўтар артыкула "Аб удасканаленні прыроды ў стварэнні чалавека" ("Віленскі дзённік", 1806 г.). У дадзенай працы аналізуецца праблема антрапагенезу. На аснове твораў заходнееўрапейскіх прыродазнаўцаў Робінэ, Бюфона і інш. А. Маркевіч сцвярджае, што фарміраванне чалавека з'яўляецца вынікам працяглага працэсу натуральнага развіцця.

## Грамадска-палітычная думка

Крызіс грамадска-палітычнай сістэмы Рэчы Паспалітай у XVIII ст. абумовіў асаблівую вастрыню грамадска-палітычных ідэй у корпусе асветніцкай думкі Рэчы Паспалітай.

У перыяд Перадасветніцтва актуалізуюцца ідэі аб неабходнасці рэфармавання грамадска-палітычнага ладу Рэчы Паспалітай. Аднак у той час яны праяўляюцца ў выглядзе памяркоўных праектаў і суіснуюць у кампрамісе з ранейшымі грамадска-палітычнымі поглядамі, выступаюць фрагментарна і несістэмна.

На развіццё перадасветніцкіх сацыяльна-палітычных ідэй у ВКЛ вялікае ўздзеянне мелі працы польскіх палітычных пісьменнікаў XVIII ст.

(*Ян Ябланоўскі, Станіслаў Ляшчынскі, Станіслаў Канарскі*). Перадасветніцкія грамадскія ідэі праяўляліся ў наступным:

– акцэнтаванне ролі адукацыі і навукі як фактараў развіцця дзяржавы;

– інтэлектуаліcцкая трактоўка шляхецтва і звязаная з гэтым крытыка ідэалогіі сарматызму;

– крытыка недахопаў дзяржаўна-прававой сістэмы Рэчы Паспалітай;

– крытыка крайнасцяў феадальнай эксплуатацыі.

*Да прадстаўнікоў перадасветніцкай грамадска-палітычнай думкі ВКЛ адносяцца наступныя дзеячы:*

***Адам Брамірскі*** – выпускнік Віленскай езуіцкай акадэміі; аўтар працы “Філасофія звычаяў і розуму” (1755 г.). У дадзеным творы праводзіцца думка, што асновай сапраўднага шляхецтва з’яўляецца высокая адукаванасць, пастаяннае ўдасканальванне ведаў і ўменне іх выкарыстання ў практычным жыцці, а не паходжанне.

***Юзэф Барэйка*** (1729 – 1765 гг.) – выкладчык рыторыкі ў езуіцкіх калегіумах, у Віленскай езуіцкай акадэміі (1763 – 1764 гг.). Аўтар твора “Навука пра красамоўства” (1763 г.), у якім указваецца на неабходнасць добрага выхавання маладога пакалення шляхціцаў і належнай інтэлектуальнай і маральнай падрыхтоўкі педагогаў. Гэтыя мерапрыемствы разглядаюцца як падмурак росквіту дзяржавы.

***Антоній Загурскі*** – прафесар права Віленскай езуіцкай акадэміі (каля 1760 – 1772 гг.). Аўтар працы “Аб шляхецтве, неабходнасці і карысці юрыспрудэнцыі ці прававой развазе” (1761 г.). Згодна з традыцыйнай схаластычнай дактрынай, А. Загурскі сцвярджае боскае паходжанне права. У той жа час ён рэзка крытыкуе занядбанне прававой навукі ў ВКЛ. На яго думку, веданне дадзенай навукі неабходна ўсім людзям, якія выконваюць грамадскія і дзяржаўныя абавязкі, асабліва суддзям.

***Адам Абрамовіч*** (1710 – 1776 гг.) – выкладчык у шматлікіх езуіцкіх навучальных установах; першы рэктар Віленскага езуіцкага “Калегіум нобіліум” (1752 – 1758 гг.), рэктар у Нясвіжскім (1758 – 1763, 1770 – 1773 гг.), Полацкім (1763 – 1766 гг.) і Менскім (1766 – 1770 гг.) езуіцкіх калегіумах. Аўтар твора “Нядзельныя казанні”. У ім прадстаўлена крытыка жорсткай эксплуатацыі прыгонных сялян з боку шляхты. Аднак пры гэтым сама сістэма прыгонніцтва не адмаўляецца; сацыяльная няроўнасць абвяшчаецца ўстаноўленай Богам для гармоніі ў грамадстве, каб розныя сацыяльныя слаі выконвалі адпаведныя ім грамадскія функцыі. Для пераадолення крайнасцяў прыгонніцкай сістэмы шляхта заклікаецца да міласэрнасці і дабрачыннасці.

Ва ўмовах класічнага Асветніцтва ў ВКЛ адбываецца росквіт грамадска-палітычнай думкі. Узрастанне інтарэсу да яе звязана з рэфарматарскай дзей-

насцю падчас праўлення С. А. Панятоўскага і нарастаннем знешнепалітычнай напружанасці напярэдадні падзелаў Рэчы Паспалітай. У апошняй трэці XVIII ст. на тэарэтычную распрацоўку сацыяльна-палітычных праблем найбольшы ўплыў мела вучэнне фізіякратызму.

*Фізіякратызм* – сацыяльна-філасофскае вучэнне, якое сфарміравалася ў Заходняй Еўропе ў другой палове XVIII ст. (заснавальнік – французскі асветнік Ф. Кеснэ). Першапачаткова фізіякратызм сфарміраваўся як эканамічная тэорыя, у межах якой праводзіўся аналіз гаспадарчага развіцця краін, і ў якасці асновы гэтага развіцця пастуліравалася капіталізаваная сельская гаспадарка, якая адзіная ў стане ствараць дадатковы натуральны прадукт. У далейшым ідэі фізіякратызму распаўсюдзіліся на аналіз больш шырокага поля сацыяльнай рэчаіснасці. Усе з'явы прыроднай, сацыяльнай і духоўнай рэальнасці тлумачацца на аснове нязменных *натуральных законаў*. Галоўнай задачай становіцца пры гэтым навуковае выяўленне дадзеных натуральных законаў на аснове механістычных і матэматычных прынцыпаў. Фізіякраты лічылі сябе адкрывальнікамі новай метанавукі, якая ў стане закласці трывалы фундамент чалавечага прагрэсу. У аснове сацыяльнай філасофіі фізіякратызму знаходзіліся наступныя ідэі:

| *Ідэя натуральнага права* | *Ідэя грамадскага дагавору* |
|---|---|
| У аснове ўсіх форм чалавечай жыццядзейнасці знаходзяцца прыроджаныя і нязменныя натуральныя законы, якія задаюць накірунак сацыяльнаму развіццю. | Фарміраванне і функцыянаванне інстытуцыяналізаваных форм грамадскага жыцця звязваецца з добраахвотным калектыўным дагаворам паміж людзьмі з мэтай узаемнай бяспекі і абароны натуральных правоў. |

Распаўсюджанне фізіякратызму ў ВКЛ у значнай ступені было звязана з дзейнасцю Адукацыйнай камісіі. Ідэі гэтага вучэння лічыліся найбольш яскравым ўвасабленнем асветніцкай рацыянальнасці. Адным з першых яго папулярызатараў у ВКЛ быў віленскі біскуп *Ігнацій Якуб Масальскі* (1729 – 1794 гг.), які з'яўляўся першым старшынёй Адукацыйнай камісіі (1773 – 1780 гг.).

Асноўнымі прадстаўнікамі фізіякратызму ў філасофскай думцы Беларусі з'яўляліся *Геранім Страйноўскі, Іахім Храптовіч, Тадэвуш Млоцкі, Канстанцін Багуслаўскі, Міхал Францішак Карповіч.*

***Геранім Страйноўскі*** (1752 – 1815 гг.) – выкладчык матэматыкі, логікі, метафізікі, натуральнага і палітычнага права, права народаў і палітычнай эканоміі ў Варшаўскім "Калегіум нобіліум" (1776 – 1780 гг.), прафесар натуральнага права ў Галоўнай школе ВКЛ (1781 – 1787 гг.), дзеяч Адука-

цыйнай камісіі; рэктар Галоўнай Віленскай школы (Віленскага універсітэта) (1799 – 1806 гг.). Каталіцкі біскуп ламбезітанскі і каад'юнтар біскупа луцкага (1806 – 1808 гг.), адміністратар Віленскага біскупства (1808 – 1814 гг.), біскуп віленскі (1814 – 1815 гг.). Галоўны твор – "Навука аб прыродным і палітычным праве, палітычнай эканоміі і праве народаў" (1789 г.). Г. Страйноўскі імкнуўся пабудаваць на базе фізіякратызму паслядоўную інтэлектуальную сістэму, якая інтэгравала б у сабе ўсю праблематыку сацыяльных дысцыплін.

Г. Страйноўскі пастуліруе наяўнасць нязменных універсальных натуральных законаў і натуральнага парадку рэчаў. Іх анталагічны статус вызначаецца шляхам спасылкі на Бога як на творцу і першапрычыну прыроды. Натуральны (прыродны) парадак разглядаецца як аснова маральнага парадку, які таксама мае універсальны характар. У чалавечай жыццядзейнасці натуральныя законы дзейнічаюць праз базавыя чалавечыя патрэбы: імкненне да самазахавання, задавальненне патрэбаў у ежы, адзенні, жыллі, прыладах працы. Маральныя законы грунтуюцца на вечных і нязменных правах асабістай свабоды, узаемнай дапамогі і прыватнай уласнасці. У адрозненне ад большасці тэарэтыкаў натуральнага права, якія лічылі, што натуральны стан папярэднічаў узнікненню грамадства, Г. Страйноўскі лічыў натуральным для чалавека грамадскае жыццё, паколькі яно адпавядае чалавечай прыродзе і з'яўляецца натуральнай неабходнасцю. Узнікненне дзяржавы звязваецца з грамадскім дагаворам, які стаў адказам на неабходнасць удасканалення ўнутранай і знешняй бяспекі і аховы ўласнасці ва ўмовах узрастання колькасці насельніцтва, росту маёмаснай дыферэнцыяцыі і канфліктаў на гэтай глебе. Прынцыпы натуральнага і маральнага парадку Г. Страйноўскі разглядаў як крытэрыі ацэнкі грамадска-палітычнага ладу. Сацыяльныя канфлікты і катаклізмы ўзнікаюць па прычыне таго, што людзі пэўным чынам адхіляюцца ад універсальнага натуральнага і маральнага парадку. Прычынай такога адхілення абвяшчаюцца памылкі і забабоны чалавечага розуму. Галоўнай рухаючай сілай сацыяльнага развіцця, здольнай прывесці грамадска-палітычны лад у адпаведнасць з натуральным правам, лічыцца розум; усеагульная асвета разглядаецца як сродак пераадолення памылак і забабонаў. Формай дзяржаўна-палітычнага ўладкавання, якая, паводле Г. Страйноўскага, найбольш набліжана да натуральнага права, абвяшчаецца канстытуцыйная манархія на чале з "асвечаным манархам".

***Іахім Храптовіч*** (1729 – 1812 гг.) – дзяржаўна-палітычны дзеяч: вялікі сакратар ВКЛ (1764 – 1773 гг.), падканцлер ВКЛ (1773 – 1793 гг.), канцлер ВКЛ (1793 – 1795 гг.), член Пастаяннай рады Рэчы Паспалітай (1775 – 1789 гг.), міністр замежных спраў Рэчы Паспалітай (1791 – 1792 гг.),

кіраўнік дэпартамента школ ВКЛ у складзе Адукацыйнай камісіі (1773 – 1792 гг.). Арганізатар сацыяльна-эканамічнай рэформы ва ўласных маёнтках Шчорсы і Вішнева. Асноўныя працы: “Аб штогадовым нацыянальным узнаўленні” (1802 г.), “Аб натуральным праве” (1814 г.). У аснове філасофскага вучэння І. Храптовіча знаходзіцца тэорыя натуральнага права. Грамадства разглядаецца як працяг прыроды, яе разумная частка. Жыццё грамадства павінна абапірацца на натуральны парадак рэчаў, ад якога цалкам залежыць маральны парадак, абумоўлены выкананнем членамі грамадства асноўных правоў і абавязкаў, якія вынікаюць з самой прыроды. Маральныя прынцыпы, якія маюць крыніцу ў самой прыродзе, адпавядаюць таму, што карысна і неабходна чалавеку ў жыцці. Сацыяльная няроўнасць не супярэчыць натуральнаму і маральнаму парадку, паколькі вызначае для кожнага чалавека яго натуральную функцыю ў грамадстве. Для забеспячэння сацыяльнага парадку людзі ўстанаўліваюць дзяржаву і права шляхам грамадскага дагавору. Узровень развіцця кожнай канкрэтнай дзяржавы вызначаецца яго блізкасцю да натуральнага права. І. Храптовіч сцвярджае, што эканамічнае і культурнае развіццё грамадства прадугледжвае найбольш поўную рэалізацыю здольнасцяў чалавека, а гэта магчыма толькі пры наяўнасці ў яго некаторых правоў, звязаных з выкананнем пэўных грамадскіх абавязкаў. На гэтай аснове сцвярджалася неабходнасць замацавання за кожным саслоўем пэўных грамадзянскіх правоў.

***Канстанцін Багуслаўскі*** (1754 – 1819 гг.) – выкладчык піярскіх школ на Валыні і ў Варшаве (1771 – 1789 гг.), прафесар Галоўнай школы ВКЛ (з 1789 г.). Доктар тэалогіі (1788 г.). Асноўная праца – “Пра дасканалае заканадаўства” (1786 г.). У дадзеным творы сцвярджаецца падзел свету на дзве часткі:

1) тое, што не надзелена розумам і воляй; функцыяніруе паводле створаных Богам натуральных законаў;

2) тое, што надзелена розумам і воляй; з’яўляецца зменлівым і можа адпавядаць ці не адпавядаць нязменным натуральным законам.

Чалавек разглядаецца як дваістая істота: тое ў ім, што звязана з дзейнасцю цела, дэтэрмінавана законамі прыроды; тое, што зыходзіць ад розуму і волі, можа адпавядаць або не адпавядаць натуральным законам і змяняцца ў залежнасці ад заканадаўства, адукацыі, грамадскай думкі. Грамадска-палітычны лад у той ці іншай дзяржаве ацэньваўся ў залежнасці ад яго адпаведнасці натуральнаму праву. Палітычным ідэалам К. Багуслаўскага выступае асветная спадчынная канстытуцыйная манархія. Недасканаласць дзяржаўнай сістэмы звязваецца з нізкім інтэлектуальным узроўнем грамадства. У сувязі з гэтым праблема рэфармавання дзяржаўна-прававой сістэмы цесна звязваецца з неабходнасцю асветы.

***Тадэвуш Млоцкі*** (каля 1745 – 1812 гг.) – філосаф, грамадска-палітычны дзеяч. Аўтар працы “Пасведчанне з вытокаў натуральнага права” (1799 г.). Натуральнае права разглядаецца як усё тое, што чалавечы розум прадпісвае людзям для надзейнага і ўпэўненага іх руху да мэты, якую яны сабе ставяць або павінны ставіць. Такой канчатковай мэтай, паводле Т. Млоцкага, з’яўляецца шчасце. Таму чалавек мае права на супраціўленне тым сацыяльным і палітычным сілам, якія ён лічыць ненатуральнымі і не адпаведнымі шчасцю большасці.

***Міхал Францішак Карповіч*** (1744 – 1803 гг.) – выкладчык філасофіі, тэалогіі і царкоўнай гісторыі ў Варшаўскай, Кракаўскай і Віленскай семінарыях ордэна місіянераў (1767 – 1774 гг.); прафесар дагматычнай тэалогіі ў Галоўнай школе ВКЛ (1783 – 1794 гг.). Як каталіцкі святар набыў шырокую вядомасць сваімі казаннямі. У іх М. Ф. Карповіч сцвярджае ідэю натуральнага права, з якой, на яго думку, вынікае тое, што ўсе людзі нараджаюцца роўнымі і свабоднымі. Дзяржава ўзнікае ў выніку грамадскага дагавору для захавання бяспекі і ўстанаўлення справядлівасці ў грамадстве шляхам фарміравання права і яго строгага выканання. Натуральнае права з’яўляецца крытэрыем ацэнкі форм грамадска-палітычнага ладу. На гэтай аснове крытыкуецца прыгоннае права як антынатуральная з’ява, якая вядзе дзяржаву да гібелі. Асвета і навука разглядаюцца як галоўныя фактары рэфармавання грамадства.

Ідэі фізіякратызму аказалі значны ўплыў на грамадска-палітычныя погляды інтэлектуальнай эліты Рэчы Паспалітай і сталі своеасаблівай тэарэтычнай асновай *праектаў рэфармавання грамадства* ў эпоху С. А. Панятоўскага. Прынцып натуральнага права становіцца крыніцай крытыкі заган грамадска-палітычнага ладу Рэчы Паспалітай. У прыватнасці, ён выкарыстоўваецца для крытыкі інстытута прыгоннага права, якая знайшла найбольш паслядоўнае адлюстраванне ў ананімнай працы “Аб польскіх прыгонных” (1788 г.) (як устаноўлена, яе аўтарам з’яўляецца *Юзаф Паўлікоўскі*) і творы прафесара польскай і лацінскай літаратуры Галоўнай школы ВКЛ *Давіда Пільхоўскага* “Адказ на пытанне: няўжо ў мінулыя стагоддзі нячуласць да прыгонных нагэтулькі авалодала сэрцамі палякаў, што нават вучоныя заразіліся ёю, або Дадатак да кнігі “Пра польскіх прыгонных” (1789 г.). У гэтых творах прыгоніцтва асуджаецца як нерацыянальнае грамадскае ўладкаванне, якое не з’яўляецца сацыяльна неабходным і паходзіць са злога намеру. Яго ліквідацыя бачыцца магчымай шляхам асветы і ўстанаўлення справядлівага заканадаўства. Крытыка прыгоннага права з асветніцкіх пазіцый мела месца і пасля ўключэння зямель Беларусі ў склад Расій-

скай імперыі. Найбольш яскравае ўвасабленне гэта знайшло ў працы *Валерыяна Страйноўскага* “Аб пагадненні памешчыкаў з сялянамі” (1808 г.).

Ідэі сацыяльна-палітычнага рэфармавання набылі асаблівы імпульс падчас працы *Чатырохгадовага сойма* (1788 – 1792 гг.). У ВКЛ былі шырока вядомы погляды галоўных ідэолагаў рэформ у Рэчы Паспалітай Гуга Калантая, Станіслава Сташыца, Ігнацы Патоцкага. Іх асноўныя ідэі:

– неабходнасць цэнтралізацыі дзяржаўнай улады і абмежавання магнацкага самавольства;

– абмежаванне ўплыву духавенства на палітычнае жыццё;

– ліквідацыя прыгоннага права.

Галоўным вынікам дзейнасці рэфарматараў становіцца *Канстытуцыя 3 мая 1791 г.* У ёй былі рэалізаваны некаторыя асветніцкія рэфарматарскія ідэі:

– пераход ад элекцыйнай да спадчыннай манархіі;

– пераўтварэнне Сойма ў пастаянна дзеючы двухпалатны заканадаўчы орган улады, дэпутаты якога выбіраюцца шляхтай на мясцовых сойміках на 2 гады;

– адмена права лібэрум вета, забарона шляхецкіх канфедэрацый і рокашаў;

– скасаванне пажыццёвасці дзяржаўных пасад; выбарнасць мясцовай адміністрацыі на сойміках;

– абвяшчэнне свабоды веравызнання з захаваннем пануючага статуса каталіцызму, перавод епіскапата на дзяржаўнае ўтрыманне;

– павышэнне грамадска-палітычнага статуса мяшчанства: гарантыя асабістай недатыкальнасці, права набыцця зямлі, займання ніжэйшых адміністрацыйна-судовых і царкоўных пасад, атрымання шляхецтва за дзяржаўную і ваенную службу; дзяржаўныя гарады атрымлівалі абмежаванае прадстаўніцтва ў Сойме з правам дарадчага голасу;

– дэклараванне апекі права і дзяржавы над сялянамі.

Канстытуцыя 3 мая 1791 г. рэпрэзентавала мадэль парламенцкай канстытуцыйнай манархіі. Але разам з тым яна мела кампрамісны характар: гарантаваліся непарушнаць усіх шляхецкіх правоў і прывілеяў, карпаратыўнасць і адзінаўладдзе шляхецкага саслоўя, пануючае становішча каталіцкай канфесіі, захаванне прыгоннага права. У 1792 г. у сувязі з расійскай акупацыяй і захопам улады Таргавіцкай канфедэрацыяй Канстытуцыя 3 мая была скасавана.

Другі падзел Рэчы Паспалітай і паўстанне 1794 г. прывялі да фарміравання *радыкальнага накірунку* ў грамадска-палітычнай думцы Беларусі. Для яго характэрна адмаўленне канцэпцыі шляхецкай дзяржавы і сцвяр-

джэнне ідэі бессаслоўнага грамадства, заснаванага на прынцыпах усеагульнай свабоды і роўнасці. Вялікі ўплыў на станаўленне дадзенага накірунку мела рэцэпцыя ідэй Вялікай Французскай рэвалюцыі (1789 – 1799 гг.).

Найбольш значным прадстаўніком радыкальнага накірунку з’яўляецца ***Якуб Ясінскі*** (1761 – 1794 гг.) – адзін з лідэраў паўстання 1794 г. у ВКЛ, кіраўнік радыкальнай плыні “віленскіх якабінцаў”. Аўтар ананімных памфлетаў “Катэхізіс Чалавека”, “Да польскіх выгнаннікаў”, шэрагу літаратурных твораў на палітычную тэматыку, палітычных дакументаў (1793 – 1794 гг.). Я. Ясінскі разглядае паўстанне ў Рэчы Паспалітай як частку глабальнага рэвалюцыйнага пераўтварэння свету, пачатага Французскай рэвалюцыяй. Асноўныя сацыяльна-палітычныя ідэі Я. Ясінскага:

– ліквідацыя саслоўнай структуры грамадства і ўстанаўленне поўнай палітыка-прававой роўнасці ўсіх грамадзян;

– устанаўленне дэмакратычнай рэспублікі;

– адмена прыгоннага права.

Радыкальныя ідэі знайшлі адлюстраванне ў поглядах асветніцкіх дзеячаў пасля падзелаў Рэчы Паспалітай. У першую чаргу гэта праявілася ў творах *Іосіфа Яленскага* і *Сямёна Зяновіча*.

***Іосіф Яленскі*** (1756 – 1811 гг.) – прадстаўнік дробнай шляхты Мазырскага павета. За захаванне “недазволеных рукапісаў” пасля паўстання 1794 г. высланы ў Салавецкі манастыр. У адным з гэтых рукапісаў, напісаным у форме маніфеста караля, абгрунтоўваліся праграмныя патрабаванні аб свабодзе, роўнасці і братэрстве, пастуліравалася адмена саслоўных прывілеяў і прыгоннага права. У другім рукапісе (падробленая прысяга караля, нібыта пацверджаная народам) абвяшчаліся адмена прыгонннага права, свабода веравызнання, роўнасць усіх людзей, выбарнасць усіх дзяржаўных і царкоўных чыноўнікаў. Сцвярджалася адказнасць правіцеляў за захаванне правоў і свабод грамадзян. Дадзеныя ідэі абгрунтоўваліся спасылкамі на раннехрысціянскія прынцыпы свабоды і роўнасці. У няволі І. Яленскі склаў рукапісны твор “Благавешчанне”, у якім пастуліруецца радыкальная перабудова грамадства ў духу найбольш радыкальных асветніцкіх праектаў на наступных прынцыпах: абшчыннае вядзенне гаспадаркі, грамадская ўласнасць на сродкі вытворчасці, усеагульная абавязковая праца і адукацыя, справядлівы падзел матэрыяльных багаццяў, прамая дэмакратыя, гуманізацыя судаводства (у тым ліку адмена пакарання смерцю).

***Сямён Зяновіч*** – аўтар рукапісу “Сапраўднае тлумачэнне правоў чалавека”. На аснове тэорыі натуральнага права С. Зяновіч выступае з крытыкай існуючага грамадства. Ён асуджае самадзяржаўе як форму дзяржаўнага кіравання, сацыяльную няроўнасць, феадальную эксплуатацыю. Сцвярджа-

еццa ідэал свабоднага грамадства на прынцыпах усеагульнай свабоды, роўнасці і братэрства людзей.

*Такім чынам, філасофская і грамадска-палітычная думка Беларусі другой паловы XVIII – першай чвэрці XIX стст. развіваецца ва ўмовах геакультурнай прасторы, сфарміраванай у межах Рэчы Паспалітай. Вызначальны ўплыў на яе развіццё аказалі ідэі Асветніцтва, якія праходзяць эвалюцыю праз этапы Перадасветніцтва, класічнага і позняга Асветніцтва. Характэрнымі рысамі асветніцкай філасофіі Беларусі з'яўляюцца рэцэптыўны характар і кампраміснасць. Яе асноўнымі праблемамі выступаюць пытанні логікі і гнасеалогіі, метадалогіі навуковага прыродазнаўства. У сацыяльна-палітычнай думцы асноўным накірункам становіцца фізіякратызм, які разглядае грамадскія праблемы на аснове прынцыпаў натуральнага права і грамадскага дагавора.*

## Кантрольныя пытанні да тэмы 4

1. У якіх гістарычных умовах адбывалася развіццё філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі другой паловы XVIII – пачатку XIX стст.?

2. Якія змены адбываліся ў адукацыйнай сістэме ВКЛ у другой палове XVIII ст.?

3. Вызначце асноўныя прынцыпы асветніцкай філасофіі.

4. Параўнайце характар асветніцкай філасофіі ў ВКЛ і краінах Заходняй Еўропы.

5. Якія фактары паўплывалі на распаўсюджанне асветніцкіх ідэй у ВКЛ?

6. Назавіце спецыфічныя рысы асветніцкай філасофіі на тэрыторыі Беларусі.

7. Якімі асаблівасцямі вызначаецца эклектычная філасофія Перадасветніцтва?

8. Назавіце асноўных прадстаўнікоў эклектычнай філасофіі ВКЛ і прааналізуйце іх філасофскія погляды.

9. Якія асноўныя накірункі вылучаюцца ў межах філасофіі класічнага і позняга Асветніцтва?

10. Дайце характарыстыку логіка-гнасеалагічнай канцэпцыі К. Нарбута.

11. Як вырашаецца праблема пазнання ў філасофскіх творах А. Доўгірда?

12. На якіх прынцыпах базавалася філасофія і метадалогія навуковага прыродазнаўства ў асветніцкай філасофіі Беларусі?

13. Назавіце асноўных прадстаўнікоў накірунка, звязанага з даследаваннем праблем навуковага прыродазнаўства ў філасофскай думцы Беларусі перыяду Асветніцтва.

14. Якая канцэпцыя філасофіі прадстаўлена ў творах Я. Снядэцкага?

15. У творах якіх мысліцеляў ВКЛ праяўляліся перадасветніцкія сацыяльна-палітычныя ідэі?

16. Што такое фізіякратызм? Якія яго асноўныя ідэі?

17. У чым заключаецца сутнасць ідэй натуральнага права і грамадскага дагавора?

18. Назавіце асноўных прадстаўнікоў фізіякратызму ў грамадска-палітычнай думцы Беларусі.

19. Параўнайце сацыяльна-палітычныя канцэпцыі Г. Страйноўскага і І. Храптовіча.

20. Якім чынам ідэі фізіякратызму паўплывалі на станаўленне праектаў рэфармавання грамадства Рэчы Паспалітай у 1760-я – 1790-я гг.?

21. Якія асветніцкія сацыяльна-філасофскія ідэі былі рэалізаваны ў Канстытуцыі Рэчы Паспалітай 3 мая 1791 г.?

22. У чым заключаецца спецыфіка радыкальнага накірунку ў асветніцкай грамадска-палітычнай думцы?

23. Ахарактарызуйце асноўныя рысы праекта радыкальнага пераўладкавання грамадства ў працах І. Яленскага і С. Зяновіча.

## ТЭМА 5. ПЕРЫЯД РАМАНТЫЗМУ (1820-я – 1850-я гг.)

### Гістарычныя ўмовы развіцця філасофскай і грамадска-палітычнай думкі

У сферы сацыяльна-эканамічных адносін у дадзены перыяд меў месца крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы і зараджэнне капіталістычнага ўкладу ў сельскай гаспадарцы, прамысловасці і гандлі.

У сферы сацыяльна-палітычных адносін адбывалася ўмацаванне царскага абсалютысцкага рэжыму Расійскай імперыі на землях Беларусі, што адлюстроўвалася ва ўзмацненні русіфікатарскай палітыкі, асабліва пасля падаўлення паўстання 1830 – 1831 гг. (русіфікацыя адміністрацыі, землеўладання, адукацыі, ліквідацыя уніяцтва, адмена правамоцнасці Статута ВКЛ 1588 г., увядзенне назвы “Паўночна-Заходні край” для тэрыторый Беларусі і Літвы і г. д.), устанаўленні жорсткага паліцэйска-бюракратычнага кантролю ў розных сферах жыцця грамадства.

У сферы духоўнага жыцця адбываліся наступныя працэсы:

1) Праваслаўе канчаткова пераўтвараецца ў пануючую канфесію на землях Беларусі; у 1839 г. была ліквідавана уніяцкая царква, а яе вернікі прымусова пераведзены ў праваслаўе; устаноўлены некаторыя абмежаванні для каталіцкай царквы.

2) Ліквідацыя сістэмы класічнай вышэйшай адукацыі: у 1820 г. распушчана Полацкая езуіцкая акадэмія, у 1832 г. – Віленскі універсітэт (у 1848 г. на базе Горы-Горацкай земляробчай школы, заснаванай у 1840 г., узнікае аграрна-тэхнічная вышэйшая навучальная ўстанова – Горы-Горацкі земляробчы інстытут), а таксама ліквідацыя ўсіх канфесійных навучальных устаноў каталіцкіх і уніяцкіх манаскіх ордэнаў.

3) Русіфікацыя ў галіне адукацыі і друку пры фактычным захаванні пераважнай ролі польскамоўнай культуры ў духоўным жыцці краю.

4) Вядучым стылем розных форм духоўнай культуры становіцца *рамантызм*.

5) Узрастанне зацікаўленасці ў даследаванні традыцыйнай народнай культуры сярод інтэлектуальнай эліты зямель былога ВКЛ, што прыводзіць да фарміравання ідэйна-тэарэтычных перадумоў беларускай нацыянальнай ідэі.

## Спецыфічныя рысы філасофскай і грамадска-палітычнай думкі ў 1820-х – 1850-х гг.

Філасофская і грамадска-палітычная думка Беларусі ў разглядаемы перыяд развіваецца пад уплывам агульнаеўрапейскай філасофскай культуры, да якой таксама ў гэты час далучаецца Расія. Вызначальны ўплыў на развіццё філасофскай і грамадска-палітычнай думкі мае ідэалогія рамантызму. Істотным фактарам яе развіцця становяцца таксама ідэі нямецкай класічнай філасофіі.

*Рамантызм* – агульнаеўрапейскі культурны рух першай паловы XIX ст., які ўзнікае як рэакцыя на крызіс рацыяналістычных ідэй Асветніцтва пасля Вялікай Французскай рэвалюцыі. Першапачаткова рамантызм афармляецца як стыль у мастацкай культуры, пазней ахоплівае філасофію і грамадска-палітычную думку. У межах рамантызму ажыццяўляецца крытыка новай індустрыяльнай цывілізацыі і рацыяналістычнага светапогляду, арыентаванага на дакладныя навукі. У супрацьвагу гэтаму сцвярджаецца ідэал цэласнага развіцця асобы і сацыяльнай гармоніі. Пры гэтым адлюстроўваецца расчараванне ў асветніцкай ідэі сацыяльнага аптымізму, у сувязі з чым характэрнай выступае апалогія гістарычнага мінулага. Гэта прыводзіць да ўзрастання зацікаўленасці традыцыйнай культурай. У межах культуры рамантызму існавалі два накірункі: кансерватыўны і радыкальна-бунтарскі.

*Філасофія рамантызму* грунтавалася на наступных прынцыпах:

– *антрапалагізм* – прынцып, згодна з якім цэнтральнай праблемай філасофскай рэфлексіі становіцца чалавечая асоба ва ўсёй сукупнасці праяў яе існавання;

– *абмежаванне рацыяналізму* – прынцып, згодна з якім розум перастае разглядацца як галоўная характарыстыка свету і чалавека і адбываецца адыход філасофіі ад арыентацыі на прыродазнаўчыя веды;

– *сацыяльны утапізм* – адмаўленне наяўнай сацыяльнай рэчаіснасці пры дапамозе стварэння нерацыяналістычных сацыяльных праектаў, у якіх адлюстроўвалася творчае стаўленне асобы да свету (дадзеныя праекты або грунтаваліся на ідэалізацыі традыцыйнага грамадства, або сцвярджалі асабістыя ідэалы аўтараў, адарваныя ад сацыяльнай рэчаіснасці).

Акрамя рамантызму, на філасофскую і грамадска-палітычную думку Беларусі ў 1820-я – 1850-я гг. значны ўплыў мелі ідэі нямецкай класічнай філасофіі, асабліва гегельянства. *Нямецкая класічная (трансцэндэнтальна-крытычная) філасофія* сфарміравалася ў апошняй трэці XVIII – першай трэці XIX стст. Таксама, як і філасофія рамантызму, яна ўяўляла сабой інтэлектуальную рэакцыю на ідэі Асветніцтва. Аднак пры гэтым, у адрозненне ад рамантызму, нямецкая класічная філасофія мела пераважна рацыяналістычны характар і грунтавалася на наступных асноўных прынцыпах:

– *філасофскі крытыцызм* – сцвярджэнне філасофіі як спецыфічнага элемента культуры, які павінен ажыццяўляць крытычную рэфлексію ў адносінах да ўсіх сфер чалавечай жыццядзейнасці;

– *дыялектычнасць* – арыентацыя на разуменне ўсіх сфер рэальнасці як цэласнага, узаемазвязанага і паступовага працэса развіцця;

– *гістарызм* – арыентацыя на разгляд грамадства як складанай сістэмы, якая знаходзіцца ў працэсе пастаяннага змянення і развіцця.

На развіццё філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі ў 1820-я – 1850-я гг. адмоўны ўплыў мелі знешнія сацыякультурныя фактары. Закрыццё Полацкай езуіцкай акадэміі ў 1820 г. і Віленскага універсітэта ў 1832 г. прывяло да ліквідацыі прафесійнай філасофскай адукацыі на землях былога ВКЛ. З 1830-х гг. філасофскія і грамадска-палітычныя ідэі артыкулююцца толькі ў часопісах і іншых выданнях, якія не маюць спецыялізаванага філасофскага характару. Гэта прыводзіць да спынення традыцыі сістэматычнага даследавання філасофскіх праблем.

У 1820-я гг., яшчэ падчас існавання Віленскага універсітэта, адбываецца працэс адыходу ў філасофскай думцы Беларусі ад асветніцкага рацыяналізму. Гэты працэс на землях былога ВКЛ назіраецца некалькі запознена ў сувязі з меншай вастрынёй тут тых праблем, якія прывялі да фарміравання ідэалогіі рамантызму ў заходнееўрапейскай культуры.

*Спецыфічныя рысы філасофскай думкі Беларусі 1820-х – 1850-х гг.:*

– рэцэптыўнасць у адносінах да заходнееўрапейскіх філасофскіх сістэм рамантызму і гегельянства;

– пераважная акцэнтуацыя антрапалагічных, этычных і сацыяльна-філасофскіх ідэй;

– фарміраванне ідэйна-тэарэтычных перадумоў беларускай нацыянальнай ідэі.

Фарміраванне ідэй рамантызму ў філасофскай думцы Беларусі звязана перш за ўсё з такой з'явай філасофскай культуры, як *антрапалагічны паварот* – пераарыентацыя філасофскай думкі на праблему чалавека; пры гэтым чалавек разглядаецца не толькі як рацыянальная істота, а складаны шматузроўневы феномен. У філасофскай культуры пачынаюць даследавацца такія пытанні, як сутнасць чалавечай асобы, сэнс чалавечай гісторыі, прызначэнне пэўных народаў у гісторыі. Пры гэтым на другі план адыходзяць анталогія, гнасеалогія і метадалогія навукі.

### *Асноўныя прадстаўнікі філасофіі рамантызму*

***Эмануэль Ляхніцкі*** (1793 – 1826 гг.) – прафесар філасофіі Віленскага універсітэта (з 1815 г.). У 1816 – 1818 гг. выдаваў часопіс "Магнетычны дзённік" ("Pamiętnik magnetyczny"), у якім выказваў свае асноўныя філасофскія ідэі. Аўтар працы "Паведамленне аб спосабе лячэння вар'яцтва праз магнетычнае яснабачанне" (1821 г.). Філасофскія ідэі Э. Ляхніцкага носяць пераходны характар ад Асветніцтва да рамантызму. З аднаго боку, у іх дэкларуецца прызнанне прынцыпаў асветніцкай філасофіі; з другога – адбываецца выхад за іх межы, што прыводзіць да палемікі Э. Ляхніцкага з філосафамі-асветнікамі ў Віленскім універсітэце (А. і Я. Снядэцкія). Асноўныя палажэнні філасофіі Э. Ляхніцкага:

– пастуліраванне прынцыпу агульнага дабра як каштоўнасці, якая рэалізуецца пераважна на мікрасацыяльным узроўні;

– аддзяленне філасофіі ад прыватных прыродазнаўчых навук, якія тлумачацца толькі як інструментальныя сродкі практычнай дзейнасці;

– крытычнае пераасэнсаванне і абмежаванне статусу розуму пры даследаванні чалавечай жыццядзейнасці;

– акцэнтуацыя феномена *надзвычайнага*, пад якім разумеецца тое, што пакуль не пазнана. У кантэксце гэтага тлумачылася з'ява "натуральнага магнетызму" як універсальная прыродная ўласцівасць, недаступная сродкам і метадам навуковага пазнання.

***Юзэф Войцех Галухоўскі*** (1797 – 1858 гг.) – выкладчык філасофіі і права ў Варшаўскім універсітэце (1821, 1823 гг.), Віленскага універсітэта (1823 – 1824 гг.). Звольнены з Віленскага універсітэта па падазрэнні ў палітычнай нелаяльнасці. Доктар філасофіі (1821 г.). З 1845 г. жыў у эміграцыі.

Аўтар твораў “Філасофія ў дачыненні да жыцця цэлых народаў і асобнага чалавека” (1822 г.), “Роздумы…” (1858 г.). Філасофія Ю. Галухоўскага акцэнтавана скіравана супраць ідэй Асветніцтва. Апошнія трактуюцца ім як пустыя і павярхоўныя спекуляцыі, а сама эпоха Асветніцтва – як “цёмныя часы”. Філасофскае вучэнне Ю. Галухоўскага ўключае наступныя ідэі:

1) Крытыка рацыяналізму: у аснове быцця і пазнання знаходзіцца не розум, а г. зв. *праадзінства*, пад якім разумеецца глыбінная анталагічная аснова свету, што адлюстроўвае яго завершанасць і гарманічнасць. Галоўным інструментам пазнання гэтага праадзінства выступае непасрэдная інтуіцыя, задачай якой з’яўляецца паглыбленне ў таямніцу як асобнага прадмета, так і ўсяго свету.

2) Перагляд прадмета філасофіі: у яго ўключаецца ўсё тое, “што верагодна можа знайсціся (...) ва ўнутраным вопыце асобы”. Галоўнай задачай філасофіі з’яўляецца пошук у гэтым вопыце ідэі боскага, якая здольна даць чалавеку надзейны фундамент пазнання “праадзінства” свету. Ідэя боскага з’яўляецца “незнішчальнай сутнасцю” чалавека і праяўляецца як у індывідуальным жыцці, так і ў жыцці цэлых народаў і ў гісторыі ў цэлым.

3) Разгляд канкрэтных навук як аперацыянальных інструментаў, якія маюць адносіны з асобнымі фрагментамі рэчаіснасці. Метад працы з гэтымі фрагментамі абапіраецца на аналіз разнастайных прычынна-выніковых сувязяў. Аднак дадзены метад не здольны вырашаць светапоглядныя пытанні; пры спробе такога вырашэння ён толькі стварае антыноміі.

4) Сцвярджэнне ідэі мудрасці, у аснове якой знаходзіцца інтуітыўнае пранікненне ў сутнасць свету. Дадзеная ідэя павінна стаць асновай ісціннай філасофіі.

## Ідэі гегельянства ў філасофскай думцы Беларусі

Распаўсюджанне філасофскіх ідэй Гегеля на землях былога ВКЛ пачынаецца з канца 1830-х гг., ужо пасля закрыцця Віленскага універсітэта. Асяродкам іх распаўсюджання становіцца перыядычны друк, галоўным чынам – віленскія часопісы “Звязда” („Gwiazda”), “Навукова-літаратурны дзённік” („Pamiętnik naukowo-literacki”), “Атэнэум” („Ateneum”).

### *Асноўныя прадстаўнікі гегельянства*

***Юзэф Быхавец*** (1778 – 1845 гг.) – выпускнік Віленскага універсітэта. З 1815 г. жыў і працаваў у Вільні. Знаходзіўся пад моцным уплывам спачатку кантыянства, а потым гегельянства. Пераклаў на польскую мову шэраг прац І. Канта. Аўтар працы “Ідэі да філасофіі гісторыі чалавека” (1838 г.), у якой абгрунтоўваецца гегелеўская ідэя развіцця чалавечай гісторыі. Ю. Быхавец разглядае развіццё прыроды і грамадства як натуральны гістарычны працэс, які мае сваю канечную мэту – рэалізацыю ідэала гуманнасці.

***Фларыян Бохвіц*** (1799 – 1856 гг.) – выпускнік юрыдычнага факультэта Кіеўскага універсітэта; працаваў адвакатам у Навагрудку. Аўтар прац “Форма майго мыслення” (1838 г.), “Сутнасць майго мыслення” (ч. 1 – 2, 1838 – 1841 гг.), “Асновы маіх думак і пачуццяў” (1842 г.), “Думкі пра выхаванне чалавека” (1847 г.). Фундаментам яго філасофскіх ідэй з’яўляецца прынцып развіцця як універсальны прынцып быцця. На яго аснове сцвярджаецца наяўнасць прагрэса ва ўсіх сферах грамадскага жыцця: тэхніцы, навуцы, маралі, гісторыі, філасофіі, палітыцы і праве. Прагрэс разумеецца як паступальны дыялектычны працэс, у якім вялікая роля належыць пераемнасці, сувязі з мінулым. Фактары прагрэсу трактуюцца тэлеалагічна: у ім бачыцца рух, накіраваны на рэалізацыю мэты, закладзенай Абсалютнай ідэяй як дынамічнай першаасновай усяго існуючага. Сацыяльны прагрэс Ф. Бохвіц разглядае як пастаяннае ўдасканаленне прылад працы, рост сувязяў паміж людзьмі, паміж асобай і грамадствам. У перспектыве гэта павінна прывесці да стварэння адзінага культурна-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага грамадскага арганізма. У той жа час Ф. Бохвіц крытыкуе рэвалюцыі як дэстабілізуючы фактар сацыяльнага жыцця, які супярэчыць прынцыпу паступальнасці і пераемнасці ў ходзе развіцця.

## Грамадска-палітычная думка

Грамадска-палітычная думка Беларусі 1820-х – 1850-х гг., таксама як і філасофская, развівалася ў кантэксце станаўлення ідэй рамантызму. Яна становіцца ў значнай ступені адлюстраваннем крызісу асветніцкай ідэалогіі. Пад уплывам рамантызму фарміруюцца супрацьлеглыя сацыяльна-палітычныя ідэалогіі: кансерватызм і рэвалюцыйны месіянізм. Нягледзячы на супрацьлегласць дадзеных ідэалогій, іх аб’ядноўвае крытыка асветніцкага рацыяналізму пры аналізе грамадска-палітычных пытанняў.

*Кансерватызм* – сацыяльна-палітычнае вучэнне, для якога характэрна адмоўнае стаўленне да хуткіх змен і наваўвядзенняў, абсалютызацыя фактару стабільнасці ў грамадстве. Як сістэматызаваная палітычная ідэалогія кансерватызм фарміруецца ў Заходняй Еўропе на мяжы XVIII – XIX стст. у якасці рэакцыі на ідэі Асветніцтва і Вялікай Французскай рэвалюцыі (асноўныя прадстаўнікі: Ж. дэ Местр, Э. Берк, Ф. Шатобрыян, Л. дэ Банальд). У межах кансерватызму крытыкуюцца асветніцкія ідэі натуральнага права, грамадскага дагавора, суверэнітэта народа і правоў чалавека. Асноўныя ідэі кансерватызму:

– абарона рэлігійнай веры у супрацьвагу асветніцкаму культу розуму;

– традыцыяналізм;

– клерыкалізм;

– апалогія іерархічнага падзелу грамадства;

– прыярытэт калектыўных каштоўнасцяў насуперак індывідуалізму.

Станаўленне ідэй кансерватызму на землях Беларусі адбываецца яшчэ ў перыяд позняга Асветніцтва, у межах канфесійных адукацыйных устаноў. Важную ролю ў дадзеным кантэксце адыгралі ідэі, якія прапагандаваліся ў перыядычным выданні Полацкай езуіцкай акадэміі "*Полацкі штомесячнік*" (1818 – 1820 гг.) (артыкулы полацкіх езуітаў былі, як правіла, ананімнымі). Іх кансерватыўная скіраванасць выяўлялася ў крытыцы асветніцкага рацыяналізму (да яго спадкаемцаў залічвалася таксама нямецкая класічная філасофія), абароне ад крытыкі каталіцкай царкоўнай гісторыі (абвяржэнне асветніцкіх "міфаў" пра Галілея, інквізіцыю, Варфаламееўскую ноч і г. д.), абароне тэалагічнай канцэпцыі гісторыі.

Значным прадстаўніком ранняй кансерватыўнай думкі Беларусі з'яўляецца *Ігнат Лабажэўскі* (каля 1750 – 1826 гг.) – аўтар прац "Належная павага да каранаванай асобы" (1818 г.), "Палітычныя разважанні хрысціяніна" (1819 г.), "Алтары і троны" (1823 г.). У іх ён крытыкуе асветніцкія ідэі і праведзеныя ў згодзе з імі сацыяльна-палітычныя рэформы ў Рэчы Паспалітай падчас каралявання С. А. Панятоўскага. Апошнія, на думку І. Лабажэўскага, сталі галоўнай прычынай развалу Рэчы Паспалітай. У супрацьвагу асветніцкім ідэям сцвярджаюцца прынцыпы традыцыяналізму і клерыкалізму.

Шырокае распаўсюджанне ідэі кансерватызму набываюць пасля паражэння паўстання 1830 – 1831 гг. Найбольш значным асяродкам іх развіцця ў 1830-я – 1850-я гг. становіцца г. зв. "*Пецярбургскі гурток*" – інтэлектуальны гурток пісьменнікаў і публіцыстаў – выхадцаў з зямель былога ВКЛ і Украіны – у Пецярбурзе. Друкаваным органам гуртка быў "Пецярбургскі штотыднёвік" ("Tygodnik Petersburgski", 1830 – 1856 гг.).

Асноўныя прадстаўнікі "Пецярбургскага гуртка" – пісьменнік *Генрых Ржавускі*, крытык *Міхал Грабоўскі* (1805 – 1863 гг.), арцыбіскуп магілёўскі *Ігнат Галавіньскі* (1807 – 1855 гг.), выдавец *Іосіф Пшэцлаўскі* (1799 – 1879 гг.).

***Генрых Ржавускі*** (1791 – 1866 гг.) – пісьменнік і публіцыст. Аўтар прац "Мешаніна традыцый" (1841 г.), "Маральныя і палітычныя эсэ" (1847 г.), "Інтэлектуальныя падарожжы" (1851 г.). У аснове сацыяльна-палітычнай канцэпцыі Г. Ржавускага знаходзілася ідэя нязменнасці грамадскага быцця. Натуральнымі прынцыпамі арганізацыі грамадства абвяшчаюцца іерархічнасць, непахіснасць традыцый і рытуалаў як элементаў салідарызацыі грамадства, сакральнасць уладных палітычных інстытутаў і асоб, якія ажыццяўляюць уладу. Г. Ржавускі адмаўляе ідэю свабоды як натуральнага права. Свабода асобы вызначаецца не знешнімі, а ўнутранымі фактарамі; яна

змяшчаецца ў духу чалавека і з’яўляецца прывілеем, які дадзены толькі некаторым. Спрадвечнымі формамі грамадскага жыцця, якія адпавядаюць чалавечай прыродзе, абвяшчаюцца патрыярхальныя персаналістычныя адносіны. У іх Г. Ржавускі бачыць вышэйшую форму сувязі паміж людзьмі, паколькі яны грунтуюцца на натуральнай іерархіі. На вяршыні іерархіі павінна знаходзіцца арыстакратыя, якая разглядаецца як гарант вышэйшых маральных пачаткаў і сапраўдны суб’ект гістарычнага працэсу. Арыстакратыя выступае ў якасці носьбіта “духа” нацыі; яе роля заключаецца ў тым, каб ахоўваць статычныя формы грамадскага жыцця і не дапускаць развіцця “штучных”, “надуманых” форм і элементаў. У сувязі з гэтым сцвярджалася небяспека любых перамен устойлівага парадку, якія змяняюць традыцыйныя формы грамадскага жыцця. Індустрыяльнае капіталістычнае развіццё заходніх краін разглядаецца як выраджэнне натуральных прынцыпаў арганізацыі грамадства. На аснове сваёй сацыяльна-палітычнай тэорыі Г. Ржавускі выступае з апалогіяй расійскага абсалютысцкага рэжыму, сістэмы прыгонніцтва і крытыкуе польскі нацыянальна-вызваленчы рух.

Другім асяродкам распаўсюджання ідэй кансерватызму становіцца часопіс “*Рубон*”, які выдаваўся ў Вільні ў 1842 – 1849 гг. Ідэйны натхняльнік і выдавец часопіса – гісторык, пісьменнік і публіцыст *Казімір Буйніцкі* (1788 – 1878 гг.). У гэтым выданні прапагандаваліся панславісцкія і славянафільскія ідэі, крытыкаваліся ліберальныя і радыкальныя погляды.

У межах кансерватызму істотную ролю меў накірунак *клерыкальнага кансерватызму*. Найбольш значным прадстаўніком яго выступае ***Максіміліян Якубовіч*** (1785 – 1853 гг.) – выкладчык лацінскай мовы ў Свіслацкай гімназіі, Крамянецкім ліцэі; прафесар Кіеўскага і Маскоўскага універсітэтаў. Аўтар працы “Хрысціянская філасофія жыцця ў параўнанні з пантэістычнай філасофіяй нашага часу” (1853 г.). У дадзеным творы праводзіцца ідэя пра тое, што ўсе формы чалавечай жыццядзейнасці (рэлігійная, маральная, грамадская) у сваёй аснове маюць боскае паходжанне. Рэлігія разглядаецца як фактар існавання грамадскага парадку. Сацыяльная няроўнасць трактуецца як неабходны атрыбут сацыяльнага быцця, які вынікае з “сутнасці духа”, ступені свабоды, што засяроджана ў духоўнай сутнасці пэўнай асобы.

*Рэвалюцыйны месіянізм* – філасофскае і сацыяльна-палітычнае вучэнне, у аснове якога знаходзіцца ідэя блізкага выратавання ўсяго чалавецтва, якое мае адбыцца дзякуючы надзвычайнай унутранай працы выбраных асоб альбо народаў і якое будзе мець характар “надзвычайнай” падзеі ў гісторыі чалавецтва. Рэвалюцыйны месіянізм з’яўляецца рэалізацыяй пэўнага тыпу утапічнай ідэалогіі, якая мае змястоўнае і структурнае падабенства да рэлігій-

нага месіянізму. Але рэвалюцыйны месіянізм мае свецкі характар. У яго аснове знаходзяцца філасофскія ідэі рамантызму.

Вызначальнай рысай рэвалюцыйнага месіянізму з’яўляецца ідэя *рамантычнага спірытуалізму.* Рамантычны спірытуалізм заснаваны на анталагічным дуалізме. Вылучаюцца дзве сферы рэчаіснасці: эмпірычная і духоўная, якія знаходзяцца ў складаных адносінах паміж сабой. Эмпірычная рэчаіснасць пазнаецца з дапамогай пачуццяў і розуму; духоўная – шляхам інтуіцыі, яна недаступная звычайным метадам пазнання. У гэтым кантэксце сцвярджаецца ідэя аб магчымасці своеасаблівай “інтэрвенцыі” духоўнай рэчаіснасці ў эмпірычную ў выніку актыўнага пранікнення духа ў матэрыю, якое выступае як працэс “адухаўлення” матэрыяльнага і як працэс разбурэння тых сацыяльных, палітычных і культурных форм жыцця, якія не адпавядаюць вышэйшаму духоўнаму зместу.

Дадзеныя ідэі сталі тэарэтычнай асновай фарміравання многіх рэвалюцыйных і нацыянальна-вызваленчых рухаў Еўропы ў першай палове XIX ст. Вялікі ўплыў яны мелі таксама на станаўленне польскага рэвалюцыйнага нацыянальна-вызваленчага руху як непасрэдна ў Польшчы, так і на землях былога ВКЛ.

### *Асноўныя прадстаўнікі рэвалюцыйнага месіянізму ў сацыяльна-палітычнай думцы Беларусі*

***Адам Міцкевіч*** (1798 – 1855 гг.) – польскі паэт і грамадска-палітычны дзеяч; ураджэнец Беларусі. Выпускнік Віленскага універсітэта (1819 г.); настаўнік Ковенскай павятовай школы (1819 – 1823 гг.). Адзін з кіраўнікоў тайнага таварыства філаматаў у Віленскім універсітэце, пасля раскрыцця якога быў арыштаваны і высланы ў Расію. У 1824 – 1829 гг. жыў у Пецярбургу, Маскве, Адэсе. З 1829 г. – у эміграцыі (Берлін, Веймар, Познань, Дрэздэн, Парыж). Актыўны дзеяч польскіх эміграцыйных палітычных і культурных арганізацый “Таварыства літоўскіх і рускіх земляў”, “Польскае літаратурнае таварыства”.

Асноўная сацыяльна-філасофская праца – “*Кнігі польскага народа і пілігрымства*” (1832 г.). Твор мае гістарыясофскі характар; яго галоўная мэта – вытлумачэнне сэнсу чалавечай гісторыі. Гісторыя свету разглядаецца як дыялектычнае развіццё ідэі свабоды, што праходзіць некалькі этапаў:

1) “залаты век” – найстаражытнейшая гісторыя чалавецтва; на гэтым этапе свабода мае арганічны характар, з’яўляецца боскім дарам;

2) этап згаршэння свету, які звязваецца з адыходам людзей ад веры ў адзінага Бога і адначасова са станаўленнем сістэмы панавання-падпарадкавання і падаўлення свабоды, вяршыняй чаго абвяшчаецца эпоха Рымскай імперыі;

3) этап ахвяры і вайны за вызваленне свету, які звязваецца з ахвярай Хрыста ў імя свабоды, што з'яўляецца пачаткам усеагульнай бітвы за свабоду, арэнай якой становіцца ўся зямля. Аднак у гэтай бітве, калі свабода няўхільна распаўсюджвалася, раптоўна адбылося новае "згаршэнне свету". Апошняе звязваецца ў першую чаргу з падзеламі Рэчы Паспалітай, якія інтэрпрэтуюцца як свядомы акт знішчэння свабоды. Аднак няволя, у якую патрапіў польскі народ, з'яўляецца крыніцай яго будучага адраджэння. Гісторыя польскага народа выступае як мадэль гісторыі ўсяго свету: прынесеная ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай ахвяра становіцца пачаткам барацьбы за свабоду, якую польскі народ у будучыні прынясе ўсім народам свету. А. Міцкевіч характарызуе польскі народ як пілігрымаў свабоды – носьбітаў духу свабоды, цесна звязанага з хрысціянскай верай.

***Іахім Лялевель*** (1786 – 1881 гг.) – выпускнік Віленскага універсітэта (1808 г.). Прафесар усеагульнай гісторыі Віленскага універсітэта (1815 – 1824 гг.). У 1824 г. пасля раскрыцця тайных таварыстваў у Віленскім універсітэце пераехаў у Варшаву. Актыўны ўдзельнік паўстання 1830 – 1831 гг. Пасля жыў у Парыжы, Бруселі, актыўна ўдзельнічаў у палітычным жыцці польскай эміграцыі.

У сваіх шматлікіх гістарычных працах І. Лялевель выступае як заснавальнік рамантычнай школы ў гістарыяграфіі. Сацыяльна-філасофскія праблемы закраналіся ім у працах "Гісторыка", "Навукі, якія дазваляюць пазнаць гістарычныя крыніцы", "Якім належыць быць гісторыку?". Крыніцай гістарычнага развіцця І. Лялевель лічыў "дух народаў" – сукупнасць непаўторных рыс, якія вызначаюць кірунак развіцця і характэрныя рысы грамадскага жыцця таго ці іншага народа. І. Лялевель таксама абгрунтоўвае месіянскую ролю польскага народа ў сцвярджэнні прынцыпу свабоды ў гісторыі чалавецтва. Спецыфічнымі характарыстыкамі "польскага нацыянальнага духу" ён лічыў схільнасць да свабоды, роўнасці, міру, братэрства, талеранцыі. Арганічнай формай грамадскага жыцця, уласцівай славянам, асабліва палякам, І. Лялевель лічыў прамую дэмакратыю. Дэфармацыя апошняй адбылася ў выніку пераймання чужых "польскаму духу" форм грамадскага жыцця. Актуальнай задачай польскага народа выступае раскрыццё ўнутраных форм "нацыянальнага духу" і аднаўленне свабоды.

Ідэі рамантызму і рэвалюцыйнага месіянізму сталі тэарэтычнай асновай фарміравання *польскага нацыянальна-вызваленчага руху* на землях Беларусі разглядаемага перыяду.

Першай яго праявай з'яўляецца дзейнасць студэнцкіх арганізацый у Віленскім універсітэце: тайнага таварыства *філаматаў* (1817 – 1823 гг.) і звязаных з ім легальных таварыстваў *прамяністых* (1818 – 1820 гг.) і

*філарэтаў* (1820 – 1823 гг.). Найбольш актыўнымі прадстаўнікамі дадзеных арганізацый выступалі Адам Міцкевіч, Томаш Зан, Восіп Яжоўскі, Ян Чачот, Францішак Малеўскі, Ігнат Дамейка. На першым этапе сваёй дзейнасці (1817 – 1818 гг.) філаматы ставілі перад сабой толькі культурна-асветніцкія мэты; на другім этапе (1819 – 1823 гг.) пачынаюць акцэнтавацца сацыяльна-палітычныя ідэі. Таварыствы прамяністых і філарэтаў афіцыйна мелі толькі культурна-асветніцкія задачы. Галоўнай мэтай сваёй дзейнасці актывісты студэнцкіх таварыстваў ставілі выхаванне моладзі ў духу польскай культуры. У сувязі з гэтым яны лічылі неабходным шырокае засваенне навуковых ведаў. Пры гэтым прыярытэт аддаваўся навуковым дысцыплінам, якія маюць грамадскую карысць, садзейнічаюць культывацыі маральна-этычных і грамадзянскіх якасцяў людзей; пад імі разумеліся сацыяльна-гуманітарныя навукі (крытыкавалася скіраванасць да прыродазнаўчай праблематыкі ў творчасці прадстаўнікоў позняга Асветніцтва). У філасофскіх ведах галоўная роля надавалася этыцы; на погляды дзеячаў студэнцкіх таварыстваў вялікі ўплыў мелі этыка рамантызму і кантыянства. Разгляд этычных праблем звязваўся з фармуляваннем галоўнага сэнсавага прызначэння чалавека, пад чым разумеўся пошук шляхоў, якія прывядуць Радзіму да шчасця.

У аснову этычных і грамадска-палітычных поглядаў філаматаў былі пакладзены прынцып любові да свабоды і прынцып любові да чалавечай асобы. Свабода ў філаматаў разумелася перш за ўсё як магчымасць бязмежнага ўдасканалення асобы ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, і, у першую чаргу, у галіне маралі і навукі – магчымасць гарманічнага развіцця асобы. Паступова свабода ў іх вучэнні супрацьпастаўляецца ўсім сацыяльным перашкодам, нормам і правілам, якія вымушаюць асобу да залежнасці і падпарадкавання, як антыпод тыраніі і прыгнёту. Філаматы выкарыстоўвалі асветніцкія ідэі натуральнага права і грамадскага дагавору пры абгрунтаванні неабходнасці грамадскіх пераўтварэнняў. Палітычныя свабода і роўнасць разглядаліся як неад’емныя правы чалавека, а таксама як умова ўзаемазвязаных паміж сабой шчасця асобы і грамадства. Маральнасць і дабрадзейнасць людзей непасрэдна звязваецца з тым, наколькі адпавядае грамадска-палітычнае ўладкаванне прынцыпам натуральнага права: свабоднае грамадства вядзе да развіцця дабрадзейнасцяў, тыранія – да іх згортвання. Галоўнай актуальнай палітычнай задачай абвяшчаецца аднаўленне Рэчы Паспалітай як незалежнай нацыянальнай польскай дзяржавы. У якасці ідэалу дзяржаўна-палітычнага ўладкавання абвяшчаецца канстытуцыйнае кіраванне; сцвярджаюцца ліквідацыя прыгонніцтва, верацярпімасць. Галоўнай рухаючай сілай грамадска-палітычных пераўтварэнняў, на думку філаматаў, павінна стаць дробная і сярэдняя шляхта, якая, у першую чаргу,

здольна пранікнуцца нацыянальнымі агульнаграмадскімі інтарэсамі (ідэя *шляхецкага рэвалюцыянарызму*).

Пасля разгрому студэнцкіх таварystваў у Віленскім універсітэце ў 1823 – 1824 гг. падобныя да іх сацыяльна-палітычныя ідэі развіваліся ў праграмных лозунгах тайных польскіх нацыянальных арганізацый 1820-х гг. (Патрыятычнае таварыства і інш.), падчас паўстання 1830 – 1831 гг.

У 1830-я – 1850-я гг., пасля паражэння паўстання 1830 – 1831 гг., ідэі палітычнага рамантызму і рэвалюцыйнага месіянізму аказалі ўплыў на тэарэтычныя пастулаты тайных рэвалюцыйных арганізацый: "*Дэмакратычная грамада*" (1836 – 1838 гг.), "*Садружнасць польскага народа*" (1835 – 1836 гг.), *Мінская тайная арганізацыя* (1848 – 1849 гг.), "*Брацкі саюз літоўскай моладзі*" (1846 – 1849 гг.). Галоўнай мэтай дадзеных арганізацый абвяшчаецца адраджэнне Рэчы Паспалітай. Пры гэтым адбываецца радыкалізацыя сацыяльна-палітычных ідэалаў. Найлепшай формай дзяржаўна-палітычнага ўладкавання абвяшчаецца дэмакратычная рэспубліка, якая разглядаецца як адпаведнік прынцыпам натуральнага права. На аснове апошняга абвяшчаліся грамадзянская і палітычная свабода і роўнасць усіх людзей, неабходнасць ліквідацыі саслоўных прывілеяў, форм феадальнай залежнасці. У якасці шляху да рэалізацыі сацыяльна-палітычных ідэалаў сцвярджалася нацыянальна-дэмакратычная рэвалюцыя, рухаючай сілай якой павінны стаць усе сацыяльныя слаі грамадства, а не толькі шляхта. Пры гэтым пад уплывам ідэй рамантызму указвалася выключная роля гістарычных асоб, якія здольны ўсвядоміць неабходныя агульнаграмадскія задачы і арганізаваць масы на іх ажыццяўленне.

## Уплыў філасофскіх ідэй рамантызму на фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі ў 1820-я – 1850-я гг.

Адной з вызначальных рыс рамантычнай ідэалогіі з'яўляецца імкненне да пошуку светапоглядных, этычных і сацыяльных ідэалаў у гістарычным мінулым. З гэтым звязана значнае ўзрастанне цікавасці да гістарычных і этнаграфічных даследаванняў у першай палове XIX ст. У рамантычным дыскурсе помнікі гістарычнага мінулага разглядаліся як адлюстраванне глыбінь аўтэнтычнага "народнага духу". Дадзеныя даследаванні ў вялікай ступені склалі тэарэтычны падмурак фарміравання нацыянальных ідэй у Еўропе XIX ст.

У 1820-я – 1850-я гг. пад уплывам ідэй рамантызму істотна ўзрастае інтарэс да гістарычнага і этнаграфічнага вывучэння Беларусі. Вывучэнне ажыццяўлялася пераважна прадстаўнікамі мясцовай польскамоўнай культуры.

Аднак некаторыя высновы, зробленыя ў межах дадзеных даследаванняў, заклалі тэарэтычныя перадумовы фарміравання беларускай нацыянальнай ідэі.

Адным з першых да асэнсавання старажытнай гістарычнай спадчыны і традыцыйнай культуры на землях былога ВКЛ звярнуўся *Зарыян Даленга-Хадакоўскі* (Адам Чарноцкі) (1784 – 1825 гг.) – этнограф, археолаг, актыўны дзеяч расійскіх і польскіх навуковых таварыстваў. Асноўны яго твор – "Аб славяншчыне перад хрысціянствам" (1818 г.). У ім традыцыйная культура разглядаецца як жывое і старажытнае паданне, якое захоўвае каштоўны вопыт, якога не хапае ў сучаснасці. У супрацьвагу асветніцкай праграме, скіраванай на ўзвышэнне традыцыйнай культуры да ўзроўню навуковай рацыянальнасці, З. Даленга-Хадакоўскі прапаноўваў правесці дэканструкцыю пануючай польскамоўнай шляхецкай культуры на землях былога ВКЛ і знайсці пад яе покрывам аўтэнтычныя культурныя формы народнага жыцця.

Погляды З. Даленгі-Хадакоўскага сталі падмуркам фарміравання ідэйнага феномена *краёвасці* – полікультурнай ідэнтычнасці часткі шляхецкай інтэлігенцыі былога ВКЛ, у якой суіснавалі польская нацыянальная самасвядомасць і "літоўскі" рэгіянальны патрыятызм, звязаны з акцэнтуацыяй спецыфікі гістарычнага лёсу, народнай мовы і культуры рэгіёна былога ВКЛ. У рэчышчы ідэй краёвасці паўстае літаратурная і этнаграфічная традыцыя, у якой можна зафіксаваць наяўнасць тэарэтычных перадумоў беларускай нацыянальнай ідэі. Асноўнымі яе прадстаўнікамі выступаюць *Ян Баршчэўскі*, *Рамуальд Падбярэзскі*, *Аляксандр Рыпінскі*, *Ігнат Храпавіцкі*, *Тадэвуш Лада-Заблоцкі*, *Станіслаў Манюшка*, *Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч*, *Уладзіслаў Сыракомля* і інш. З'яўляецца беларускамоўная і білінгвістычная (польска-беларускамоўная) літаратура: творы В. Дуніна-Марцінкевіча, шэраг ананімных твораў. Галоўную ролю ў фарміраванні тэарэтычных перадумоў беларускай нацыянальнай ідэі мелі працы Я. Баршчэўскага "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях" (1844 г.), Р. Падбярэзскага "Лісты пра Беларусь" (прадмова да працы Я. Баршчэўскага, 1844 г.). У іх сцвярджалася самабытнасць беларускай народнай мовы і традыцыйнай культуры. Пры гэтым, аднак, беларуская ідэнтычнасць была ўключана ў кантэкст польскай нацыянальнай ідэі. Для ідэалогіі краёвасці былі характэрны наступныя рысы:

– сцвярджэнне агульнай рэгіянальнай ідэнтычнасці для ўсіх сацыяльных груп Беларусі (паланізаванай шляхты, беларускамоўнага сялянства);

– традыцыяналізм, рамантычная ідэалізацыя гістарычнага мінулага;

– маральна-эстэтычны разгляд жыцця народа.

*Такім чынам, філасофская і грамадска-палітычная думка Беларусі 1820-х – 1850-х гг. развівалася ў рэчышчы агульнаеўрапейскай філасофскай*

*культуры. Найбольшы ўплыў на яе развіццё мелі ідэі рамантызму і нямецкай класічнай філасофіі. Адметнымі рысамі філасофскай думкі Беларусі дадзенага перыяду з'яўляліся рэцэптыўнасць, перавага ў філасофскім дыскурсе антрапалагічнай, маральна-этычнай і сацыяльна-філасофскай праблематыкі. У межах грамадска-палітычнай думкі пад уплывам рамантызму сфарміраваліся супрацьлеглыя ідэі кансерватызму і рэвалюцыйнага месіянізму. Рамантычныя ідэі сталі тэарэтычным падмуркам фарміравання беларускай нацыянальнай ідэі ў дадзены перыяд.*

## Кантрольныя пытанні да тэмы 5

1. У якіх гістарычных умовах адбывалася развіццё філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі 1820-х – 1850-х гг.?
2. Што такое рамантызм? Якім чынам яго ідэі звязаны з традыцыяй Асветніцтва?
3. Дайце параўнальную характарыстыку філасофіі рамантызму і нямецкай класічнай філасофіі.
4. Ахарактарызуйце спецыфічныя рысы філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі 1820-х – 1850-х гг.
5. Назавіце асноўных прадстаўнікоў філасофіі рамантызму на землях Беларусі.
6. Як выяўляецца антрапалагічны накірунак у рамантычнай філасофіі на прыкладзе вучэння Ю. В. Галухоўскага?
7. У працах якіх мысліцеляў Беларусі адлюстраваліся ідэі гегельянства?
8. Якім чынам абгрунтоўваецца прынцып развіцця ў філасофскай канцэпцыі Ф. Бохвіца?
9. Як ідэі рамантызму паўплывалі на спецыфіку асноўных накірункаў сацыяльна-палітычнай думкі Беларусі 1820-х – 1850-х гг.?
10. Ахарактарызуйце асноўныя ідэі філасофіі кансерватызму першай паловы XIX ст.
11. Назавіце асноўных прадстаўнікоў кансерватыўнай думкі Беларусі 1820-х – 1850-х гг.
12. Вызначце ролю “Пецярбургскага гуртка” ў распаўсюджанні кансерватыўных ідэй.
13. Што такое “рэвалюцыйны месіянізм”? Якую сувязь ён мае з ідэалогіяй рамантызму?
14. Вызначце сутнасць ідэі рамантычнага спірытуалізму.
15. Якім чынам рэвалюцыйна-месіянісцкія ідэі праявіліся ў творчасці А. Міцкевіча?

16. Назавіце асноўныя рысы рамантычнай канцэпцыі гісторыі І. Лялевеля.

17. Дайце агульную характарыстыку сацыяльна-палітычных ідэй філаматаў, філарэтаў і “прамяністых”.

18. Якую ролю адыграла канцэпцыя рэвалюцыйнага месіянізму ў фарміраванні ідэалогіі польскага нацыянальна-вызваленчага руху на землях Беларусі ў 1820-я – 1850-я гг.?

19. Пакажыце сувязь паміж ідэямі рамантызму і фарміраваннем беларускай нацыянальнай ідэі ў 1820-я – 1850-я гг.

20. У чым сутнасць ідэйнага феномена краёвасці і якія яго асноўныя рысы?

## ТЭМА 6. ПЕРЫЯД ФАРМІРАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНА АРЫЕНТАВАНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ФІЛАСОФІІ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIX – ПАЧАТАК XX стст.)

### Гістарычныя ўмовы развіцця філасофскай і сацыяльна-палітычнай думкі

У сферы сацыяльна-эканамічных адносін пасля правядзення аграрнай рэформы 1861 г. назіраецца працэс разлажэння феадальных адносін і развіцця капіталізму як у сельскай гаспадарцы, так і ў прамысловасці і гандлі; адбываецца паступовы рост таварна-грашовых адносін. Разам з тым у структуры эканомікі Беларусі пануючым сектарам застаецца сельская гаспадарка, у якой панавалі паўфеадальныя адносіны; прамысловасць была прадстаўлена пераважна дробнымі і саматужнымі прадпрыемствамі, якія спецыялізаваліся на апрацоўцы мясцовай сыравіны.

У сферы сацыяльна-палітычных адносін захоўваецца панаванне царскага абсалютысцкага рэжыму Расійскай імперыі. Пасля падаўлення паўстання 1863 – 1864 гг. адбываецца ўзмацненне рэпрэсіўнасці рэжыму, што выявілася ва ўдасканаленні паліцэйска-бюракратычнага кантролю за палітычным жыццём на тэрыторыі Беларусі, паглыбленні палітыкі русіфікацыі ў розных сферах грамадскага жыцця. У канцы XIX – пачатку XX стст. назіраецца крызіс самадзяржаўнага рэжыму. Гэта адлюстравалася ў фарміраванні і актывізацыі рабочага, рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху, што найбольш яскрава праявілася падчас рэвалюцыі 1905 – 1907 гг. Вынікам дадзенага крызісу сталі падзенне царызму і распад Расійскай імперыі ва ўмовах Першай сусветнай вайны 1914 – 1918 гг. (рэвалюцыя 1917 г.), абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі ў 1918 г. і Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў 1919 г., падзел тэрыторыі Беларусі паміж Савецкай Расіяй і Польшчай (1921 г.).

У сферы духоўнага жыцця адбываліся наступныя працэсы:

1) Умацаванне пануючага статусу праваслаўнай канфесіі ў сферы рэлігійных адносін; дыскрымінацыйная палітыка адносна каталіцкага насельніцтва.

2) Ліквідацыя сістэмы вышэйшай адукацыі на тэрыторыі Беларусі (у 1864 г. зачынены Горы-Горацкі земляробчы інстытут).

3) Правядзенне канцэнтраванай палітыкі русіфікацыі ва ўсіх сферах жыцця грамадства.

4) Развіццё форм нелегальнай рэвалюцыйнай субкультуры (літаратура, друк і г. д.).

5) Некаторая лібералізацыя духоўнага жыцця пасля рэвалюцыі 1905 – 1907 гг. (развіццё незалежнага шматмоўнага друку; аднаўленне польскамоўнай адукацыі; змякчэнне дыскрымінацыйных мер у канфесійнай сферы і г. д.).

6) Фарміраванне беларускамоўнай культуры; з’яўленне першых беларускіх перыядычных выданняў “Наша доля” (1906 г.), “Наша ніва” (1906 – 1915 гг.), “Беларус” (1913 – 1915 гг.).

## Спецыфічныя рысы філасофскай і грамадска-палітычнай думкі другой паловы XIX – пачатку XX стст.

Перыяд другой паловы XIX – пачатку XX стст. адзначаецца адсутнасцю на тэрыторыі Беларусі навучальных устаноў, у якіх бы прафесійна выкладалі філасофію. Такім чынам, прафесійная філасофская культура на дадзеным этапе прыходзіць у заняпад. На землях Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX стст. не ўзнікалі творы, у якіх бы сістэматызавана аналізаваліся філасофскія праблемы. Асобныя філасофскія ідэі маюць месца перш за ўсё ў межах грамадска-палітычнай думкі.

Грамадска-палітычная думка Беларусі разглядаемага перыяду прадстаўлена некалькімі накірункамі:

– афіцыйная ідэалогія, рэгіянальным варыянтам якой на тэрыторыі Беларусі з’яўляўся заходнерусізм;

– лібералізм;

– палітычны радыкалізм: шляхецкі рэвалюцыянарызм напярэдадні і падчас паўстання 1863 – 1864 гг., рэвалюцыйнае народніцтва, марксізм;

– ідэалогія беларускага нацыянальнага руху.

## Ідэалогія заходнерусізму

Афіцыйная ідэалогія абсалютысцкага рэжыму Расійскай імперыі пачынае фарміравацца ў 1830-я гг. Яе асноўнымі пастулатамі становяцца вы-

ключны статус праваслаўя ў грамадскім жыцці Расіі, абсалютызм як адзіная форма дзяржаўнага праўлення, панаванне рускай народнасці ў розных сферах жыцця грамадства (“праваслаўе, самадзяржаўе, народнасць”). У межах гэтай ідэалогіі як рэгіянальны варыянт фарміруюцца ідэі заходнерусізму. Пад *заходнерусізмам* разумеюць ідэйную плынь, у якой абгрунтоўваецца пастулат, паводле якога Беларусь з’яўляецца дзяржаўнай і этнакультурнай часткай Расіі, а беларусы – асобнай галіной рускага народу. Тэарэтычнай асновай гэтага становіцца канцэпцыя трыадзінага рускага народа, які складаецца з трох “пляменаў”: вялікарускага, маларускага і заходнерускага. Духоўнай асновай дадзенага трыадзінства разглядаецца праваслаўе. Этнакультурныя асаблівасці беларусаў пры гэтым разглядаліся як неістотныя і пераважна тлумачыліся вынікам чужаземнага, у асноўным польскага, уплыву. Галоўнай сацыяльна-палітычнай задачай заходнерускага руху ставілася ўмацаванне палітычнага, сацыяльнага і культурнага адзінства беларускіх зямель з Расіяй.

Ідэйныя перадумовы фарміравання заходнерусізму былі закладзены ў першай палове XIX ст. апошнім уніяцкім мітрапалітам, які ў 1839 г. перайшоў у праваслаўе, Іосіфам Сямашкам, а таксама дзеячамі кансерватыўна-славянафільскага накірунку ў расійскай грамадскай думцы (М. Каткоў, І. Карнілаў, П. Бацюшкаў, І. Аксакаў і інш.). У другой палове XIX ст. ідэалогія заходнерусізму канцэптуальна афармляецца ў творчасці Ксенафонта Гаворскага, Міхаіла Каяловіча і інш. На пачатку XX ст. ідэі заходнерусізму развіваюцца ў творчасці дзеячаў праўрадавых кансерватыўных арганізацый “Русское окраинное общество”, “Крестьянин”, “Белорусское общество” (Лука і Іван Саланевічы, Дзмітрый Скрынчанка, Аляксандр Пшчолка і інш.). Яны знаходзілі актыўную падтрымку з боку дзяржавы і прапагандаваліся праз адукацыйныя ўстановы, афіцыйны друк, праваслаўную царкву. Дзеля навуковага абгрунтавання “гістарычных” правоў Расіі на “заходнерускія” землі была створана Віленская археаграфічная камісія (1848 – 1915 гг.), праводзіліся шматлікія этнаграфічныя даследаванні.

### *Асноўныя прадстаўнікі заходнерусізму*

***Ксенафонт Гаворскі*** (1821 – 1871 гг.) – выпускнік Полацкай уніяцкай і Пецярбургскай праваслаўнай духоўных семінарый, выкладчык Полацкай праваслаўнай духоўнай семінарыі; рэдактар часопісаў “Вестник Юго-Западной России” і “Вестник Западной России”. На старонках выданняў абгрунтоўваў ідэю адзінай рускай народнасці. Паводле К. Гаворскага, этнічныя асаблівасці беларусаў з’яўляюцца вынікам польска-каталіцкай экспансіі і іх неабходна знішчыць для аднаўлення “спрадвечна рускага характару краю”. Рэалізацыя дадзенай мэты прадугледжвала барацьбу з нігілізмам і сепаратызмам.

***Міхаіл Каяловіч*** (1828 – 1891 гг.) – праваслаўны царкоўны гісторык. Выкладчык Рыжскай і Пецярбургскай духоўных семінарый, Пецярбургскай духоўнай акадэміі (1856 – 1891 гг., з 1862 г. – прафесар). Асноўныя сацыяльна-філасофскія ідэі М. Каяловіча змешчаны ў яго гістарычных працах "Літоўская царкоўная унія" (у 2 т., 1859 – 1861 гг.), "Лекцыі па гісторыі Заходняй Расіі" (1864 г.), "Гістарычная жывучасць рускага народа і яе культурныя асаблівасці" (1883 г.), "Гісторыя рускай самасвядомасці" (1884 г.) і інш. М. Каяловіч прызнае пэўную гістарычна абумоўленую этнакультурную адметнасць Беларусі, аднак адмаўляе магчымасць яе нацыянальна-культурнага і дзяржаўнага самавызначэння. Асабліва адмоўна разглядаецца ім магчымасць самавызначэння Беларусі на аснове польскай цывілізацыі. Сувязі Беларусі з Польшчай ацэньваюцца рэзка адмоўна. На думку М. Каяловіча, вялікарускі народ выступае як "гістарычны" правадыр і гаспадар усіх усходнеславянскіх "плямёнаў" (маларускага, заходнерускага). Цэментуючае ядро гэтага адзінства – праваслаўе. Пастуліруецца арганічная ўзаемасувязь на ментальным узроўні "заходнерусаў" і велікарусаў; руская мова і культура разглядаюцца як родныя для беларусаў.

***Дзмітрый Скрынчанка*** (1875 – 1947 гг.) – выкладчык Мінскай духоўнай семінарыі (1903 – 1912 гг.), старшыня Мінскага аддзела Саюза рускага народа, рэдактар газет "Минское слово" і "Минские епархиальные ведомости" (1905 – 1912 гг.). Аўтар шматлікіх прац тэалагічнага, рэлігійна-філасофскага, сацыялагічнага і этнаграфічнага характару. Галоўная праца – "Каштоўнасць жыцця паводле сучасна-філасофскага і хрысціянскага вучэння" (1908 г.). У гэтым творы Д. Скрынчанка ўзнаўляе некаторыя ідэі рускай рэлігійнай філасофіі канца XIX – пачатку XX стст. у палеміцы з заходнееўрапейскай некласічнай філасофіяй XIX ст. Галоўнае месца ў працы займае праблема сэнсу жыцця. Паводле Д. Скрынчанкі, яе вырашэнне магчыма толькі на аснове артадаксальнага рэлігійнага светапогляду. У супрацьвагу гэтаму крытыкуюцца этычныя канцэпцыі Н. Гартмана, А. Шапенгаўэра, Л. Талстога, Ф. Ніцшэ і інш., у якіх праблема сэнсу жыцця падмяняецца пытаннем аб каштоўнасці жыцця. У творах "Заслуги, оказанные старыми дворянскими родами Минской губернии православной вере" (1907 г.), "Открытое письмо членам Государственной Думы и русскому обществу" (1908 г.) Д. Скрынчанка развівае ідэю заходнерусізму аб арганічным адзінстве "Заходняй Расіі" з вялікарускім народам і неабходнасці палітыкі вяртання беларускага народа да асноў рускай самасвядомасці.

## Ліберальныя ідэі ў сацыяльна-палітычнай думцы Беларусі

Лібералізм як накірунак грамадска-палітычнай думкі складваецца ў Заходняй Еўропе на мяжы XVIII – XIX стст. Яго асноўнымі рысамі з'яўляюцца:

– сцвярджэнне аўтаноміі асобы, яе свабоды ад абмежаванняў, якія накладваюцца традыцыяй або грамадскай структурай (грамадзянская і палітычная свабода);

– уяўленне аб сацыяльным прагрэсе і вера ў яго ажыццяўленне;

– ідэя паступовасці прагрэсу і паслядоўнасці ўсіх яго стадый; адмаўленне ад гвалтоўных спроб пераўладкавання грамадства.

На тэрыторыі Беларусі элементы ідэй лібералізму назіраліся ў межах польскага нацыянальна-вызваленчага руху першай паловы XIX ст. У другой палове 1850-х – пачатку 1860-х гг. складваецца ліберальна-рэфарматарская плынь у польскім грамадска-палітычным руху, прадстаўнікі якой, у адрозненне ад шляхецкіх рэвалюцыянераў, імкнуліся да правядзення сацыяльных пераўтварэнняў шляхам канструктыўнага супрацоўніцтва з уладамі. Афармленне дадзенай плыні адбывалася ў дзейнасці Віленскага музея старажытнасцяў і створанай пры ім Археалагічнай камісіі (з 1855 г.). Найбольш актыўныя дзеячы названага накірунку – *Адам Кіркор, Яўстахій і Канстанцін Тышкевічы, Міхал Балінскі, Тэадор Нарбут, Юзаф Ігнацы Крашэўскі*. З канца 1850-х гг. у Вільні выдаецца часопіс "*Віленскі партфель*" (рэдактар – А. Кіркор), на старонках якога прапагандуюцца ліберальна-рэфарматарскія ідэі. Палітычным адлюстраваннем дзейнасці дадзенай плыні сталі праекты рэфармавання грамадства, адрасаваныя расійскаму імператару Аляксандру II ("Віленскі альбом" 1858 г., складзены А. Кіркорам, І. Ходзькам і інш.; праект гродзенскага губернскага прадвадзіцеля дваранства, графа Віктара Старжынскага 1862 г.). Дадзеныя праекты базаваліся на ідэі партнёрства шляхты зямель былога ВКЛ і расійскага ўрада і змяшчалі наступныя асноўныя патрабаванні:

– стварэнне сістэмы мясцовага самакіравання для зямель былога ВКЛ;

– аднаўленне дзейнасці Статута ВКЛ 1588 г.;

– аднаўленне Віленскага універсітэта;

– вяртанне ў сістэму адукацыі польскай мовы.

Паражэнне паўстання 1863 – 1864 гг. прывяло да заняпаду ліберальнага і ў цэлым грамадска-палітычнага руху на землях Беларусі. Абуджэнне апошняга адбываецца на мяжы 1870-х – 1880-х гг. На пачатку 1880-х гг. фарміруецца г. зв. *ліберальнае народніцтва* як альтэрнатыва ўзнікшаму раней рэвалюцыйнаму народніцтву, што перажывала крызіс пасля забойства

Аляксандра II у 1881 г. Ліберальнае народніцтва як грамадскі рух распаўсюдзілася на тэрыторыі ўсёй Расійскай імперыі. Яго асноўныя ідэйна-тэарэтычныя палажэнні:

– ідэя мірнага эвалюцыйнага пераўладкавання грамадства ў дэмакратычным накірунку;

– сцвярджэнне ў якасці ідэалу сацыяльнага ўладкавання гарманічнага спалучэння свабоды асобы і грамадскай салідарнасці;

– абвяшчэнне інтэлігенцыі галоўнай рухаючай сілай і каталізатарам грамадскага прагрэсу;

– тэорыя "малых спраў", якая прадугледжвала неабходнасць выкапання інтэлігенцыяй "абавязку перад народам" праз сумленныя адносіны да ўласных прафесійных абавязкаў. Тэорыя і практыка "малых спраў" акцэнтавалі ўвагу на неабходнасці фарміравання грамадзянскай супольнасці шляхам ініцыятыў з боку інтэлігенцыі, што ўключала ў сябе станаўленне і развіццё недзяржаўных грамадскіх арганізацый, прапаганду асветы, правядзенне канкрэтных мерапрыемстваў, накіраваных на карысць народных мас, у эканамічнай і сацыяльна-культурнай сферы.

На тэрыторыі Беларусі цэнтрам прапаганды ліберальнага народніцтва становіцца легальная недзяржаўная газета "*Минский листок*" (1886 – 1902 гг.; у 1902 – 1905 гг. – "Северо-Западный край"). Найбольш вядомыя супрацоўнікі газеты – *К. Зіноўеў, Я. Лучына, М. Янчук, А. Слупскі, Д. Бохан, Е. Ляцкі, А. Багдановіч, М. Доўнар-Запольскі.*

У цэлым газета як легальнае выданне вымушана была выказваць ліберальныя ідэі вельмі асцярожна. Найлепшай формай дзяржаўнага ўладкавання ўскосна прызнаваліся заходнія ліберальныя дэмакратыі (ананімны разгляд палітычных сістэм заходніх краін у артыкуле "Наш век", 1888 г.). У "Минском листке" прапагандуюцца ідэі асветы і распаўсюджання сацыяльна значных ведаў; пры гэтым звяртаецца ўвага на тое, што яны павінны спалучацца з канкрэтнымі дзеяннямі па паляпшэнню жыцця народа. Асвета разглядаецца як важны фактар паляпшэння дабрабыту і маральнага стану грамадства.

Палітычныя падзеі пачатку XX ст., і ў першую чаргу рэвалюцыя 1905 – 1907 гг., прывялі да фарміравання ліберальнага руху ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі. Ліберальныя ідэі змяшчаліся ў праграмах шэрагу палітычных партый – як агульнарасійскіх, так і рэгіянальных, – што ўзніклі на пачатку XX ст.: Канстытуцыйна-дэмакратычная партыя народнай свабоды, Канстытуцыйна-каталіцкая партыя Літвы і Беларусі, Саюз дасягнення раўнапраўя яўрэяў у Расіі, Краёвая партыя Літвы і Беларусі. Асноўныя палітычныя ідэі дадзеных партый:

– эвалюцыйная трансфармацыя Расійскай імперыі ў канстытуцыйную манархію на аснове развіцця дэмакратычных палітычных інстытутаў, рэалізацыі прынцыпа падзелу ўлад, умацавання парламенцкіх структур;

– станаўленне і развіццё дэмакратычных грамадзянскіх і палітычных свабод;

– развіццё мясцовага самакіравання (Канстытуцыйна-каталіцкая партыя Літвы і Беларусі і Краёвая партыя Літвы і Беларусі патрабавалі аўтаноміі для тэрыторый Беларусі і Літвы);

– вырашэнне аграрнай праблемы шляхам частковага пераразмеркавання памешчыцкай зямлі на карысць сялян.

Разам з тым на тэрыторыі Беларусі ліберальныя ідэі не атрымалі шырокага распаўсюджання, асабліва пасля паражэння рэвалюцыі 1905 – 1907 гг., калі спыніла сваю дзейнасць большасць ліберальных грамадска-палітычных арганізацый. Гэта тлумачыцца ў першую чаргу слабасцю сацыяльнай базы ліберальнага руху (на тэрыторыі Беларусі адсутнічалі вышэйшыя навучальныя ўстановы, земствы да 1911 г., якія ў іншых рэгіёнах выступалі цэнтрамі распаўсюджання ліберальных ідэй).

**Палітычны радыкалізм**

Значную ролю ў грамадска-палітычнай думцы Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX стст. мелі ідэі палітычнага радыкалізму. Іх спецыфіка заключалася ў абгрунтаванні неабходнасці рэвалюцыйнага пераўладкавання існуючых сацыяльна-эканамічных і сацыяльна-палітычных адносін. Сярод дадзеных ідэй можна вылучыць тры накірункі:

– шляхецкі рэвалюцыянарызм напярэдадні і падчас паўстання 1863 – 1864 гг.;

– рэвалюцыйнае народніцтва;

– марксізм.

*Шляхецкі рэвалюцыянарызм* напярэдадні і падчас паўстання 1863 – 1864 гг. развіваўся ў рэчышчы польскага нацыянальна-вызваленчага руху XIX ст. Галоўнай мэтай удзельнікаў паўстання 1863 – 1864 гг. з’яўлялася аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. шляхам узброенай барацьбы. У той жа час сярод паўстанцаў выявіўся падзел на памяркоўную (“белыя”) і радыкальную (“чырвоныя”) плыні.

Найбольш выразна ідэі шляхецкага рэвалюцыянарызму былі адлюстраваны ў паўстанцкіх друкаваных выданнях: беларускамоўная “*Мужыцкая праўда*” (1862 – 1863 гг., выдадзена 7 нумароў), польскамоўная “*Chorągiew swobody*” (“Сцяг свабоды”) (1863 г., афіцыйнае выданне Літоўскага правінцыяльнага камітэта, пераўтворанага падчас паўстання ў Часовы правін-

цыяльны ўрад Літвы і Беларусі, выдадзена 3 нумары). Галоўная роля ў арганізацыі і рэдагаванні гэтых выданняў належала кіраўніку Літоўскага правінцыяльнага камітэта, лідэру "чырвоных" у Беларусі і Літве *Канстанціну Каліноўскаму* (1838 – 1864 гг.).

Асноўныя ідэі, якія прапагандаваліся ў паўстанцкіх выданнях:

– адмаўленне расійскага самадзяржаўя, яго ваеннага, бюракратычнага і судовага апарату;

– сцвярджэнне ў якасці палітычнага ідэалу новай Рэчы Паспалітай як дэмакратычнай федэратыўнай рэспублікі, якая павінна складацца з двух раўнапраўных суб'ектаў: Польшчы і Літвы-Беларусі;

– усеагульнае ўраўнаванне ў грамадзянскіх і палітычных правах прадстаўнікоў усіх сацыяльных груп; ліквідацыя саслоўнага падзелу грамадства; забеспячэнне дэмакратычных правоў і свабод грамадзян, стварэнне ўлады, адказнай перад народам;

– ліквідацыя феадальных перажыткаў у аграрнай сферы і надзяленне сялян зямлёй;

– сцвярджэнне каштоўнасці ўсеагульнай асветы;

– аднаўленне уніяцкай царквы як фактара духоўнага адзінства народа пры адначасовым сцвярджэнні свабоды ў сферы рэлігіі;

– ідэя ўсенароднай дэмакратычнай рэвалюцыі.

Паражэнне паўстання 1863 – 1864 гг. і царскія рэпрэсіі, якія адбываліся пасля гэтага, прывялі да заняпаду ідэй шляхецкага рэвалюцыянарызму.

*Рэвалюцыйнае народніцтва* – агульнарасійскі радыкальны палітычны рух апошняй трэці XIX – пачатку XX стст. На тэрыторыі Беларусі рух народнікаў фарміруецца ў другой палове 1870-х гг. Асяродкамі дадзенага руху з'яўляліся створаныя ў буйнейшых гарадах Беларусі гурткі, у якія ўваходзілі пераважна прадстаўнікі мясцовай інтэлігенцыі шляхецкага або мяшчанскага паходжання. Гурткі падтрымлівалі сувязь з агульнарасійскай народніцкай арганізацыяй "Зямля і воля" (1876 – 1879 гг.), а пасля яе расколу – з арганізацыямі "Чорны перадзел" (1879 – 1881 гг.) і "Народная воля" (1879 – 1882 гг.). У 1880-х – першай палове 1890-х гг. рэвалюцыйнае народніцтва перажывала заняпад, што звязана з узмацненнем царскіх рэпрэсій пасля забойства народавольцамі расійскага імператара Аляксандра II у 1881 г. Дзейнічалі нешматлікія гурткі рэвалюцыйна-народніцкай арыентацыі ў беларускіх гарадах, пераважна сярод вучнёўскай моладзі, а таксама сярод беларускіх студэнтаў у Пецярбургскім універсітэце (група "Гоман"). У другой палове 1890-х гг. назіраецца адраджэнне дадзенага руху. У 1901 – 1902 гг. у выніку аб'яднання рэвалюцыйна-народніцкіх гурткоў у Расійскай імперыі ўзнікае Партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (ПСР). На тэрыторыі Беларусі і Літвы дзейнічала яе адгалінаванне – Паўночна-Заходняя

арганізацыя ПСР. ПСР адыграла вялікую ролю ў рэвалюцыйных падзеях 1905 – 1907 і 1917 гг. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. ПСР на кароткі час ператварылася ў масавую партыю агульнарасійскага маштабу.

Ідэалогія рэвалюцыйнага народніцтва грунтавалася на рэцэпцыі палітычных тэорый расійскіх радыкальных палітычных дзеячаў сярэдзіны XIX ст. – *А. Герцэна, М. Агарова, М. Бакуніна, М. Чарнышэўскага, П. Лаўрова.* Сацыяльны ідэал рэвалюцыйнага народніцтва – сацыялізм, пад якім разумеецца грамадскі лад, заснаваны на панаванні калектыўнай уласнасці на асноўныя сродкі вытворчасці. Спецыфіка гіпатэтычнага пераходу да сацыялізму ў грамадстве Расійскай імперыі бачылася ў наяўнасці для гэтага аб'ектыўных сацыяльна-эканамічных перадумоў. Пад гэтым разумелася існаванне такога сацыяльнага інстытута, як сялянская абшчына, у функцыянаванні якой змяшчаліся элементы сацыялізму (традыцыі абшчыннага самакіравання, перыядычныя перадзелы зямлі). Пры гэтым капіталізм разглядаўся рэвалюцыйнымі народнікамі як штучнае ўтварэнне, што насаджаецца дзяржаўнай уладай для павелічэння даходаў кіруючай эліты. Магчымасць пераходу да сацыялістычнага грамадства звязваецца з дэмакратычнай палітычнай рэвалюцыяй, якая павінна знішчыць самадзяржаўе, устанавіць дэмакратычны палітычны лад і стварыць умовы для вырашэння карэнных сацыяльных пытанняў. У падрыхтоўцы рэвалюцыі галоўнай рухаючай сілай павінна стаць прагрэсіўная інтэлігенцыя; такім чынам быў сканструяваны своеасаблівы ідэал самаахвярнай дзейнасці інтэлігенцыі на карысць народа. Вызначэнне канкрэтных шляхоў ажыццяўлення рэвалюцыі прывяло да фарміравання некалькіх асноўных ідэйных накірункаў рэвалюцыйнага народніцтва:

| *прапагандысцкі накірунак* | *анархічна-бунтарскі накірунак* | *змоўніцкі накірунак* |
|---|---|---|
| ажыццяўленне рэвалюцыі звязваецца з актыўнай асветніцка-прапагандысцкай дзейнасцю інтэлігенцыі сярод народных мас, якая павінна прывесці да паступовых зрухаў у калектыўнай свядомасці і, як вынік, да развіцця масавых рэвалюцыйных рухаў | ажыццяўленне рэвалюцыі звязваецца з рэалізацыяй “прамога дзеяння” – масавых стыхійных выступленняў; задача рэвалюцыйнай інтэлігенцыі – не ў кіраванні масамі, а ў выяўленні і распальванні бунтарскіх настрояў, якія заўсёды імпліцытна змяшчаюцца ў народных масах | ажыццяўленне рэвалюцыі звязваецца з палітычным пераваротам, які павінен быць здзейснены спецыяльнай авангарднай арганізацыяй; пасля ажыццяўлення перавароту дадзеная арганізацыя павінна, выкарыстоўваючы механізмы дзяржаўнай улады, ажыццявіць рэвалюцыйныя пераўтварэнні ў грамадстве; народныя масы разглядаюцца як несвядомая кансерватыўная сіла, і іх удзел у рэвалюцыі выключаецца |

*Марксізм* – накірунак еўрапейскай філасофскай і сацыяльна-палітычнай думкі, фарміраванне якога пачынаецца ў сярэдзіне XIX ст. у творчасці нямецкіх мысліцеляў Карла Маркса і Фрыдрыха Энгельса. З другой паловы XIX ст. марксізм пераўтвараецца ў шырокі грамадска-палітычны рух, які ахапіў большасць краін Еўропы, а затым распаўсюдзіўся і на іншых кантынентах. На тэрыторыі Беларусі, як і ў цэлым Расійскай імперыі, марксізм як плынь у межах рэвалюцыйнага руху фарміруецца ў 1880-я гг., у значнай ступені ў якасці альтэрнатывы народніцтву, што знаходзілася ў крызісным стане. У 1880-я – 1890-я гг. на тэрыторыі Беларусі ўзнікаюць шматлікія марксісцкія гурткі, якія першапачаткова мелі пераважна асветніцкі характар. Да актыўнай палітычнай дзейнасці марксісцкія арганізацыі пераходзяць напрыканцы XIX ст. У канцы XIX – пачатку XX стст. на тэрыторыі Беларусі дзейнічае шэраг арганізацый, якія ўваходзяць у склад палітычных партый марксісцкай арыентацыі: Расійская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя (з 1898 г.), Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз Польшчы, Літвы і Расіі (Бунд, з 1897 г.), Сацыял-дэмакратыя Каралеўства Польскага і Літвы (з 1893 г.), Польская партыя сацыялістычная на Літве (з 1902 г.), Літоўская сацыял-дэмакратычная партыя (з 1896 г.), Рабочая партыя палітычнага вызвалення Расіі (1899 – 1900 гг.). Марксісцкія партыі і арганізацыі адыгралі важную ролю ў ажыццяўленні рэвалюцый 1905 – 1907 і 1917 гг.

*Асноўныя сацыяльна-філасофскія ідэі марксізму*:

– развіццё чалавечага грамадства разумеецца як паступальны працэс, у аснове якога знаходзіцца сфера матэрыяльнай вытворчасці;

– у развіцці грамадства вылучаюцца пэўныя ўстойлівыя тыпы – грамадска-эканамічныя фармацыі, спецыфіка якіх вызначаецца пэўным гістарычна абумоўленым спосабам вытворчасці; змена фармацый адбываецца ў выніку змен спосабу вытворчасці, рухавіком якіх выступаюць супярэчнасці паміж развіццём прадукцыйных сіл грамадства і пэўным устойлівым тыпам вытворчых адносін;

– рухавіком гістарычнага прагрэсу з’яўляецца класавая барацьба, вышэйшай праявай якой выступае сацыяльная рэвалюцыя, што разглядаецца як важнейшая ўмова сацыяльнай трансфармацыі;

– сацыяльным ідэалам абвяшчаецца сацыялізм (камунізм), пад якім разумеецца бяскласавае грамадства, заснаванае на калектыўнай уласнасці на сродкі вытворчасці, што павінна прыйсці на змену капіталізму як заканамерны вынік развіцця апошняга;

– пераход ад сацыялізму да капіталізму павінен адбыцца шляхам абумоўленай аб’ектыўнымі фактарамі сацыялістычнай рэвалюцыі, галоўнай рухаючай сілай якой разглядаецца рабочы клас; у выніку сацыялістычнай

рэвалюцыі рабочы клас павінен атрымаць палітычную ўладу ў форме дыктатуры пралетарыяту і, выкарыстоўваючы ўладныя механізмы, ажыццявіць сацыялістычныя мерапрыемствы.

Марксісты Беларусі, як і Расійскай імперыі ў цэлым, акцэнтавалі ўвагу на неабходнасці ажыццяўлення буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі, мэтай якой лічылася ліквідацыя абсалютызму і перажыткаў феадалізму, што павінна было стварыць умовы для паскоранага развіцця капіталізму. Капіталізм разглядаўся як неабходная і непазбежная стадыя грамадскага развіцця, якая створыць неабходныя ўмовы для выспявання сацыялізму. У адрозненне ад народнікаў, марксісты адмаўлялі наяўнасць элементаў сацыялізму ў дакапіталістычных грамадскіх структурах тыпу сялянскай абшчыны.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. марксізм як афіцыйнае вучэнне бальшавіцкай партыі становіцца афіцыйнай ідэалогіяй у Савецкай Расіі і трансфармуецца ў спецыфічную форму – г. зв. марксізм-ленінізм.

## Філасофскія і грамадска-палітычныя ідэі беларускага нацыянальнага руху

Фарміраванне беларускага нацыянальнага руху пачынаецца ў 1880-я гг. Перадумовамі гэтага былі, з аднаго боку, аб'ектыўныя працэсы станаўлення беларускай нацыі, з другога – шматлікія гістарычныя і этнаграфічныя даследаванні XIX ст., якія ўскосна даводзілі самастойнасць беларускага этнасу. Пачатак беларускага нацыянальнага руху звязаны з народніцтвам. У 1880-я гг. у Пецярбургу ствараецца цэнтр беларускага народніцтва на базе беларускага студэнцкага зямляцтва. У 1884 г. на яго аснове ўзнікла *Беларуская сацыял-рэвалюцыйная група "Гоман"*, якая выдала два нумары часопіса з аднайменнай назвай. Аднак у хуткім часе з-за рэпрэсій улады яна спыніла сваё існаванне. Напрыканцы XIX ст. беларуская нацыянальная ідэя народніцкай арыентацыі праяўляецца ў беларускамоўнай літаратуры, якая ў той час фарміруецца; асноўныя яе прадстаўнікі – *Францішак Багушэвіч*, *Янка Лучына*, *Адам Гурыновіч*. У пачатку XX ст. на аснове некалькіх беларускіх культурна-асветніцкіх гурткоў узнікае беларуская палітычная партыя – *Беларуская Сацыялістычная Грамада* (афармляецца ў 1903 г.), якая належала да лагера рэвалюцыйных сіл. Праграма БСГ уяўляла сабой сінтэз ідэй народніцтва і марксізму, а таксама змяшчала патрабаванне стварэння аўтаномнай беларускай дзяржавы ў складзе будучай Расійскай дэмакратычнай федэрацыі.

У перыяд паміж рэвалюцыяй 1905 – 1907 гг. і Першай сусветнай вайной Беларуская Сацыялістычная Грамада згортвае палітычную дзейнасць, і

яе дзеячы пераходзяць да легальнай культурна-асветніцкай працы. У гэты перыяд выходзяць першыя легальныя перыядычныя выданні на беларускай мове – газеты "*Наша доля*" (1906 г., выйшла 6 нумароў) і "*Наша ніва*" (1906 – 1915 гг.), якія выдаваліся ў Вільні. Паступова "Наша ніва" становіцца своеасаблівым цэнтрам беларускага нацыянальнага руху. Пад яе уплывам афармляюцца іншыя органы беларускага друку: сельскагаспадарчы часопіс "*Саха*" (з 1912 г., Вільня), літаратурны месячнік для моладзі "*Лучынка*" (з 1912 г., Мінск), грамадска-палітычны і літаратурны альманах "*Маладая Беларусь*" (з 1912 г., Пецярбург). Сярод найбольш вядомых дзеячаў нашаніўскага руху вылучаюцца *Іван і Антон Луцкевічы, Алаіза Пашкевіч (Цётка), Вацлаў Ластоўскі, Аляксандр Уласаў* і інш. З 1913 г. у Вільні пачала выходзіць штотыднёвая газета "*Беларус*", якая выдавалася прадстаўнікамі беларускага каталіцкага духавенства. У разглядаемы перыяд адбываецца хуткае развіццё беларускай літаратуры, асноўнымі прадстаўнікамі якой з'яўляюцца *Янка Купала* (Іван Луцэвіч), *Якуб Колас* (Канстанцін Міцкевіч), *Цётка* (Алаіза Пашкевіч), *Максім Багдановіч*, *Карусь Каганец* (Казімір Кастравіцкі), *Цішка Гартны* (Зміцер Жылуновіч) і інш. На працягу 1908 – 1914 гг. выдавецтвы "Загляне сонца і ў наша ваконца" (Пецярбург) і "Наша ніва" (Вільня) выдалі 77 беларускіх выданняў агульным лікам 226600 паасобнікаў.

*Асноўныя філасофскія і грамадска-палітычныя ідэі беларускага нацыянальнага руху канца XIX – пачатку XX стст.:*

– абгрунтаванне самастойнасці беларускага этнасу, самабытнасці беларускай мовы і культуры;

– сцвярджэнне ідэі беларускай нацыі як перш за ўсё этнічнай супольнасці (у дадзеным кантэксце вызначальная роля надавалася развіццю беларускай мовы як галоўнага нацыятворчага фактару);

– канцэпцыя беларусаў як плебейскай нацыі з няпоўнай сацыяльнай структурай, у сувязі з чым беларуская нацыянальная ідэя абапіраецца на традыцыю сацыяльна-палітычнага радыкалізму; адбываецца атаясамленне сацыяльнай дыхатаміі з нацыянальнай (пануючыя сацыяльныя слаі – рускія і палякі // працоўныя масы – беларусы);

– сцвярджэнне неабходнасці фарміравання нацыянальнай інтэлектуальнай эліты з прадстаўнікоў беларускага народа, якая павінна выступаць каталізатарам абуджэння ў народзе нацыянальнага духу (у дадзеным кантэксце мела месца адаптацыя народніцкай ідэі самаахвярнай дзейнасці інтэлігенцыі на карысць народа).

Дадзеныя ідэі актуалізавалі патрабаванні стварэння беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці ў выглядзе аўтаноміі ў складзе будучай дэмакра-

тычнай Расійскай федэрацыі, якая павінна паўстаць у выніку рэвалюцыйных перамен (у праграмах беларускага палітычнага руху), развіцця беларускай мовы, культуры, гісторыі, прызнання самога факту існавання беларускай нацыі, барацьбы з русіфікацыяй і паланізацыяй (у дыскурсе культурна-асветніцкага руху "нашаніўскага перыяду").

Спецыфічны варыянт беларускай нацыянальнай ідэі быў прадстаўлены на старонках газеты "Беларус" у 1913 – 1914 гг. Яго асаблівасцю з'яўлялася *пастуліраванне адзінства нацыянальнай культуры, асветы і хрысціянска-каталіцкай рэлігіі.* Газета прапагандавала развіццё нацыянальнай свядомасці сярод беларусаў-католікаў, заахвочвала каталіцкае духавенства да выкарыстання беларускай мовы ў набажэнстве, арыентавалася на сацыяльную гармонію і эвалюцыйны шлях развіцця грамадства.

У якасці альтэрнатывы канцэпцыі беларускай этнічнай нацыі паўстае *канцэпцыя палітычнай нацыі Беларуска-Літоўскага краю,* створаная ў колах польскай ліберальнай інтэлігенцыі Беларусі і Літвы (Л. Абрамовіч, М. Ромер, Р. Скірмунт). Дадзеная канцэпцыя падкрэслівала шматэтнічны характар грамадства на землях былога ВКЛ і неабходнасць яго інтэграцыі на пазаэтнічнай грамадзянска-тэрытарыяльнай аснове.

### ***Асноўныя прадстаўнікі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі беларускага нацыянальнага руху канца XIX – пачатку XX стст.***

***Францішак Багушэвіч*** (1840 – 1900) – беларускі паэт. Аўтар беларускамоўных паэтычных зборнікаў, выдадзеных у Львове "Дудка беларуская" і "Смык беларускі", апавядання "Тралялёначка". У прадмове да зборніка "Дудка беларуская" Ф. Багушэвіч сцвярджае ідэю самабытнасці беларускага народа і яго мовы. Праблема нацыянальнай мовы артыкулюецца як асноўная праблема нацыянальнага жыцця; мова разглядаецца як важнейшая форма адлюстравання духоўнага складу народа, "адзенне душы" ("Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі"). Акцэнтуецца ўвага на неабходнасці стварэння нацыянальнага мастацтва і літаратуры. Ф. Багушэвіч развівае канцэпцыю беларусаў як плебейскай нацыі, а таксама асаблівай місіі нацыянальнай інтэлігенцыі як яе авангарда.

***Вацлаў Ластоўскі*** (1883 – 1938 гг.) – беларускі грамадска-палітычны, навуковы і культурны дзеяч. Аўтар *"Кароткай гісторыі Беларусі"* (1912 г.), у якой прадстаўлена першая спроба стварэння нацыянальна арыентаванай канцэпцыі гісторыі Беларусі. Дадзены твор акцэнтуе ўвагу на наяўнасці ў беларускага народа ўласнай гісторыі, паказвае традыцыі дзяржаўнасці Беларусі ў мінулым і тым самым абгрунтоўвае права беларускага народа на сваю дзяржаўнасць. Пры гэтым перыяд Полацкага княства і раннія часы

ВКЛ ацэньваюцца як “залаты век” беларускай дзяржаўнасці. Дзяржаўныя уніі з Польшчай і ўвядзенне каталіцызму разглядаюцца ў якасці галоўных прычын падзення беларускай дзяржаўнасці. Адказнасць за гэта ўскладаецца на шляхту, якая з карыслівых меркаванняў фактычна адарвалася ад свайго народа, страціўшы нацыянальную глебу і стаўшы чужой для свайго народа. В. Ластоўскі сцвярджае ідэю адраджэння беларускай дзяржаўнасці на аснове абуджэння народнага духа плебейскай нацыі пад уплывам новай нацыянальна свядомай інтэлігенцыі.

***Максім Багдановіч*** (1891 – 1917 гг.) – беларускі паэт, філосаф і гісторык беларускай мовы і літаратуры. Аўтар філасофскага твора “Беларускае Адраджэнне” (1914 г.). У дадзеным творы на аснове вялікага гістарычнага матэрыялу даводзіцца самастойнасць беларускай нацыі. Пры разглядзе гістарычнага шляху беларускага народа сцвярджаецца ідэя “залатога веку” ў эпоху Адраджэння XVI ст. Люблінская унія 1569 г. разглядаецца як каталізатар дэнацыяналізацыі пануючых сацыяльных слаёў беларускага народа і пераўтварэння апошняга ў этнас з няпоўнай сацыяльнай структурай, пазбаўлены нацыянальнай самасвядомасці. У якасці станоўчай ідэі пастулíруецца адраджэнне беларускай нацыі пры дапамозе дзейнасці новай інтэлектуальнай эліты, якая паходзіць з самога народу.

Істотны ўплыў на эвалюцыю дыскурсу беларускага нацыянальнага руху аказалі падзеі Першай сусветнай вайны, рэвалюцый 1917 г. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. аднаўляецца палітычная дзейнасць БСГ, а таксама фарміруюцца іншыя беларускія палітычныя арганізацыі, якія ставяць мэту стварэння беларускай дзяржаўнасці. Курс на рэалізацыю дадзенай мэты быў абвешчаны на Усебеларускім з’ездзе, які адбыўся 5 – 17 снежня 1917 г. Незацікаўленасць расійскіх уладаў у вырашэнні беларускага нацыянальнага пытання, а таксама акупацыя большай часткі тэрыторыі Беларусі нямецкімі войскамі ў канцы лютага – пачатку сакавіка 1918 г. прывялі большасць дзеячаў беларускага нацыянальнага руху да ідэі аб поўнай незалежнасці Беларусі. Створаны Усебеларускім з’ездам Выканаўчы камітэт (пазней Рада БНР) 21 лютага, 9 сакавіка і 25 сакавіка выдае адпаведна тры Устаўныя граматы 1918 г. *Трэцяя Устаўная грамата Рады БНР* дэкларавала поўную дзяржаўную незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі. *Асноўныя ідэі, змешчаныя ва Устаўных граматах Рады БНР*:

– ідэя поўнага дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі ў этнаграфічных межах рассялення беларускага этнасу;

– абвяшчэнне дэмакратычных правоў і свабод грамадзян;

– ідэя фарміравання дэмакратычных інстытутаў улады шляхам правядзення свабодных выбараў на аснове ўсеагульнага выбарчага права;

– ідэя сацыялізацыі зямлі і яе ўраўняльнага размеркавання паміж працоўнымі;

– увядзенне васьмігадзіннага працоўнага дня;

– абарона правоў нацыянальных меншасцяў.

Аднак абвяшчэнне БНР ва ўмовах фактычнага падзелу тэрыторыі Беларусі паміж Германіяй і Савецкай Расіяй не прывяло да практычнай рэалізацыі ідэй, дэклараваных ва Устаўных граматах. Пасля завяршэння Першай сусветнай вайны і пераходу большай часткі тэрыторыі Беларусі пад уладу Савецкай Расіі быў ажыццёўлены альтэрнатыўны БНР савецкі варыянт беларускай дзяржаўнасці. 1 студзеня 1919 г. была абвешчана Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка (БССР), а 2 – 3 лютага 1919 г. на І Усебеларускім з’ездзе Саветаў зацверджана першая Канстытуцыя БССР. *Асноўныя ідэі, пакладзеныя ў аснову беларускай савецкай дзяржаўнасці*:

– дзяржаўны суверэнітэт Беларусі пры захаванні цеснага ваенна-палітычнага і эканамічнага саюза з усімі савецкімі рэспублікамі;

– прыярытэт задач сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі перад задачамі нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва;

– класавы падыход пры фарміраванні інстытутаў дзяржаўнай улады (“дыктатура пралетарыяту”);

– абвяшчэнне дзяржаўнай уласнасці галоўным сектарам эканамічнай сістэмы.

Падзеі савецка-польскай вайны 1919 – 1920 гг. прывялі да ліквідацыі БССР. Другое абвяшчэнне БССР адбылося 31 ліпеня 1920 г.; тэрыторыя абвешчанай дзяржавы складала 6 паветаў Мінскай губерні. Астатняя тэрыторыя Беларусі была падзелена паводле Рыжскага мірнага дагавору 18 сакавіка 1921 г. паміж Польшчай і Савецкай Расіяй. У снежні 1922 г. БССР разам з іншымі савецкімі рэспублікамі ўвайшла ў склад Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР).

Падзеі 1917 – 1921 гг. прывялі да абгрунтавання ў межах беларускага нацыянальнага руху ідэі нацыянальнай беларускай дзяржаўнасці. Найбольш глыбокі тэарэтычны аналіз дадзенай ідэі прадстаўлены ў творчасці Ігната Абдзіраловіча.

***Ігнат Абдзіраловіч*** (Усевалад Канчэўскі) (1896 – 1923 гг.) – беларускі грамадскі дзеяч, публіцыст. Аўтар філасофскага эсэ “*Адвечным шляхам*” (1921 г.). У аснове вучэння І. Абдзіраловіча знаходзяцца прынцыпы філасофіі жыцця (ідэя жыццёвага парыву, пастаяннай зменлівасці і цякучасці форм жыцця). Адлюстраванне плыні жыцця ў грамадстве прыводзіць да стварэння пэўных форм, характэрных для асобных народаў. Спецыфіка жыцця беларускага народа заключаецца, па-першае, ў памежным геаграфічна-культурным становішчы паміж Захадам і Усходам (аналагічная

сітуацыя ўласціва для ўкраінцаў і балканскіх славян), па-другое, у адмоўнай ролі ў яго гістарычным развіцці эліты (ідэя “здрады” шляхты, а потым інтэлігенцыі інтарэсам і жаданням простага народу). У выніку Беларусь аказалася полем узаемадзеяння палітычных і культурных уплываў Усходу і Захаду. І. Абдзіраловіч падкрэслівае адмоўную ролю дадзеных уплываў у жыцці беларускага народа, іх імкненне да гегемоніі, асіміляцыі і падпарадкавання. Магчымасць пераадолення заходніх і ўсходніх уплываў звязваецца са стварэннем уласных беларускіх форм жыцця. У адрозненне ад заходніх і ўсходніх форм, арыентаваных на канструяванне устойлівых, стандартызаваных узораў сацыяльна-культурнай дзейнасці, беларускія формы жыцця павінны быць цякучымі і зменлівымі, садзейнічаць максімальнаму развіццю здольнасцяў і магчымасцяў чалавека, яго духоўнасці. Знаходжанне і рэалізацыя дадзеных форм звязваюцца з творчасцю, заснаванай на пастаяннай адсутнасці самазадавальнення, вечным імкненні спасцігнуць глыбіні быцця. Ажыццяўленне сацыяльна-культурнай творчасці беларускага народа ў якасці неабходнай умовы патрабуе дзяржаўнай незалежнасці Беларусі. Сацыяльны ідэал І. Абдзіраловіча грунтаваўся на прынцыпах дэмакратычнага сацыялізму. Гістарычная перспектыва звязвалася ім са знікненнем сацыяльна-эканамічнага і сацыяльна-палітычнага прымусу, на месца чаго павінна прыйсці аб’яднанне грамадзян у супольнасці, заснаваныя на гарызантальных сувязях кааперацыі і салідарнасці, дзе вытворчасць, абмен, размеркаванне, спажыванне, кіраванне і асвета будуць ажыццяўляцца ў межах свабодных асацыяцый вытворцаў і спажыўцоў шляхам развіцця свабоднай творчай ініцыятывы, пастаяннага абнаўлення форм жыцця.

*Такім чынам, філасофская і грамадска-палітычная думка Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX стст. развівалася па-за межамі прафесійнай філасофскай культуры. У дадзены перыяд адсутнічаюць творы з сістэматычным выкладаннем філасофскіх праблем. Асноўныя філасофскія ідэі фарміруюцца пераважна ў межах сацыяльна-палітычнай думкі. Дадзеная думка была прадстаўлена ў разглядаемы перыяд ідэямі заходнерусізму, лібералізму, палітычнага радыкалізму, а таксама беларускага нацыянальнага руху. У межах апошніх адбываецца фарміраванне нацыянальна арыентаванай беларускай філасофіі.*

### Кантрольныя пытанні да тэмы 6

1. Якім чынам асаблівасці гістарычнага развіцця вызначылі спецыфіку філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX стст.?

2. Ахарактарызуйце асноўныя накірункі сацыяльна-палітычнай думкі Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX стст.

3. Назавіце асноўныя рысы ідэалогіі заходнерусізму.

4. Параўнайце заходнерускія канцэпцыі К. Гаворскага і М. Каяловіча.

5. Якія рэлігійна-філасофскія ідэі выказваюцца ў працах Д. Скрынчанкі?

6. Якія факты дазваляюць прасачыць эвалюцыю ідэй лібералізму ў грамадска-палітычнай думцы Беларусі XIX ст.?

7. У чым сутнасць ідэалогіі ліберальнага народніцтва?

8. Якую ролю адыграла газета “Минский листок” у распаўсюджанні ідэй ліберальнага народніцтва?

9. Якія асноўныя ідэі змяшчаліся ў праграмах ліберальных партый на тэрыторыі Беларусі ў пачатку XX ст.?

10. Якія можна вылучыць накірункі ідэй палітычнага радыкалізму ў Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX стст.?

11. Назавіце асаблівасці ідэй шляхецкага рэвалюцыянарызму напярэдадні і падчас паўстання 1863 – 1864 гг.

12. Праз дзейнасць якіх арганізацый распаўсюджваліся ідэі рэвалюцыйнага народніцтва на тэрыторыі Беларусі?

13. На якіх прынцыпах грунтуецца ідэалогія рэвалюцыйнага народніцтва?

14. Параўнайце ідэі асноўных накірункаў рэвалюцыйнага народніцтва.

15. Ахарактарызуйце асноўныя сацыяльна-філасофскія ідэі марксізму.

16. Зрабіце параўнальную характарыстыку грамадска-палітычных ідэй рэвалюцыйнага народніцтва і марксізму.

17. Праілюструйце працэс эвалюцыі беларускага нацыянальнага руху ў канцы XIX – пачатку XX стст.

18. Якія асноўныя філасофскія і сацыяльна-палітычныя ідэі сцвярджаліся прадстаўнікамі беларускага нацыянальнага руху канца XIX – пачатку XX стст.?

19. Назавіце асноўных прадстаўнікоў ідэалогіі беларускага нацыянальнага руху канца XIX – пачатку XX стст.

20. Вызначце ролю “Нашай нівы” ў станаўленні беларускай нацыянальнай ідэі.

21. Параўнайце грамадска-палітычныя ідэі, пакладзеныя ў аснову беларускай дзяржаўнасці ў форме БНР і БССР.

22. Дайце характарыстыку сацыяльна-філасофскай канцэпцыі І. Абдзіраловіча.

# ТЭМА 7. ПЕРЫЯД ПАНАВАННЯ МАРКСІСЦКА-ЛЕНІНСКАЙ ФІЛАСОФІІ (1920-я – 1980-я гг.)

## Гістарычныя ўмовы развіцця філасофскай і сацыяльна-палітычнай думкі

У сферы сацыяльна-эканамічных адносін адбываецца фарміраванне цэнтралізаванай каманднa-адміністрацыйнай сістэмы, заснаванай на жорсткім дзяржаўным рэгуляванні ўсіх сфер эканомікі; пры гэтым недзяржаўны сектар эканомікі быў практычна ліквідаваны. Ва ўмовах станаўлення дадзенай сістэмы праведзена індустрыялізацыя; пануючым сектарам эканомікі становіцца прамысловасць, цесна інтэграваная ў агульнасаюзную гаспадарчую сістэму.

У сферы сацыяльна-палітычных адносін ключавым момантам становіцца ўваходжанне тэрыторыі Беларусі ў склад БССР і СССР. У 1920-я – 1930-я гг. землі Беларусі былі падзелены паміж Польшчай і СССР (у 1924 і 1926 гг. у СССР адбылася перадача ўсходнебеларускіх тэрыторый ад Савецкай Расіі да БССР). Пасля пачатку Другой сусветнай вайны ў 1939 г. Заходняя Беларусь была далучана да БССР і СССР, і з гэтага часу ўся тэрыторыя Беларусі знаходзілася ў межах СССР (у 1941 – 1944 гг. часова акупавана войскамі нацысцкай Германіі). У савецкі перыяд у БССР, як і ў СССР у цэлым, адбываецца станаўленне таталітарнага рэжыму, арыентаванага на жорсткі кантроль за ўсімі сферамі жыцця грамадства; вядучую ролю ў яго функцыянаванні адыгрывала пануючая камуністычная партыя. Найбольшай ступені рэпрэсіўнасці дадзены рэжым дасягнуў у 1930-я – пачатку 1950-х гг. У 1950-я – 1980-я гг. адбывалася паступовае аслабленне рэпрэсіўнасці палітычнай сістэмы. У другой палове 1980-х гг. пад уплывам нарастання комплекса грамадскіх супярэчнасцяў назіраецца крызіс савецкага рэжыму, які завяршыўся яго падзеннем і распадам СССР у 1991 г.

У сферы духоўнага жыцця адбываліся наступныя працэсы:

1) устанаўленне афіцыйнай марксісцка-ленінскай ідэалогіі; падаўленне ўсіх альтэрнатыўных ідэалагічных накірункаў;

2) стварэнне разгалінаванай адукацыйнай сістэмы, якая ўключае ў сябе шматлікія вышэйшыя навучальныя ўстановы;

3) фарміраванне сістэмы навуковых інстытутаў, аб’яднаных у Акадэмію навук БССР;

4) правядзенне палітыкі беларусізацыі ў 1920-я гг.; яе паступовая замена палітыкай русіфікацыі ў 1930-я – 1980-я гг. пад лозунгам стварэння новай супольнасці – савецкага народа;

5) жорсткі ідэалагічны кантроль над усімі сферамі духоўнага жыцця грамадства (друк, літаратура, мастацтва).

## Спецыфічныя рысы філасофскай і грамадска-палітычнай думкі 1920-х – 1980-х гг.

Філасофская і грамадска-палітычная думка Беларусі савецкага перыяду развіваецца ва ўмовах фарміравання сеткі вышэйшых навучальных устаноў, дзе і адбываецца станаўленне прафесійнай філасофскай культуры. У Беларускім дзяржаўным універсітэце (створаны ў 1921 г.) наладжваецца падрыхтоўка спецыялістаў з філасофскай адукацыяй (з 1947 г.). У 1920-я гг. філасофскія даследаванні праводзяцца ў Інстытуце беларускай культуры (1922 – 1929 гг.), які ў 1929 г. быў пераўтвораны ў Акадэмію навук БССР. Цэнтрам навуковых даследаванняў у галіне філасофіі становяцца Інстытут філасофіі і права Акадэміі навук БССР (створаны ў 1931 г., зараз Інстытут філасофіі НАН РБ) і Беларускі дзяржаўны універсітэт.

Афіцыйным накірункам філасофскай і грамадска-палітычнай думкі становіцца марксізм-ленінізм. На яго аснове праводзіліся ўсе акадэмічныя навуковыя даследаванні, наладжвалася выкладанне філасофскіх дысцыплін у навучальных установах і ажыццяўлялася прапаганда філасофскіх ведаў у грамадстве. Усе іншыя філасофскія школы і накірункі, альтэрнатыўныя марксізму-ленінізму, абвяшчаліся памылковымі і іх афіцыйнае распаўсюджанне забаранялася.

*Марксізм-ленінізм* – афіцыйнае філасофскае вучэнне ў СССР, заснаванае на дагматызаванай інтэрпрэтацыі марксісцкай філасофіі для абгрунтавання створанай у СССР грамадскай сістэмы. Марксізм-ленінізм уключаў у сябе дзве састаўныя часткі:

– дыялектычны матэрыялізм (вучэнне аб фундаментальных прынцыпах функцыянавання і развіцця асноўных форм быцця на аснове матэрыялістычнай дыялектыкі);

– гістарычны матэрыялізм (вучэнне аб функцыянаванні і развіцці грамадства на аснове матэрыялістычнай дыялектыкі).

У развіцці філасофскай і грамадска-палітычнай думкі савецкага перыяду можна вылучыць два этапы:

1) 1920-я – 1940-я гг.

2) 1950-я – 1980-я гг.

*Філасофская думка 1920-х – 1940-х гг.* развівалася ва ўмовах замацавання марксізму-ленінізму як афіцыйнай ідэалагічнай сістэмы. Яго праграмнымі творамі сталі “Пра значэнне ваяўнічага матэрыялізму” У. Леніна

(1922 г.) і “Кароткі курс гісторыі ВКП(б)” І. Сталіна (1938 г.). Яе характэрнымі рысамі былі крайняя спрошчанасць і схематычнасць пры вывучэнні філасофскіх праблем з пазіцый марксізму-ленінізму, непрымірымае стаўленне да альтэрнатыўных накірункаў філасофскай думкі, якія абвяшчаліся “рэакцыйнымі”, “ідэалістычнымі”.

*Асноўнымі прадстаўнікамі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі дадзенага перыяду з’яўляліся:*

***Сямён Якаўлевіч Вольфсан*** (1894 – 1941 гг.) – прафесар БДУ (з 1921 г.), акадэмік АН БССР (з 1928 г.), першы дырэктар Інстытута філасофіі і права АН БССР (з 1931 г.). Аўтар прац “Дыялектычны матэрыялізм” (ч. 1 – 2, 1922 г.; ч. 1 – 3, 1926 г.), “Інтэлігенцыя як сацыяльна-эканамічная катэгорыя” (1926 г.), “Дыялектычны матэрыялізм і медыцына” (1929 г.) і інш. Сваёй галоўнай задачай С. Я. Вольфсан ставіць абгрунтаванне навуковага характару дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізму, узаемасувязі філасофіі з прыродазнаўчымі навукамі. Матэрыялістычная дыялектыка разглядалася ім як адзіны і галоўны метад пазнання і пераўладкавання рэчаіснасці. У сувязі з гэтым С. Я. Вольфсан настойваў на абавязковым выкарыстанні дадзенага метаду ва ўсіх навуковых даследаваннях. Рэзкай крытыцы падвяргаў пазітывізм за спробу выключыць філасофскія веды і метады з навукі.

***Бернард Эмануілавіч Быхоўскі*** (1898 – 1980 гг.) – выкладчык БДУ і Цэнтральнай партыйнай школы пры ЦК КП(б)Б (1923 – 1929 гг.). Потым працаваў ва універсітэтах і навуковых установах у Ташкенце і Маскве. Прафесар (1929 г.); доктар філасофскіх навук (1941 г.). Сфера навуковых інтарэсаў – тэорыя дыялектычнага матэрыялізму і гісторыя еўрапейскай філасофіі. Асноўныя працы: “Нарыс гісторыі дыялектычнага матэрыялізму” (1930 г.), “Ворагі і фальсіфікатары марксізму” (1933 г.), “Асноўныя накірункі сучаснай ідэалістычнай філасофіі” (1959 г.). Адзін з аўтараў “Гісторыі філасофіі” (т. 1 – 3, 1940 – 1943 гг.). Асновай філасофскіх поглядаў Б. Э. Быхоўскага з’яўляецца дыялектыка-матэрыялістычная метадалогія. Акцэнтавана падкрэсліваецца ідэя партыйнасці філасофіі; пастуліруецца тэзіс пра антаганістычную барацьбу філасофскай думкі двух лагераў – матэрыялістычнага і ідэалістычнага – у кантэксце марксісцкай тэорыі класавай барацьбы.

***Саламон Захаравіч Кацэнбоген*** (1889 – 1946 гг.) – прафесар БДУ (1921 – 1925 гг.); выкладаў гісторыю і філасофію. У 1925 – 1946 гг. працаваў ва універсітэтах Саратава, Ленінграда, Свярдлоўска. Сфера навуковых інтарэсаў – тэарэтычныя праблемы марксісцка-ленінскай філасофіі і сацыялогіі, сацыяльна-эканамічная гісторыя. Асноўныя філасофскія працы: “Да пытання пра праблему заканамернасці гістарычнага працэсу” (1925 г.),

“Дыялектычны матэрыялізм і механістычны светапогляд” (1925 г.), “Што такое марксізм: філасофскія і сацыялагічныя падставы” (1925 г.), “Марксізм і сацыялогія” (1926 г.).

*Філасофская думка 1950-х – 1980-х гг.* развівалася ва ўмовах, калі марксізм-ленінізм быў канчаткова замацаваны ў якасці своеасаблівага дагматычнага кодэксу. У той жа час у дадзены перыяд адбываецца адыход ад спрошчанага тлумачэння філасофскіх пытанняў і пераход да фундаментальнага даследавання шырокага кола праблем філасофскага характару. Пры гэтым адбывалася адаптацыя да марксісцка-ленінскай тэорыі асобных элементаў іншых філасофскіх вучэнняў: аналітычнай філасофіі, фенаменалогіі, герменеўтыкі.

*Асноўныя накірункі філасофскіх даследаванняў 1950-х – 1980-х гг.:*

1) *Даследаванні ў галіне гісторыі філасофіі.* Асноўныя прадстаўнікі: І. М. Лушчыцкі, А. А. Бірала, Э. К. Дарашэвіч, У. М. Конан, А. С. Майхровіч, Н. Н. Мохнач, С. А. Падокшын, Е. С. Пракошына, А. Я. Цукерман, В. Ф. Шалькевіч, А. І. Яфрэмава.

2) *Даследаванні ў галіне філасофіі прыроды.* Асноўны прадстаўнік – А. П. Вадап’янаў.

3) *Даследаванні ў галіне тэорыі пазнання.* Асноўныя прадстаўнікі: В. Ф. Беркаў, А. Н. Елсукоў, І. І. Жбанкова, А. І. Зелянкоў, Г. А. Левін, В. К. Лукашэвіч, М. А. Слемнеў, Д. Н. Шыраканаў.

4) *Даследаванні ў галіне філасофіі навукі.* Асноўныя прадстаўнікі: Н. І. Жукаў, А. К. Манееў, Е. В. Петушкова, В. С. Сцёпін.

5) *Даследаванні ў галіне сацыяльнай філасофіі.* Асноўныя прадстаўнікі: Е. М. Бабосаў, Г. П. Давідзюк, Э. М. Сарока, Ю. А. Харын.

6) *Даследаванні ў галіне філасофіі культуры.* Асноўныя прадстаўнікі: Т. І. Адула, А. І. Галаўнёў, Н. І. Крукоўскі, С. В. Марцелеў, А. А. Міхайлаў.

*Такім чынам, філасофская і грамадска-палітычная думка Беларусі 1920-х – 1980-х гг. развівалася ва ўмовах станаўлення савецкай філасофскай культуры. Асноўныя філасофскія ідэі фарміруюцца ў межах афіцыйнай ідэалогіі марксізму-ленінізму. У развіцці філасофскай думкі дадзенага перыяду мае месца эвалюцыя ад спрошчана-схематычнага аналізу філасофскіх праблем у рэчышчы дагматызаванага марксізму-ленінізму да фундаментальнага даследавання шырокага кола праблем філасофскага характару.*

## Кантрольныя пытанні да тэмы 7

1. У чым асаблівасці гістарычнага развіцця Беларусі ў савецкі перыяд?

2. Які ўплыў аказваў палітычны рэжым СССР на асаблівасці развіцця філасофскай думкі Беларусі?

3. У якіх навуковых і адукацыйных інстытутах праводзіліся даследаванні ў галіне філасофіі ў 1920-я – 1980-я гг.?

4. У чым заключаецца сутнасць філасофіі марксізму-ленінізму? Якую структуру яна мае?

5. Параўнайце спецыфіку двух этапаў у развіцці беларускай савецкай філасофіі.

6. Назавіце асноўных прадстаўнікоў філасофскай думкі Беларусі 1920-х – 1940-х гг.

7. Якім чынам тлумачылася матэрыялістычная дыялектыка ў беларускай марксісцка-ленінскай філасофіі 1920-х – 1940-х гг.?

8. Якія асноўныя накірункі вылучаюцца ў савецкай філасофіі Беларусі 1950-х – 1980-х гг.?

9. Назавіце асноўных прадстаўнікоў філасофскай думкі Беларусі 1950-х – 1980-х гг.

# ЛІТАРАТУРА

**Асноўная:**

1. Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. – Мінск, 2003.

2. Бирало, А. А. Философская и общественная мысль в Белоруссии и Литве в конце XVII – середине XVIII вв. / А. А. Бирало. – Минск, 1971.

3. Падокшын, С. А. Дзяржаўнасць і права Беларусі са старажытных часоў да канца XVI ст. У 4 ч. Ч. 4: Палітычная і прававая думка Беларусі XVI – XVII стст. / С. А. Падокшын, С. Ф. Сокал – 2-е выд., дап. – Мінск, 1999.

4. Дорошевич, Э. К. Философия Просвещения в Белоруссии / Э. К. Дорошевич. – Минск, 1971.

5. Еворовский, В. Б. Философская мысль Киевской Руси XI – XIII вв.: Тенденции становления / В. Б. Еворовский. – Минск, 1996.

6. Ефремова, А. И. Из истории общественной мысли Белоруссии конца XIX – начала XX века / А. И. Ефремова. – Минск, 1972.

7. Идеи гуманизма в общественно-политической и философской мысли Белоруссии / редколл.: К. П. Буслов [и др.]. – Минск, 1977.

8. Идеи материализма и диалектики в Белоруссии (дооктябрьский период) / редколл.: К. П. Буслов [и др.]. – Минск, 1980.

9. Из истории свободомыслия и атеизма в Белоруссии / Е. С. Прокошина, Л. Л. Короткая, А. А. Чудникова [и др.]; под ред. Е. М. Бабосова, Г. М. Лившица. – Минск, 1978.

10. Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии: Избранные произведения XVI – начала XIX вв. / под общ. ред. В. А. Сербента. – Минск, 1962.

11. Козел, А. А. Философская мысль Беларуси / А. А. Козел. – Минск, 2004.

12. Лушчыцкі, І. Н. Нарысы па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі ў Беларусі другой паловы XIX веку / І. Н. Лушчыцкі. – Мінск, 1958.

13. Майхрович, А. С. Философская и общественно-политическая мысль Белоруссии и Литвы / А. С. Майхрович [и др.]. – Минск, 1987.

14. Мохнач, Н. Н. Общественно-политическая и этическая мысль Белоруссии начала XIX в. / Н. Н. Мохнач. – Минск, 1985.

15. Мохнач, Н. Н. От Просвещения к революционному демократизму (Общественно-политическая и философская мысль Белоруссии конца 10-х – начала 50-х годов XIX в.) / Н. Н. Мохнач. – Минск, 1976.

16. Мысліцелі і асветнікі Беларусі (X – XIX стст.): энцыклапедычны даведнік / склад. Г. А. Маслыка; гал. рэд. Б. І. Сачанка. – Мінск, 1995.

17. Очерки истории философской и социологической мысли Белоруссии / В. М. Конон [и др.]; редколл.: К. П. Буслов [и др.]. – Минск, 1973.

18. Падокшын, С. А. Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры / С. А. Падокшын. – Мінск, 2003.

19. Падокшын, С. А. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі / С. А. Падокшын. – Мінск, 1990.

20. Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII вв. / В. В. Дубровский, М. В. Кашуба, С. А. Подокшин [и др.]; редколл.: А. С. Майхрович, С. А. Подокшин, Д. И. Широканов. – Минск, 1991.

21. Подокшин, С. А. Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы (вторая половина XVI – начало XVII вв.) / С. А. Подокшин. – Минск, 1970.

22. Сокол, С. Ф. Политическая и правовая мысль в Белоруссии XVI – первой половины XVII вв. / С. Ф. Сокол. – Минск, 1984.

23. Сокол, С. Ф. Социологическая и политическая мысль Белоруссии во второй половине XVI в. / С. Ф. Сокол. – Минск, 1974.

24. Старостенко, В. В. Свободомыслие и свобода совести в Беларуси: очерки истории / В. В. Старостенко. – Могилев, 2004.

25. Чыгрынаў, П. Г. Грамадская думка ў Беларусі: палітычна-гістарычны аспект X – пачатку XX стст. / П. Г. Чыгрынаў. – Мінск, 1996.

26. Шалькевіч, В. Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В. Ф. Шалькевіч. – Мінск, 2002.

27. Шалькевіч, В. Ф. Філасофская думка ў Беларусі / В. Ф. Шалькевіч. – Мінск, 1976.

**Дадатковая:**

28. Абдзіраловіч, І. Адвечным шляхам: Дасьледзіны беларускага светагляду / І. Абдзіраловіч. – Мінск, 1994.

29. Алексютовіч, М. А. Скарына, яго дзейнасць і светапогляд / М.А. Алексютовіч. – Мінск, 1958.

30. Бабосов, Е. М. Развитие марксистско-ленинской философии в БССР (20-70-е годы) / Е. М. Бабосов [и др.]. – Минск, 1984.

31. Бабкоў, І. М. Філасофія Яна Снядэцкага і станаўленне позneасветніцкай рацыянальнасці ў Беларусі і Літве (першая трэць XIX ст.) / І. М. Бабкоў. – Мінск, 2002.

32. Бирало, А. А. Философские проблемы в науке эпохи Просвещения в Белоруссии и Литве / А. А. Бирало. – Минск, 1979.

33. Будовниц, И. У. Общественно-политическая мысль Древней Руси (XI – XIV вв.) / И. У. Будовниц. – М., 1960.

34. Голенищев-Кутузов, И. Н. Гуманизм у восточных славян (Украина и Белоруссия) / И. Н. Голенищев-Кутузов. – М., 1963.

35. Громов, Н. М. Русская философская мысль X – XVII вв. / Н. М. Громов, Н. С. Козлов. – М., 1990.

36. Дорошевич, Э. К. Аниол Довгирд – мыслитель эпохи Просвещения / Э. К. Дорошевич. – Минск, 1967.

37. Дорошевич, Э. К. Очерки истории эстетической мысли Белоруссии / Э. К. Дорошевич, В. М. Конон. – Минск, 1972.

38. Дубровский, В. В. Казимир Нарбут / В. В. Дубровский. – Минск, 1979.

39. Замалеев, А. Ф. Философская мысль в средневековой Руси (XI – XVI вв.) / А. Ф. Замалеев. – Л., 1987.

40. Замалеев, А. Ф. Мыслители Киевской Руси / А. Ф. Замалеев, В. А. Зоц. – Киев, 1987.

41. История Вильнюсского университета (1579 – 1979) / отв. ред. С. Лазутка. – Вильнюс, 1979.

42. Кашуба, М. В. Георгий Конисский / М. В. Кашуба. – М., 1979.

43. Конон, В. М. Демократическая эстетика Белоруссии / В. М. Конон. – Минск, 1971.

44. Конон, В. М. От Ренессанса к классицизму (Становление эстетической мысли Белоруссии в XVI – XVIII вв.) / В. М. Конон. – Минск, 1978.

45. Короткая, Т. П. Религиозная философия в Беларуси начала XX века / Т. П. Короткая. – Минск, 1993.

46. Короткий, В. Г. Творческий путь Мелетия Смотрицкого / В. Г. Короткий. – Минск, 1987.

47. Коршунов, А. Ф. Афанасий Филиппович / А. Ф. Коршунов. – Минск, 1965.

48. Кутузова, Н. А. Нация, религия и государственность в полемической литературе Беларуси конца XVI – первой половины XVII вв. / Н. А. Кутузова. – Минск, 2005.

49. Лихачев, Д. С. Развитие русской литературы X – XVII вв. Эпохи и стили / Д. С. Лихачев. – Л., 1973.

50. Лойка, А. А. Адам Міцкевіч і беларуская літаратура / А. А. Лойка. – Минск, 1959.

51. Майхрович, А. С. Белорусские революционные демократы. Важнейшие аспекты мировоззрения / А. С. Майхрович. – Минск, 1977.

52. Майхрович, А. С. Поиск истинного бытия и человека: Из истории философии и культуры Беларуси / А. С. Майхрович. – Минск, 1962.

53. Майхрович, А. С. Янка Купала и Якуб Колас. Вопросы мировоззрения / А. С. Майхрович. – Минск, 1982.

54. Мохнач, Н. Н. Идейная борьба в Белоруссии в 30 – 40-е годы XIX в. / Н. Н. Мохнач. – Минск, 1971.

55. Падокшын, С. А. Іпацій Пацей: Царкоўны дзеяч, мысліцель, пісьменнік на пераломе эпох / С. А. Падокшын. – Мінск, 2001.

56. Падокшын, С. А. Унія. Дзяржаўнасць. Культура (філасофска-гістарычны аналіз) / С. А. Падокшын. – Мінск, 1998.

57. Падокшын, С. А. Этычная думка ў культуры Беларусі XVI – XVII вв. / С. А. Падокшын. – Мінск, 2004.

58. Парэцкі, Я. І. Сымон Будны / Я. І. Парэцкі. – Мінск, 1975.

59. Подокшин, С. А. Скорина и Будный. Очерк философских взглядов / С. А. Подокшин. – Минск, 1974.

60. Подокшин, С. А. Франциск Скорина / С. А. Подокшин. – Минск, 1981.

61. Прокошина, Е. С. Мелетий Смотрицкий / Е. А. Прокошина. – Минск, 1966.

62. Прокошина, Е. С. Очерк свободомыслия и атеизма в Белоруссии в XIX веке / Е. С. Прокошина. – Минск, 1973.

63. Саверчанка, І. В. Сымон Будны – гуманіст і рэфарматар / І. В. Саверчанка. – Мінск, 1993.

64. Старостенко, В. В. Общественно-философская мысль и национальное самосознание белорусов XVI – XVII вв.: Очерки истории / В. В. Старостенко. – Могилев, 1999.

65. Фалькович, С. М. Идейная борьба в польском освободительном движении 50 – 60-х гг. XIX вв. / С. М. Фалькович. – М., 1966.

66. Федорова, Т. Н. Общественно-политическая мысль в Белоруссии и “Минский листок” (1886 – 1902) / Т. Н. Федорова. – Минск, 1966.

67. Цукерман, А. Я. Философская мысль в Белоруссии середины XVIII века / А. Я. Цукерман. – Минск, 1980.

68. Цьвікевіч, А. “Западно-русизм”. Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. / А. Цьвікевіч. – Мінск, 1993.

69. Юхо, Я. А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі / Я. А. Юхо. – Мінск, 1992.

## ДАДАТАК

## ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК

*Агіяграфія* – жанр сярэднявечнай літаратуры, які прадугледжваў мастацка-ідэалізаванае апісанне жыццёвага шляху і рэлігійных подзвігаў хрысціянскіх "святых" ("жыція святых").

*Адраджэнне (Рэнесанс)* – агульнаеўрапейскі культурны рух XIV – XVI стст., фармальна накіраваны на актуалізацыю антычнай культурнай спадчыны, у межах якога набылі сцвярджэнне прынцыпы антрапацэнтрызму і гуманізму.

*"Айцы царквы"* – ганаровы тытул, які з канца IV ст. выкарыстоўваецца ў адносінах да знакамітых тэолагаў і арганізатараў хрысціянскай царквы, аўтарытэт якіх адыграў важную ролю ў станаўленні хрысціянскай дагматыкі, фарміраванні канона Святога Пісання і іерархічнай арганізацыі царквы.

*Аналітычная філасофія* – накірунак заходняй філасофіі XX ст., у цэнтры ўвагі якога знаходзіцца аналіз мовы, што разглядаецца ў якасці галоўнай перадумовы філасофскага даследавання мыслення і ведаў.

*Антрапалагізм* – філасофскі прынцып, згодна з якім цэнтральнай праблемай філасофска-тэарэтычнай рэфлексіі становіцца чалавечая асоба ва ўсёй сукупнасці праяў яе існавання.

*Антрапацэнтрызм* – філасофскі прынцып, згодна з якім чалавек прызнаецца вышэйшай каштоўнасцю, цэнтральным элементам светабудовы, носьбітам свабоднай волі, стваральнікам культурнага свету.

*Антыклерыкалізм* – сацыяльна арыентаваная крытычная ўстаноўка адносна месца рэлігійных інстытутаў у грамадстве.

*Апрыёрызм* – філасофская канцэпцыя, згодна з якой у працэсе пазнання галоўная роля належыць ведам, атрыманым незалежна ад вопыту (апрыёрным ведам), якія змяшчаюцца ў свядомасці аўтаномна адносна знешняга свету.

*Арганіцызм* – светапоглядны прынцып, згодна з якім грамадская сістэма разглядаецца па аналогіі з біялагічным арганізмам.

*Арыстакратычная манархія* – форма дзяржаўнага праўлення, пры якой улада спадчыннага манарха абмяжоўваецца вузкім колам палітычнай эліты (арыстакратыяй).

*Асветніцтва* – агульнаеўрапейскі грамадскі і культурны рух XVIII ст., накіраваны на перабудову ўсіх сфер сацыяльнага жыцця на аснове абстрактна сканструяваных прынцыпаў розуму.

*Атэізм* – ментальна-светапоглядная ўстаноўка, заснаваная на адмаўленні існавання звышнатуральнага пачатку быцця.

*Брацкія школы* – сярэднія навучальныя ўстановы, якія дзейнічалі пры праваслаўных і уніяцкіх брацтвах Рэчы Паспалітай у канцы XVI – XVIII стст.

*Герменеўтыка* – у шырокім сэнсе накірунак у філасофіі і гуманітарных навуках XIX – XX стст., які разглядае разуменне як умову быцця; у вузкім сэнсе – сукупнасць правіл і тэхнік тлумачэння тэкстаў шэрагу галін ведаў.

*Гістарызм* – філасофска-метадалагічны прынцып, які прадугледжвае разгляд грамадства як складанай дынамічнай сістэмы, што знаходзіцца ў працэсе пастаяннага змянення і развіцця.

*Гістарычны матэрыялізм* – вучэнне марксісцкай філасофіі, заснаванае на метадалагічным аналізе гісторыі грамадства як паступальнага працэсу, у аснове якога знаходзіцца дынаміка адносін у сферы матэрыяльнай вытворчасці.

*Гнасеалагічны аптымізм* – філасофска-светапоглядны прынцып, які абвяшчае універсальную пазнавальнасць свету.

*Грамадска-эканамічная фармацыя* – паводле марксісцкай філасофіі, канкрэтна-гістарычны тып грамадства, што знаходзіцца на пэўнай ступені гістарычнага развіцця, характарызуецца адпаведнымі яму сувязямі, адносінамі і формамі арганізацыі людзей, функцыяніруе і развіваецца паводле сваіх спецыфічных законаў на аснове пэўнага спосабу вытворчасці.

*Грамадскага дагавору канцэпцыя* – сацыяльна-філасофская канцэпцыя, згодна з якой фарміраванне і функцыянаванне інстытуцыяналізаваных форм грамадскага жыцця мае ў сваёй аснове добраахвотны калектыўны дагавор паміж людзьмі, мэтай якога выступаюць узаемная бяспека і абарона натуральных правоў.

*Гуманізм* – у шырокім сэнсе прызнанне за чалавекам права і абавязку актыўна ўздзейнічаць на прыродную і сацыяльную рэчаіснасць з мэтай яе ўдасканалення ў адпаведнасці з патрэбамі, інтарэсамі і мэтамі чалавека; у вузкім сэнсе – плынь у культуры Рэнесансу XIV – XVI стст., у аснове якой знаходзіцца арыентацыя на прыярытэтнае засваенне гуманітарных ведаў.

*Духоўны арыстакратызм* – светапоглядная ўстаноўка, згодна з якой у грамадстве вылучаецца меншасць, прадстаўнікі якой валодаюць вышэйшымі ў параўнанні з іншымі духоўнымі (інтэлектуальнымі, маральнымі) якасцямі і таму выступаюць у ролі своеасаблівай духоўнай эліты.

*Дэізм* – рацыяналістычны рэлігійна-філасофскі прынцып, згодна з якім Бог разглядаецца як прычына і гарант разумнага прыроднага і маральнага парадку; пры гэтым з рэлігійнай сістэмы выключаюцца ўсе ірацыяналістычныя элементы.

*Дыскурс* – сацыяльна абумоўленае адзінства сістэмы мовы і знешніх фактараў, якія ўплываюць на спецыфіку дадзенай сістэмы мовы.

*Дыялектыка* – разуменне свету і спосаб мыслення, пры якім разнастайныя з’явы прыроднай, сацыяльнай і духоўнай рэальнасці разглядаюцца

ў шматстайнасці іх сувязяў, узаемадзеянні супрацьлеглых сіл, тэндэнцый, у працэсах змянення і развіцця.

*Дыялектычны матэрыялізм* – асноўная частка марксісцка-ленінскай філасофіі, у змесце якой праводзіцца абгрунтаванне першаснасці матэрыі пры інтэрпрэтацыі быцця і пазнання з дапамогай прынцыпаў, законаў і катэгорый гегелеўскай дыялектыкі.

*Езуіты* – дзеячы каталіцкага манаскага ордэна, створанага ў 1534 г., які адыграў галоўную ролю ў контррэфармацыйным руху, а таксама ва ўмацаванні сацыяльна-палітычных пазіцый папства ў другой палове XVI – першай палове XVIII стст.

*Заходнерусізм* – гісторыка-ідэалагічны накірунак у грамадска-палітычным і культурным жыцці Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX стст., асновай якога з'яўляецца пастулат, згодна з якім Беларусь з'яўляецца дзяржаўнай і этнакультурнай часткай Расіі, а беларусы – асобнай галіной рускага народа.

*Змешаная манархія* – мадэль дзяржаўна-палітычнага ўладкавання, абгрунтаваная ў еўрапейскай сацыяльна-палітычнай думцы Сярэднявечча і ранняга Новага часу, якая змяшчала ў сабе элементы трох правільных форм дзяржаўнага праўлення, сфармуляваных у палітычнай тэорыі Арыстоцеля: манархіі, арыстакратыі і паліті (дэмакратыі).

*Ідэалізм* – катэгорыя, што абазначае сукупнасць філасофскіх канцэпцый, якія ў інтэрпрэтацыі быцця і пазнання арыентаваны на сцвярджэнне першаснасці духоўных аб'ектаў.

*Кансерватызм* – сацыяльна-палітычная ідэалогія, якая сцвярджае прыярытэт у грамадстве традыцыйных каштоўнасцяў і ўстанаўленняў, сацыяльных, палітычных або рэлігійных дактрын; адмоўна ацэньвае хуткія змены і наваўвядзенні ў грамадстве.

*Клерыкалізм* – сацыяльна арыентаваная ўстаноўка, паводле якой сцвярджаецца дамінаванне рэлігійных інстытутаў у грамадскім жыцці.

*Контррэфармацыя* – агульнаеўрапейскі рух другой паловы XVI – першай паловы XVIII стст., накіраваны на аднаўленне пазіцый каталіцкай царквы ў рэлігійным і грамадскім жыцці пасля Рэфармацыі.

*Краёвасць* – полікультурная ідэнтычнасць часткі шляхецкай супольнасці былога ВКЛ у XIX – пачатку XX стст., у якой суіснавалі польская нацыянальная самасвядомасць і “літоўскі” рэгіянальны патрыятызм, звязаны з акцэнтуацыяй спецыфікі гістарычнага лёсу, народнай мовы і культуры рэгіёна былога ВКЛ.

*Крэацыянізм* – рэлігійна-светапоглядны прынцып, згодна з якім Бог з'яўляецца творцам усіх форм быцця.

*“Кіеўскі рэнесанс”* – катэгорыя, якая пазначае дзейнасць інтэлектуальнага гуртка, што займаўся перакладам і падрыхтоўкай рукапісных зборнікаў, пры двары кіеўскіх удзельных князёў Алелькавічаў у сярэдзіне XV ст.

*Лібералізм* – сацыяльна-філасофская і палітычная ідэалогія XIX – XX стст., зыходным пастулатам якой з’яўляецца сцвярджэнне індывідуальнай свабоды чалавека ў якасці галоўнай сацыяльнай, палітычнай і культурнай каштоўнасці.

*Ліберальнае народніцтва* – накірунак у агульнарасійскім народніцкім руху канца XIX – пачатку XX стст., для якога былі характэрны ідэя мірнага эвалюцыйнага пераўладкавання грамадства ў дэмакратычным накірунку, сцвярджэнне ў якасці ідэалу сацыяльнага ўладкавання гарманічнага спалучэння свабоды асобы і грамадскай салідарнасці, абвяшчэнне інтэлігенцыі галоўнай рухаючай сілай і каталізатарам грамадскага прагрэсу.

*Марксізм* – накірунак еўрапейскай філасофіі другой паловы XIX – XX стст., які надае галоўную ўвагу крытычнаму аналізу сацыяльнай рэальнасці і пошуку перспектыў яе пераўладкавання на пачатках гуманізму і калектывізму.

*Марксізм-ленінізм* – афіцыйная ідэалогія ў СССР у 1920-я – 1980-я гг., у аснове якой знаходзілася адаптаванае да патрэб савецкага рэжыму філасофскае вучэнне марксізму.

*Матэрыялізм* – катэгорыя, што абазначае сукупнасць філасофскіх канцэпцый, якія ў інтэрпрэтацыі быцця і пазнання арыентаваны на сцвярджэнне першаснасці матэрыяльных аб’ектаў.

*Механіцызм* – філасофскі прынцып, згодна з якім законы механікі пастуліруюцца ў якасці універсальных законаў прыроды; увесь свет разглядаецца як сукупнасць непадзельных і нязменных матэрыяльных часціц, якія рухаюцца ў абсалютных прасторы і часе дзякуючы сілам прыцягнення, што вызначае жорсткую дэтэрмінаванасць прыродных з’яў і працэсаў.

*Містыцызм* – філасофскае і тэалагічнае вучэнне, а таксама асаблівы спосаб разумення свету, заснаваны на інтуіцыі і ірацыяналізме.

*Навукацэнтрызм* – філасофскі прынцып, згодна з якім навуковыя веды абвяшчаюцца галоўным фактарам увасаблення рацыянальных асноў у чалавечым жыцці, падмуркам рацыянальнага панавання чалавека над светам і ажыццяўлення яго магчымасцяў.

*Натуральнае права* – паняцце, якое азначае сукупнасць прынцыпаў, правоў і каштоўнасцяў, прадыктаваных самой прыродай і таму незалежных ад заканадаўчага прызнання або непрызнання іх з боку канкрэтных дзяржаў.

*Нацыянальная ідэя* – уяўленне аб самабытнасці народа як паўнацэннага гістарычнага суб’екта, якое ўзнікае ў самасвядомасці пэўнай, як правіла этнічнай, супольнасці людзей.

*Новае прыродазнаўства* – сістэма прыродазнаўчых навуковых ведаў, якая сфарміравалася ў еўрапейскай культуры ў выніку навуковай рэвалюцыі XVII – XVIII стст.

*“Новыя” філосафы* – тэрмін еўрапейскай філасофскай і грамадска-палітычнай думкі XVII – XVIII стст., які выкарыстоўваўся для абазначэння сукупнасці філасофскіх вучэнняў, што ўзніклі ў перыяд ранняга Новага часу ў якасці альтэрнатывы традыцыйнай сярэднявечнай філасофіі, заснаванай на прынцыпах схаластычнага арыстацелізму.

*Неасхаластыка* – філасофская сістэма, якая фарміруецца ў еўрапейскай духоўнай культуры ў другой палове XVI – першай палове XVIII стст. на аснове пераасэнсавання сярэднявечнай схаластыкі ў якасці інтэлектуальнай рэакцыі на выклік Рэнесансу і Рэфармацыі.

*Ненасілле* – светапоглядная ўстаноўка, якая абвяшчае паслядоўнае адмаўленне ад выкарыстання гвалтоўных сродкаў ва ўсіх сферах грамадскай жыццядзейнасці.

*Пазітывізм* – накірунак заходняй філасофіі XIX – XX стст., у аснове якога знаходзіцца абвяшчэнне эмпірычнага вопыту крыніцай ісцінных ведаў і фундаментам усіх навуковых канструкцый.

*Палітычны народ, палітычная нацыя* – катэгорыя, якая абазначае пэўную супольнасць людзей, аб’яднаных прыналежнасцю да пэўнага палітычнага інстытута (галоўным чынам, дзяржавы), а таксама адпаведнай самасвядомасцю, пры ўмове валодання імі ўсёй паўнатой правоў, якія надаюцца дадзеным інстытутам; у Рэчы Паспалітай XVI – XVIII стст. дадзеная катэгорыя абазначала шляхецкую супольнасць у якасці прывілеяванага дзяржаўнага саслоўя, прадстаўнікі якога мелі выключнае права на ўдзел у палітычным жыцці.

*Панславізм* – палітычны і культурны рух, распаўсюджаны ў славянамоўных краінах XIX – XX стст., ідэі якога прадугледжваюць неабходнасць палітычнага аб’яднання славян на аснове іх этнакультурнага і моўнага адзінства.

*Персаналізм* – сукупнасць філасофскіх вучэнняў, якія пастуліруюць асобу як непаўторную творчую рэальнасць і вышэйшую духоўную каштоўнасць.

*“Пецярбургскі гурток”* – нефармальнае аб’яднанне прадстаўнікоў кансерватыўна арыентаванай польскамоўнай інтэлігенцыі (пераважна выхадцаў з тэрыторыі былога Вялікага княства Літоўскага і Украіны) у Пецярбургу ў 1830-я – 1850-я гг.

*Пострэфармацыйныя канфесіі* – катэгорыя, што абазначае сукупнасць рэлігійных канфесій, якія ўзніклі ў Еўропе ў другой палове XVI – XVII стст. на падставе рэфармацыйнага руху (лютэранства, кальвінізм, цвінгліянства, антытрынітарызм і г. д.).

*Правідэнцыялізм* – рэлігійна-светапоглядны прынцып, у адпаведнасці з якім усе з’явы і працэсы, што адбываюцца ў Сусвеце, разглядаюцца як загадзя прадвызначаныя боскай воляй.

*Рамантызм* – ідэйны і мастацкі накірунак у еўрапейскай і амерыканскай духоўнай культуры канца XVIII – першай паловы XIX стст., які ўяўляе сабой крытычную рэакцыю на ідэі Асветніцтва і вызначаецца сцвярджэннем самакаштоўнасці духоўна-творчай аўтаноміі асобы.

*Рацыяналізм* – філасофска-светапоглядны прынцып, згодна з якім розум разглядаецца як аснова пазнання і паводзін людзей, крыніца і крытэрый ісціннасці ўсіх жыццёвых намаганняў чалавека.

*Рыгарызм* – светапоглядная ўстаноўка, якая прадугледжвае строгае правядзенне якога-небудзь прынцыпа ў дзеянні, паводзінах і мысленні, што выключае кампрамісы і ўлік іншых прынцыпаў, адрозных ад зыходнага.

*Рэвалюцыйнае народніцтва* – накірунак у агульнарасійскім народніцкім руху ў канцы XIX – пачатку XX стст., для якога была характэрна ідэя станаўлення сацыялістычнага грамадства шляхам дэмакратычнай палітычнай рэвалюцыі.

*Рэвалюцыйны месіянізм* – філасофскае і сацыяльна-палітычнае вучэнне, у аснове якога знаходзіцца ідэя блізкага выратавання ўсяго чалавецтва, якое мае адбыцца дзякуючы ўнутранай надзвычайнай працы выбраных асоб альбо народаў і якое будзе мець характар “надзвычайнай” падзеі ў гісторыі чалавецтва.

*Рэвеляцыянізм* – рэлігійна-філасофскі гнасеалагічны прынцып, згодна з якім крыніцай абсалютнай ісціны выступаюць свяшчэнныя тэксты, у якіх змешчана боскае адкрыццё.

*Рэфармацыя* – агульнаеўрапейскі рэлігійны рух XVI ст., накіраваны на радыкальную трансфармацыю традыцыйнай (перш за ўсё каталіцкай) царквы і яе вучэння згодна з прынцыпамі аўтэнтычнага хрысціянства. Вынікам Рэфармацыі стала ўзнікненне шэрагу пострэфармацыйных канфесій: лютэранства, кальвінізму і г. д.

*Рэцэпцыя* – катэгорыя, якая абазначае засваенне, трансляцыю якой-небудзь з’явы або працэсу з адной сферы ў іншую.

*Сарматызм* – сацыяльна-палітычная і культурная ідэалогія, што склалася ў грамадска-палітычнай думцы Рэчы Паспалітай XVI – XVIII стст., згодна з якой пастуліруецца асаблівы статус шляхты як пануючага саслоўя ў грамадскай сістэме, а таксама вызначаецца спецыфічны светапогляд і лад жыцця шляхты.

*Сацыніянства* – рэлігійна-філасофскае вучэнне ў межах антытрынітарызму ў канцы XVI – XVII стст., звязанае з ідэямі італьянскага рэфарматара

Ф. Соцына. Дактрына дадзенага вучэння змяшчала найбольш радыкальна акрэсленую ў межах рэфармацыйнага руху тэндэнцыю да рацыяналізацыі рэлігіі.

*Сацыялізм* – тэарэтычная мадэль грамадскага ўладкавання, якая прадугледжвае калектыўнае валоданне, распараджэнне і кіраванне сродкамі матэрыяльнай і нематэрыяльнай вытворчасці.

*Сацыяльны аптымізм* – катэгорыя, якая абазначае сукупнасць філасофска-гістарычных канцэпцый, што сцвярджаюць наяўнасць прагрэсу ў ходзе гістарычнага развіцця грамадства.

*Сацыяльны утапізм* – катэгорыя, якая абазначае сукупнасць ідэй, для якіх характэрна адмаўленне сацыяльнай рэчаіснасці шляхам стварэння нерацыяналістычных сацыяльных праектаў, у якіх адлюстроўваецца або імкненне да рэстаўрацыі ідэалізаванага мінулага грамадства, або сцвярджэнне ідэалаў, рэальнае ажыццяўленне якіх немагчыма.

*Сенсуалізм* – філасофска-гнасеалагічнае вучэнне, згодна з якім пачуццёвы вопыт індывіда з'яўляецца асноўнай і галоўнай крыніцай аб'ектыўных ведаў пра свет.

*Сінкрэтызм* – катэгорыя, якая абазначае адзінства, непадзельнасць розных, нярэдка несумяшчальных феноменаў.

*Славянафільства* – накірунак расійскай кансерватыўнай сацыяльна-філасофскай і грамадска-палітычнай думкі XIX – XX стст., прадстаўнікі якога выступалі за палітычнае і культурнае аб'яднанне ўсіх славянскіх народаў пад кіраўніцтвам Расіі і пад сцягам праваслаўя.

*Спірытуалізм* – рэлігійна-філасофскае вучэнне, якое сцвярджае ў якасці субстанцыі свету духоўны пачатак і разглядае матэрыяльнае як вытворнае ад духоўнага.

*Схаластыка* – філасофская сістэма ў еўрапейскай духоўнай культуры IX – XIV стст., у якой былі ажыццёўлены комплекснае рацыянальнае абгрунтаванне і сістэматычная канцэптуалізацыя хрысціянскага веравучэння.

*Схаластычны арыстацелізм* – пануючае філасофскае вучэнне ў схаластыцы, у аснове якога знаходзіўся сінтэз рэлігійнай хрысціянска-каталіцкай дактрыны і антычных філасофскіх ідэй Арыстоцеля.

*Талеранцыя* – у вузкім сэнсе пастуліраваная або актуальна існуючая і санкцыянаваная правам ці грамадскай думкай сістэма міжасабовых адносін, якая робіць магчымым у пэўным грамадстве плюралізм думак і перакананняў; у шырокім сэнсе – светапоглядны прынцып, які абвяшчае адмаўленне сілы ў сацыяльных канфліктах.

*Традыцыяналізм* – накірунак сацыяльна-філасофскай і культуралагічнай думкі, які пастуліруе ў якасці вышэйшай сацыяльнай каштоўнасці прак-

тычную мудрасць, адлюстраваную ў традыцыі, што ўвасабляе сабой пэўную ідэалізаваную сацыякультурную мадэль устойлівага парадку.

*Трансцэндэнцыя* – філасофская катэгорыя, якая пазначае вышэйшы род ідэальных аб'ектаў, якія прынцыпова не могуць уяўляцца ў якасці магчымых аб'ектаў пачуццёвага вопыту (напрыклад, Бог).

*Трыдэнцкі сабор* – з'езд прадстаўнікоў вышэйшага каталіцкага духавенства ў 1545 – 1563 гг., на якім быў адхілены кампраміс каталіцкай царквы з Рэфармацыяй, пацверджаны аўтарытэт папства ў рэлігійнай сферы і замацаваны асноўныя накірункі дзейнасці царквы.

*Тэакратыя* – сацыяльна-філасофская і грамадска-палітычная тэорыя, згодна з якой рэлігійныя інстытуты павінны займаць цэнтральнае месца ў кіраванні дзяржавай.

*Тэалагічна-філасофскі рацыяналізм* – рэлігійна-філасофскі прынцып, згодна з якім розум павінен выступаць як важны сродак у працэсе пазнання як матэрыяльных, так і нематэрыяльных аб'ектаў.

*Тэалогія* – сукупнасць рэлігійных дактрын, у якіх абгрунтоўваецца пэўная сістэма рэлігійнага светапогляду з уласцівай для яе карцінай свету.

*Тэацэнтрызм* – светапоглядны прынцып, у адпаведнасці з якім крыніцай і прычынай усяго існуючага з'яўляецца Бог.

*Тэлеалагізм* – філасофска-светапоглядны прынцып, які сцвярджае мэтазгоднасць у якасці характарыстыкі асобных аб'ектаў і ўсіх сфер быцця ў цэлым.

*Тэорыя "малых спраў"* – сацыяльная тэорыя, распрацаваная ў межах народніцкага руху ў Расійскай імперыі канца XIX – пачатку XX стст., якая прадугледжвала неабходнасць выканання інтэлігенцыяй "абавязку перад народам" шляхам сумленнага выканання ўласных прафесійных абавязкаў. Пры гэтым акцэнтавалася ўвага на неабходнасці фарміравання грамадзянскай супольнасці шляхам ініцыятыў з боку інтэлігенцыі.

*Фенаменалогія* – накірунак у заходняй філасофіі XX ст., стратэгія якога заключаецца ў апісанні прадметаў філасофскага і навуковага аналізу як феноменаў (г. зн. такімі, якімі яны сябе праяўляюць самі па сабе, не звяртаючыся да чагосьці іншага).

*Фідэізм* – рэлігійна-філасофскі прынцып, які сцвярджае прыярытэт веры перад розумам.

*Фізіякратызм* – сацыяльна-філасофскае вучэнне ў еўрапейскай культуры Асветніцтва другой паловы XVIII – пачатку XIX стст., згодна з якім усе з'явы сацыяльнай і духоўнай рэальнасці тлумачацца на аснове ідэі нязменных натуральных законаў.

*Філасофія жыцця* – накірунак заходняй філасофіі канца XIX – першай трэці XX стст., галоўнай характэрнай рысай якога з'яўляецца канцэнтра-

цыя ўвагі на тэарэтычнай рэфлексіі феномена жыцця, пад чым разумеецца працэс непарыўнага творчага станаўлення, развіцця.

*Фларылегіі* – зборнікі выказванняў і афарызмаў ва ўсходнееўрапейскай сярэднявечнай культуры.

*"Хрысціянскі гуманізм"* – накірунак рэнесансна-гуманістычнай філасофіі канца XV – XVI стст., распаўсюджаны пераважна ў краінах Паўночнай і Цэнтральнай Еўропы, галоўнай ідэяй якога выступала неабходнасць абнаўлення хрысціянства шляхам звароту да яго першапачатковых прынцыпаў пры адначасовым выкарыстанні гуманістычна арыентаваных прынцыпаў антычнай этыкі.

*Цэзарапапізм* – сацыяльна-філасофская і грамадска-палітычная ідэалогія, якая сфарміравалася ў Візантыйскай імперыі ў сярэднія вякі і атрымала распаўсюджанне ў краінах, што знаходзіліся пад культурным уплывам Візантыі; згодна з дадзенай ідэалогіяй, манархічная ўлада павінна валодаць функцыямі як свецкай, так і вышэйшай духоўнай улады.

*Шляхецкая дэмакратыя* – грамадска-палітычная сістэма ў Рэчы Паспалітай XVI – XVIII стст., паводле якой шляхта валодала поўным спектрам грамадзянскіх і палітычных правоў у якасці саслоўнага прывілею (пры гэтым дэклaравалася прававая роўнасць у межах шляхецкага саслоўя), а таксама з'яўлялася крыніцай дзяржаўнай улады.

*Шляхецкі рэвалюцыянарызм* – грамадска-палітычны рух і спецыфічны накірунак сацыяльна-палітычнай думкі на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай у першай палове – сярэдзіне XIX ст., галоўнай мэтай якога з'яўлялася аднаўленне Рэчы Паспалітай шляхам правядзення палітычнай і нацыянальна-вызваленчай рэвалюцыі, асноўнай рухаючай сілай якой павінна выступаць шляхта.

*Эклектычная філасофія* – катэгорыя, якая пазначае сукупнасць філасофскіх вучэнняў, якія сфарміраваліся ў духоўнай культуры Рэчы Паспалітай у сярэдзіне XVIII ст. і ўяўляюць сабой спалучэнне ідэй, уласцівых для філасофскіх сістэм неасхаластыкі і Новага часу.

*Элекцыйная манархія* – форма дзяржаўнага праўлення, пры якой кіраўнік дзяржавы (манарх) атрымлівае ўладу ў выніку выбараў.

*Эмпірызм* – філасофска-гнасеалагічнае вучэнне, згодна з якім пачуццёвы вопыт абвяшчаецца крыніцай усіх ведаў.

*Этычны рацыяналізм* – філасофская канцэпцыя, якая сцвярджае, што ў аснове чалавечых паводзін знаходзіцца або павінен знаходзіцца рацыянальны пачатак; адпаведна веданне пра належныя паводзіны з'яўляецца асноўным крытэрыем нарматыўных паводзін.

ЗМЕСТ


УВОДЗІНЫ ........ 3
ФІЛАСОФСКАЯ І ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ДУМКА БЕЛАРУСІ, АСНОЎНЫЯ ПАНЯЦЦІ, ПЕРЫЯДЫЗАЦЫЯ ........ 5
ТЭМА 1. СЯРЭДНЯВЕЧНЫ ПЕРЫЯД (XI – XV стст.) ........ 6
ТЭМА 2. ПЕРЫЯД АДРАДЖЭННЯ І РЭФАРМАЦЫІ (XVI ст.) ........ 13
ТЭМА 3. ПЕРЫЯД КОНТРРЭФАРМАЦЫІ (XVII – ПЕРШАЯ ПАЛОВА XVIII стст.) ........ 31
ТЭМА 4. ПЕРЫЯД АСВЕТНІЦТВА (ДРУГАЯ ПАЛОВА XVIII – 20-я гг. XIX стст.) ........ 51
ТЭМА 5. ПЕРЫЯД РАМАНТЫЗМУ (1820-я – 1850-я гг.) ........ 70
ТЭМА 6. ПЕРЫЯД ФАРМІРАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНА АРЫЕНТАВАНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ФІЛАСОФІІ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIX – ПАЧАТАК XX стст.) ........ 84
ТЭМА 7. ПЕРЫЯД ПАНАВАННЯ МАРКСІСЦКА-ЛЕНІНСКАЙ ФІЛАСОФІІ (1920-я – 1980-я гг.) ........ 101
ЛІТАРАТУРА ........ 106
ДАДАТАК ........ 110

*Вучэбнае выданне*

Бортнік Ігар Аляксандравіч

ФІЛАСОФСКАЯ І ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ДУМКА БЕЛАРУСІ

Вучэбна-метадычны дапаможнік

Рэдактар *Н. М. Важэніна*

Падпісана да друку 15.03.10. Фармат 60×84 1/16. Гарнітура Таймс. Папера афсетная.
Рызаграфія. Ум. друк. л. 6,96. Ул.-выд. л. 6,87. Тыраж 45 экз. Заказ 451.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі "Полацкі дзяржаўны універсітэт"

ЛИ № 02330/0548568 ад 26.06.2009 ЛП № 02330/0494256 ад 27.05.2009

211440 г. Наваполацк, вул. Блахіна, 29